Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава»

**М.І. Аксюцік**
**Л.В. Каралькова**

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ Д З Е Й Н А С Ц Ь: ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ЎВОДЗІНЫ

***Вучэбны дапаможнік***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Віцебск*
*Выдавецтва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава»*
*2004*

УДК 379.8 (075.8)
ББК 77 я 73
А 42

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава»

*Аўтары*: кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры» ***М.І. Аксюцік***; выкладчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» ***Л.В. Каралькова***

*Рэцэнзент*: загадчык кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры», кандыдат педагагічных навук, дацэнт ***М.М. Каралёў***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Аксюцік М.І., Каралькова Л.В.**

**А 42** САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ: ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ЎВОДЗІНЫ: Вучэбны дапаможнік / М.І. Аксюцік, Л.В. Каралькова. – Віцебск: Выдавецтва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2004. – 114 с.

ISBN 985-425-324-4

У вучэбным дапаможніку разглядаюцца пытанні гісторыі станаўлення і развіцця клубнай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, а таксама тэарэтычныя асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Выданне адрасуецца студэнтам, настаўнікам, выхавацелям.

**УДК 379.8 (075.8)**

**ББК 77 я 73**

**ISBN 985-425-324-4**

© Аксюцік М.І., Каралькова Л.В., 2004

© УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2004

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# З М Е С Т

**АД АЎТАРАЎ** .......................................................................................... 4

Раздзел 1. **ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЫТОКІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬ-ТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ** .................................................. 6

**§ 1.** Уплыў сусветных культурных традыцый на з’яўленне клубаў на Беларусі ........................................................... 6

**§ 2.** Элітныя клубы і салоны XIX стагоддзя ............................ 19

**§ 3.** Гісторыка-педагагічны агляд накірункаў развіцця клуб-ных традыцый на Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя ...................................................... 28

Раздзел 2. **УМОВЫ І НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯКУЛЬ-ТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ПРАЦЯГУ XX СТА-ГОДДЗЯ** ....................................................................... 47

**§ 1.** Клубныя традыцыі XX стагоддзя ..................................... 47

**§ 2.** Тэндэнцыі развіцця клубных традыцый Беларусі канца XX стагоддзя ................................................................... 54

Раздзел 3. **САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК НАВУКОВАЯ ГАЛІНА** .................................................. 73

**§ 1.** Структура метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці 73

**§ 2.** Характарыстыка асноўных прынцыпаў і функцый сацыя-культурнай дзейнасці ......................................................... 78

**§ 3.** Методыка сацыякультурнай дзейнасці ............................ 87

Раздзел 4. **МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ У СТРУКТУРЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ** .............. 95

**§ 1.** Сутнасць і функцыі мастацкай самадзейнасці ................. 95

**§ 2.** Праблема эфектыўнасці мастацкай самадзейнасці .......... 104

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ........................................................................... 113

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СПІС ЛІТАРАТУРЫ** ........................................................................... 114

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АД АЎТАРАЎ

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці заўсёды была пэўным адбіткам тых сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве. Менавіта гэтым можна растлумачыць тую недарэчнасць, якая існавала амаль да канца XX стагоддзя ў нашай навуковай галіне, калі **навука**, якая была прызначаная як бы забяспечваць тэарэтыка-метадалагічную сутнасць культурнай сферы вольнага часу, мела назву «Культурна-асветніцкая **работа**».

У перыяд глыбокага пераўтварэння практыкі педагагічнай дзейнасці ў сацыяльна-культурнай сферы не можа не змяняцца і сама тэорыя, якая асэнсоўвае заканамернасці гэтай дзейнасці. І такія змяненні сапраўды адбываюцца, што датычацца не толькі знешніх праяў, напрыклад, такіх, як сама назва навуковай спецыяльнасці. Змяненні закранаюць усю структуру тэарэтыка-метадалагічнай праблематыкі; уздзейнічаюць на ўсю сістэму пазнавальных сродкаў, якія выкарыстоўваюць навукоўцы; пераўтвараюць каштоўнасныя, сэнсавыя, змястоўныя, тэхналагічныя падыходы, якія рэалізуюцца ў сучасных навуковых даследаваннях сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Змест, глыбіня і кардынальнасць гэтых змяненняў у поўнай меры будуць асэнсаваны навуковай грамадскасцю толькі на пэўным зрэзе часу. Але ўжо сёння відавочна, што без аналізу і адэкватнай ацэнкі гэтых зменаў тэорыя сацыякультурнай дзейнасці далей не зможа абысціся. Інакш будзе страчаны той мадэрнізіруючы тэарэтычны і практычны патэнцыял, які быў назапашаны на працягу амаль стагоддзя і забяспечваў культурную сферу вольнага часу людзей – ад пазашкольнай адукацыі, палітыка- і культурна-асветніцкай работы да сённяшняй сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Ужо сёння мы назіраем той факт, што нашая навука – «Сацыяльна-культурная дзейнасць», якая забяспечвае работу некалькіх тысяч устаноў культуры Рэспублікі Беларусь, прадстаўленая навукоўцамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Беларускага інстытута праблем культуры, выкладчыкамі каледжаў мастацтваў і культуры рэспублікі, забяспечвае падрыхтоўку адпаведных кадраў, мае шырокую сетку абласных навукова-метадычных цэнтраў культуры і народнай творчасці, раённых арганізацыйна-метадычных цэнтраў, падвяргаецца падчас неапраўдальнай рэвізіі, расцягваецца па «камунальных кватэрах» іншых навуковых дысцыплін – сацыялогіі, культуралогіі, мастацтвазнаўства, педагогікі і інш.

Прызнаючы генетычную роднасць з гэтымі навукамі, мы з пэўнай ступенню адказнасці настойваем на тым, што тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці (СКД) мае свой спецыфічны ***аб'ект – культурна абумоўленыя аспекты жыццядзейнасці чалавека, выкарыстанне сацыякультурных і сацыяпедагагічных метадаў аптымізацыі духоўнага***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***развіцця розных сацыяльных груп, вызначаемых па ўзроставых, рэгіянальных, этнічных, рэлігійных, эканамічных і палітычных прыкметах,*** а таксама свой ***прадмет – педагагічны працэс, яго культурную абумоўленасць, прынцыпы арганізацыі і тэхналогіі ажыццяўлення ва ўмовах культурнай сферы вольнага часу.***

У вучэбным дапаможніку зроблена спроба вылучыць асаблівасці сучаснай метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці, вызначыць яе месца ў структуры грамадскіх навук. Прапанаваны свой погляд на гісторыю станаўлення і развіцця СКД, дзе акцэнт зроблены на недастаткова асэнсаваны навукоўцамі беларускі вопыт. Аўтары не прэтэндуюць на навізну і арыгінальнасць раздзела па тэорыі і методыцы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Галоўнай задачай гэтай часткі дапаможніка было творча (і разам з тым беражліва) падысці да назапашанага раней багатага арсеналу формаў, сродкаў і метадаў СКД, пераасэнсавання зместу, прынцыпаў і функцый гэтай дзейнасці. Таксама разгледжаны пытанні тэорыі самадзейнай мастацкай творчасці як часткі сацыякультурнай дзейнасці, праблема вызначэння яе эфектыўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л 1

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЫТОКІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## §1. Уплыў сусветных культурных традыцый на з’яўленне клубаў на Беларусі

У гісторыі фарміравання і развіцця клубных традыцый існуе шмат падыходаў да разумення слова **«клуб»**. Цікава, што менавіта ад той ці іншай трактоўкі гэтага тэрміна залежалі адносіны да яго, вызначаліся мэты, задачы, формы і функцыі яго дзейнасці. Клуб як цэласная з’ява узнік не адразу, а фарміраваўся паступова, у працэсе выкрышталізацыі з блізкіх яму аб’яднанняў людзей ў розныя гістарычныя эпохі.

Ужо ў першабытную эпоху зафіксавана з’яўленне разнавіднасцяў клубных формаў у выглядзе мужчынскіх і жаночых дамоў. На іх з’яўленне аказалі ўплыў 2 галоўныя прычыны: у выніку развіцця тэхнікі ў чалавека познерадавой абшчыны з’явіўся вольны час і паступова сфарміраваліся 4 асноўныя сацыяльныя групы (дзеці, падлеткі, дарослыя мужчыны і жанчыны).

Першымі ў старажытнай гісторыі з’явіліся мужчынскія дамы, якія можна назваць правобразам сучасных клубаў. Яны звычайна размяшчаліся ў цэнтры паселішчаў і ўяўлялі сабой вялікі будынак (35 на 15 м) з некалькімі ачагамі. Дах будынка першабытныя паляўнічыя-будаўнікі рабілі з каркаса касцей буйных жывёл, пакрытых галінамі і шкурамі. Мужчынскімі дамамі маглі служыць і неглыбокія зямлянкі памерам да 200 кв.м., крытыя жэрдкамі[1]. Гэтыя дамы былі цэнтрамі гаспадарчага, грамадскага і ідэалагічнага жыцця. У іх таксама адбывалася своеасаблівая рэкрэацыя, зняцце эмацыянальнага напружання, абмен паляўнічым вопытам, навінамі, выпрацоўка асабістых адносінаў да навакольнага свету і яго з’яў, далучэнне юнакоў да грамадскіх і гаспадарчых спраў і інш. Але галоўнае, што адбывалася ў працэсе дзейнасці мужчынскіх дамоў – гэта сацыялізацыя першабытнаабшчыннага чалавека і своеасаблівае яго выхаванне праз калектыў, які ўжо выпрацаваў свае нормы і правілы паводзінаў.

У часы матрыярхата, як першыя сацыяльныя арганізацыі жанчын, больш актыўна пачынаюць развівацца жаночыя дамы. Мэты і задачы дзейнасці гэтых дамоў мала адрозніваліся ад мужчынскіх, з той толькі розніцай, што жанчыны прыводзілі у жаночы дом дзяцей, для якіх быў абсталяваны спецыяльны куток. Жанчыны папаўнялі свае духоўныя і фізічныя сілы, адпачывалі пасля выканання дамашніх абавязкаў, абменьваліся навінамі, пераймалі нормы і правілы паводзін, выпрацаваныя ў дадзеным грамадстве. Але вельмі значным, на наш погляд, з’яўляецца той факт, што менавіта ў жаночых дамах зараджалася, перадавалася і

[1] Алексеев В.П., Першиц А.П. История первобытного общества. – М., 1990. – С. 349.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзбагачалася прыкладная творчасць: пляценне, ткацтва, выраб хатніх рэчаў; фарміравалася і развівалася вусная народная творчасць: свяшчэнныя міфы, песні, апавяданні, бытавыя і фантастычныя казкі, паданні. Гэтыя дамы можна назваць правобразам сучасных дамоў фальклору і народнай творчасці.

Аднак, калі на змену матрыярхату прыйшоў зноў патрыярхат, жаночыя дамы не атрымалі падтрымкі і развіцця, а мужчынскія дамы наадварот атрымалі шырокае распаўсюджанне. Зараз у іх кола дзейнасці ўключана стварэнне тайных мужчынскіх саюзаў, якія мелі на мэце барацьбу супраць мацярынска-радавых парадкаў, тайныя трапезы, з'яўленне традыцыі ўшанавання духаў-пакравіцеляў, абрадаў, якія мелі сімвалічнае значэнне «смерці» мацярынскага і «ўваскрашэння» бацькоўскага роду.

Новы віток развіцця клубная справа атрымлівае ў Старажытнай Грэцыі, асабліва ў перыяд яе расцвету – знакамітай афінскай дэмакратыі і дзяржаўнага кіравання Перыклам (каля 490–429 г. да н.э.). Тэрмін «вольны час» (schole) у грэкаў атрымаў трактоўку «сур'ёзнай дзейнасці без ціску неабходнасці». Яны ўжо разглядаюць вольны час як від дзейнасці ў сферы культуры, як пэўную самакаштоўнасную катэгорыю. Таму ў Грэцыі паступова адбываецца працэс, які ад вольных размоў, спрэчак на філасофскія тэмы прыводзіць да стварэння вялікай колькасці мужчынскіх клубаў, членамі якіх былі ўсе дарослыя мужчыны арыстакратычнага паходжання.

Стварэнню гэтых клубаў, выхаванню і замацаванню ідэі супольнасці грамадзян мужчынскага полу спрыяла ўся сістэма выхавання і адукацыі ў Старажытнай Грэцыі, калі дзяцей ад 7 і да 18 (а ў Спарце і на в. Крыт – да 20 год) выхоўвалі не ў сям'і, а спецыяльныя выхавацелі-педагогі. Галоўным у дзейнасці клубаў вольных грэкаў былі калектыўныя грамадскія абеды, ў якіх бралі ўдзел да 15 чалавек. Саюз мужчын на
в. Крыт называўся гетэрыем і аб'ядноўваў 100–150 чалавек. Кожны такі саюз меў сваю прыслугу і распарадчыкаў, якія займаліся арганізацыяй і правядзеннем трапез. Пераважна абеды праходзілі за кошт сатрапезнікаў, але на Крыце і ў Спарце існавала практыка дзяржаўных адлічэнняў (за кошт налогаў і некаторых відаў штрафаў). Права ўступлення ў гетэрыю належыла толькі свабоднанароджаным грамадзянам і перадавалася ад бацькі да сына, разам з вінаграднікамі, зямельнымі надзеламі і іншай маёмасцю. Грэчаскія гетэрыі ўяўлялі сабой правобразы заходнееўрапейскіх клубаў закрытага тыпу.

Яшчэ адной формай старажытнагрэчаскага клуба былі майстэрні (металічныя, аружэйныя, тэкстыльныя, жывапісныя, ганчарныя, скульптурныя і інш.), у якіх акрамя бясед, размоў на бытавыя і філасофскія тэмы адпачывалі, абменьваліся навінамі, жыццёвым і працоўным вопытам. Акрамя майстроў, занятых працай, у іх прымалі ўдзел і наведвальнікі – філосафы, рытары, мастакі і проста свабодныя ў гэты час людзі. Клубы-майстэрні можна назваць своеасаблівым правобразам клубаў адкрытага тыпу.

Простыя людзі таксама распрацавалі сваю клубную форму правядзення часу. Гэта былі так званыя «фантомныя клубы» або клубы пад адкрытым небам. Яны былі раскіданы па ўсіх Афінах (парталы храмаў, крытыя каланады, рыначныя плошчы, на якіх спантанна збіраліся невялікія групы людзей). Фантомныя клубы не мелі вызначаных арганізацыйных пачаткаў і мэтаў дзейнасці. Іх раданачальнікам лічаць Сакрата, які на працягу 24 год выкладаў сваю філасофію на вуліцах і плошчах.

Жанчыны ж, як і рабы, у старажытнагрэчаскім грамадстве не мелі грамадскага статуса, былі выключаны з палітычнага і культурнага жыцця Афін – буйнейшага грэчаскага поліса. Адзіным фактам існавання своеасаблівага жаночага клуба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з’яўляецца сведчанне Плутарха[2] аб стварэнні другой жонкай-гетэрай Перыкла Аспасіяй своеасаблівага клуба ў доме Аеін, куды збіраліся самыя знакамітыя грамадзяне Афін для размовы, спрэчак, абмену навінамі і філасофскіх бясед. Сярод удзельнікаў гэтага клуба – вядомы грэчаскі драматург – раданачальнік старажытнагрэчаскай трагедыі Сафокл і філосаф Сакрат. Да гэтага прыкладу можна дадаць і своеасаблівую школу прыгожых манер, адкрытую на в. Лесбас у г. Міцілена вядомай паэтэсай Сафо, якая вучыла жанчын спевам, музыцы, танцам, паэзіі і філасофіі для таго, каб яны «ажыўлялі жыццё гарадоў сваім абаяннем, сваёй вопраткай і сваім мастацтвам»[3]. Па прыведзеных прыкладах добра відаць, што менавіта ў Старажытнай Грэцыі зарадзілася так званая салонная форма, пазней атрымаўшая вялікую папулярнасць на заходнееўрапейскіх, рускіх і беларускіх землях.

Пасля захопу Грэцыі Рымам пачынаецца новы этап у развіцці клубных традыцый гэтай краіны. Больш удалым «залатым стагоддзем» і для развіцця грамадства, і для культурнага жыцця, у гэты час быў перыяд Рымскай рэспублікі. Грамадзяне Рыма аб’ядноўваліся дзяржаўнай сістэмай абрадаў, цырымоній, форумам, законамі, правамі і абавязкамі, сумесна з прымаемымі рашэннямі, удзелам у выбарах, а таксама звычкамі, сяброўскімі і сваяцкімі сувязямі.

Вольны час рымлян – частка дзяржаўнай праграмы. З другога боку, рымскае грамадства мела значны сацыяльны падзел: сенатары, коннікі, муніцыпальная знаць, заможныя грамадзяне, уладальнікі рабоў, майстэрняў, буйныя гандляры, судаўладальнікі. Галоўнай формай правядзення вольнага часу старажытных рымлян-мужчын была лазня – «*тэрма*», у якой не толькі адпачывалі, але і вырашалі пытанні дзяржаўнай палітыкі, улады і іншыя, трапезнічалі пад акампанемент арф і пляскі гетэр.

Рымляне з сярэднім дастаткам – дробныя рамеснікі, растаўшчыкі, гандляры, настаўнікі, урачы стваралі свае свабодныя саюзы або калегіі (спачатку неафіцыйна, а пазней іх стварэнне ўжо патрабавала дазволу сенатараў). Акрамя сацыяльных, былі і прафесійныя калегіі (шаўцоў, краўцоў, лодачнікаў, пагоншчыкаў мулаў і інш.). Існавалі калегіі-зямляцтвы, якія аб’ядноўвалі суседзяў, гараджан, іншагародніх. Напрыклад, у Пуцеолах існавала калегія выхадцаў з фінікійскага горада Берыта, а ў Малазе – дзве калегіі азіяцкіх гандляроў. Былі калегіі, якія аб’ядноўвалі прыхільнікаў тых ці іншых багоў, а таксама калегіі, у склад якіх уваходзілі грамадзяне, жадаючыя ў складчыну набыць сабе месца на могілках або ў калумбарыі[4].

Калегіі, якія ствараліся на лакальным узроўні і арганізацыя якіх была выклікана неабходнасцю самавыяўлення асоб, што ў іх ўваходзілі, з’яўляліся альтэрнатыўнымі дзяржаўным формам арганізацыі вольнага часу. Яны праіснавалі 600 гадоў, але не атрымалі вялікага распаўсюджвання, магчыма, па прычыне паступовага прыцяснення з боку імператараў Юлія Цэзара, Аўгусціна, Клаўдзія, Нерона, Траяна.

Тым не менш, рымскія калегіі мелі шмат агульных рыс з клубнымі фарміраваннямі больш позняга часу: а) створаны па асабістай ініцыятыве, па ўнутрана-неабходных матывах людзьмі, якія займалі аднолькавае сацыяльнае палажэнне; б) зносіны і калектыўная трапеза, якія стваралі атмасферу ўзаемаразумення, узаемапавагі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[2] Плутарх. Избранные жизнеописания. – М., 1987. – С. 306.
[3] Боннар А.Греческая цивилизация. – М., 1992. – С. 172.
[4] История Древнего мира. – М., 1989. – С. 138.

сяброўства, былі асноўным відам дзейнасці; в) наяўнасць унутранай структуры (кіраўнікі і члены) і калегіяльнае вырашэнне фінансавых праблем; г) наяўнасць памяшкання і маёмасці, якая набывалася пераважна за членскія ўзносы. Грошы выкарыстоўваліся як для арганізацыі калегіяльных трапез, рэлігійных культаў, так і для матэрыяльнай дапамогі маламаёмасным грамадзянам; д) неабходнасць выбару дазволу на арганізацыю калегіі, наяўнасць статута і спіска ўдзельнікаў калегіі, якіх магло быць да 2000 чалавек.

Для рымлян беднага саслоў'я былі адчынены харчэўні, якія наведвалі пераважна адны і тыя ж асобы, што таксама набліжала рымскія харчэўні да клубных аб'яднанняў: рэлаксацыя, адпачынак, абмен навінамі, жыццёвым і працоўным вопытам і інш.

Новы віток развіцця клубных фарміраванняў назіраецца ў эпоху заходнееўрапейскага Сярэднявечча. Своеасаблівымі цэнтрамі культуры Сярэднявечча з пашырэннем хрысціянства, яго этыкай, мараллю, правам, звычаямі і светаўспрыняццем, сталі манастыры, у якіх адчыняліся школы і бібліятэкі, і якія станавіліся цэнтрамі культуры і адукацыі. Адным з найбуйнейшых быў манастыр, створаны квестарам і магістрам Касіядорам на поўдні Італіі ва ўласным маёнтку пад назвай «Віварый». У ім аб'ядноўваліся школа, майстэрня і бібліятэка.

Галоўнымі прадаўжальнікамі клубных традыцый у эпоху Сярэднявечча з XII стагоддзя былі рыцары, якія стваралі рыцарскія ордэны і аб'яднанні, якія ў сваю чаргу адлюстроўвалі тэндэнцыі рыцарскай культуры. Галоўнымі патрабаваннямі да члена рыцарскага аб'яднання былі катэгорыя адданасці служэння васалу або даме сэрца, а таксама кодэкс гонару. Вельмі важным быў знешні бок – этыкет, рытуалы, сімволіка, атрыбутыка. Рыцарскія аб'яднанні былі пэўнай сацыяльнай сістэмай з яркавыражанай іерархічнай лесвіцай, мэтанакіраванай на поўнае падпарадкаванне асобнага рыцара групавым інтарэсам ордэна і больш жорсткага кіравання ўнутры ваенна-феадальнага саслоўя. Галоўнымі формамі работы рыцарскіх аб'яднанняў былі святочныя піры, якія гуртавалі прадстаўнікоў аднаго сацыяльнага кола, давалі адпачынак пасля ратных подзвігаў, задавальнялі іх неабходнасць ў зносінах ды самавыяўленні. Рыцарскія фарміраванні мелі закрыты характар, што з цягам часу прывяло да пэўнай «каставасці» рыцарства. Пазней гэта тэндэнцыя стане асновай для арганізацыйных прынцыпаў многіх клубаў, працуючых як закрытыя аб'яднанні.

Акрамя рыцарскіх аб'яднанняў, у эпоху Сярэднявечча назіраліся і класава-сацыяльныя фарміраванні, якія імкнуліся не толькі да аб'яднання, але і да фінансавага і юрыдычнага замацавання саюзаў. Узнікалі сельскія і гарадскія абшчыны, купецкія гільдыі, саюзы ўзаемадапамогі і клятвенныя згуртаванні. Аб'яднаныя ідэяй самаабароны, яны мелі вызначаную арганізацыйную структуру, зафіксаванае членства і існавалі за кошт уласных грашовых сродкаў. Усе яны, у той ці іншай ступені, утрымлівалі элементы клуба, якія выяўляліся ў ідэях салідарнасці, ўзаемадапамогі і адданасці кодэксу свайго таварыства. Нельга абмінуць увагай і студэнцкія фарміраванні: зямляцтвы і універсітэцкія таварыствы, якія пачынаюць развівацца пасля XII стагоддзя, калі школы сталі універсітэтамі.

У Германіі XIV–XV стагоддзя нараджаюцца новыя клубныя формы – карпарацыі спевакоў. А ў Галандыі і па ўсёй паўночна-заходняй частцы Еўропы пачынаюць распаўсюджвацца літаратурна-мастацкія аб'яднанні – камер-рытары. У 1561 г. на фестывалі ў Амстэрдаме выступілі каля 1500 камер-рытараў – удзельнікаў гэтых літаратурна-мастацкіх аб'яднанняў. Такім чынам, мы можам сцвярждаць, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менавіта з эпохі Сярэднявечча пачынаюць сваю сусветную гісторыю традыцыі мастацкіх клубных аб’яднанняў.

Аднак, клуб як сацыяльна-культурная і педагагічная з’ява, якая мае пэўныя традыцыі, атрымлівае сваё развіццё менавіта ў Англіі. Галоўнымі фактарамі для стварэння і замацавання англійскіх клубаў можна назваць: а) палітычныя, якія замацавалі ў грамадскай свядомасці свабоду на арганізацыю рознага роду сацыяльных згуртаванняў; б) высокі ўзровень прамысловай вытворчасці, які даў англічанам вольны час і магчымасць яго выкарыстання ў залежнасці з асабістымі запатрабаваннямі; в) дэмакратыч-ныя зрухі (пасля 1689 г.), якія далі англічанам магчымасць свабоднай арганізацыі клубаў (без якога-небудзь умяшацельства і кантролю з боку ўлад); г) асаблівае імкненне англічан да аб’яднанняў, да праяўлення сваёй індывідуальнасці менавіта ў гэтых згуртаваннях (або клубах).

Да стварэння клуба як сацыяльна-культурнага аб’яднання яго ролю (як у старажытным Рыме – харчэўні) у Англіі выконвалі таверны, якія наведвалі пераважна адны і тыя ж людзі. Менавіта пры таверні Мермайд (прыкладна 1590–1610-я гг.) быў створаны першы клуб пад кіраўніцтвам Вальтэра Ралея. У ліку яго наведвальнікаў былі знакамітыя Шэкспір, Бамон і Флетчар. Вядомым у Лондане быў і другі клуб – «Д’ябал», адчынены пры таверні «Тэмпель» Бара Бэн Джонсанам.

У XVII стагоддзі пачынаюць сваю радаслоўную палітычныя клубы – «кругагаловых» і «кавалераў» (адпаведна, аб’яднанні прыхільнікаў парламента і караля). У XVIII стагоддзі адчыняе свае дзверы першы мастацкі клуб ў Англіі, створаны Джонсанам, аўтарам «Слоўніка англійскай мовы». У ліку яго лідэраў быў Прэзідэнт Акадэміі мастацтваў, вядомы мастак Рэйнальсан. Пазней гэты клуб пераўтвараецца ў літаратурны.

У XIX стагоддзі англійскія клубы не толькі атрымліваюць моцнае пашырэнне, але і аказваюць значны ўплыў на фарміраванне клубнай традыцыі ў Заходняй Еўропе. У гэты перыяд у развіцці клубных традыцый узнікае дзве асноўныя тэндэнцыі: 1) арганізацыя клубаў на аснове інтарэсаў да якога-небудзь віду культурнай дзейнасці (спартыўныя, танцавальныя, музычныя, літаратурныя, рэлігійныя і інш.). Толькі ў Лондане такіх аб’яднанняў – 89; 2) аб’яднанне ў клуб-таварыства на аснове агульных інтарэсаў, аднак з улікам сацыяльнага паходжання (рабочыя, служачыя, студэнты і інш.; прафесійныя – марскія і ваенныя клубы; клубы арыстакратаў або прадстаўнікоў эліты грамадства, у якіх найбольш ярка прасочваюцца вертыкальна-грамадскія сувязі (дзяржаўныя дзеячы, дыпламаты, журналісты, фінансісты і інш., якія валодалі акрамя палажэння ў грамадстве і грашовымі сродкамі, бо ўваходная плата ў арыстакратычны клуб налічвала 1000 франкаў, а падпісная гадавая цана – 250 франкаў[5]. Клубы характарызаваліся выбранасцю членаў, каставасцю, насілі закрыты тып дзейнасці.

Адным з буйнейшых арыстакратычных клубаў Лондана быў «Атэніум» у квартале Пэль-Мэль, заснавальнікам і першым членам якога быў Вальтэр Скотт. Гэты клуб, акрамя цудоўнейшага будынка, меў шырокі штат членаў і добра выхаванай прыслугі, бібліятэку ў 40 тыс. тамоў, чытальную залу, газеты і часопісы на розных мовах свету. Традыцыйнымі формамі яго жыццядзейнасці, як і іншых анлійскіх клубаў, былі публічныя абеды. Аднак у арыстакратычных англійскіх клубах, звязаных са спецыфікай асаблівасцей характару англічан, моўныя зносіны амаль што

[5] Керженцев П.М. Англия и англичане. Очерки современной Англии. – П., 1918. – С. 107.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не мелі такой значнай ролі, як, напрыклад, гэта было ў французскіх або рускіх клубах. Толькі за абедамі ў час вымаўлення тостаў англічане практыкаваліся і спаборнічалі ў красамоўстве.

Значна большую ролю адыгравалі моўныя зносіны і абмен каштоўнасцямі і ідэаламі ў другіх арыстакратычных клубах – клубах «арыстакратаў па духу», якія аб'ядноўвалі вядомых вучоных, мастакоў, журналістаў, літаратараў, музыкантаў і інш. Яны таксама мелі замкнёны характар, але адыгрывалі значна большую ролю ў жыцці грамадства, чым клубы «арыстакратаў па паходжанні».

Аднак прыналежнасць да таго ці іншага элітнага клуба іграла вельмі вялікую ролю ў выхаванні асобы арыстакрата: тут і выхаванне ў стылі «англійскага вобразу жыцця» з непарыўнасцю такіх каштоўнасцей, як якасць і стыль жыцця, фарміраванне вытанчаных манер, адпрацоўка карэктнасці ў размове, спрэчцы, праяўленне і развіццё густу да каштоўных і раскошных рэчаў.

Менавіта ў Англіі пачынаецца зараджэнне і развіццё першых рабочых клубаў, якія першапачаткова выконвалі функцыі сучаснага прафсаюза і насілі пераважна палітычны характар. Напрыклад, клубы для рабочых, створаныя Робертам Оўэнам – уладальнікам паперапрадзільнай фабрыкі, філантропа, сацыяліста-утапіста. Пры іх працавалі бібліятэкі і праводзіліся бяседы. Чарцісцкія клубы мелі ярка выражаны палітычны характар, хоць пры іх таксама меліся бібліятэкі, арганізоўваліся лекцыі, бяседы, адпачынак, што, адпаведна, спрыяла сацыялізацыі рабочых.

У 1862 г. пад кіраўніцтвам вядомых грамадскіх дзеячаў быў створаны «Саюз рабочых клубаў», які «аб'ядноўваў 1500 клубаў у 500-тысячны саюз членаў»[6]. Аднак, гэты «Саюз...», дзейнасць якога кантралявалася і практычна кіравалася членамі ўрада, меў на мэце толькі адпачынак, які выліваўся не ў выхаванне працоўных, а ў практычнае іх спойванне. Па сведчанні П.М. Кержанцава «...У 1911 г. ... 1400 клубаў прапілі спіртных напояў на 12 мільёнаў рублёў, гэта значыць, па 25 рублёў на члена. Асветніцкая работа вядзецца нікчэмна»[7]. Значную ролю ў стварэнні рабочых клубаў адыграла і кансерватыўная партыя (з 3000 тысяч англійскіх рабочых клубаў 1000 была створана кансерватарамі).

Палітычныя клубы адыгралі вельмі значную ролю ў фарміраванні клубнага руху не толькі Англіі. Яны сталі часткай палітычнага жыцця краіны XIX стагоддзя, аказалі ўплыў на фарміраванне і развіццё грамадскай думкі, на станаўленне прынцыпаў самакіравання. Яны таксама дапамагалі фарміраванню тыпу палітычнай культуры, які найбольш адпавядаў сацыяльнай групе, да якой належалі яе члены. Яны таксама распаўсюджвалі палітычныя веды, фарміравалі палітычныя каштоўнасці і ідэалы.

Адметнай рысай рабочых клубаў у Англіі было іх стварэнне па ініцыятыве «з нізу» і вялікае пашырэнне. Асноўнай мэтай іх стварэння і работы была дзейнасць, накіраваная на паўнацэнны адпачынак людзей. У кожным клубе быў більярд, картачныя сталы, буфеты, арганізоўваліся канцэрты. У выніку рэкрэацыйнай дзейнасці гэтых клубаў рабочыя задавальнялі патрэбу ў зносінах з людзьмі адпаведнага кола, пазбаўляліся ад эмацыянальнага напружання, дзяліліся навінамі і інш. Акрамя таго, членства ў такім клубе дапамагала рабочаму фарміраваць культуру мовы, вучыцца весці размову, замацоўвала пэўныя каштоўнасна-

[6]**Там же.**
[7] Керженцев П.М. Англия и англичане. Очерки современной Англии. – П., 1918. – С. 107.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыентацыйныя нормы паводзінаў, што ў выніку значна павышала іх агульную культуру.

Трэба сказаць, што ў Англіі развіваліся і жаночыя клубы. Існавалі клубы для арыстакратак, якія не толькі стваралі свае згуртаванні, але і выступалі фундатарамі і спонсарамі жаночых клубаў больш беднага саслоўя. Сярод арыстакратычных згуртаванняў вылучалася «Ліга Пралескі» – арганізацыя кансерватараў, якая займалася стварэннем жаночых клубаў у Англіі. Дамы-арыстакраткі ладзілі для сваіх членаў таварыства чаяпіцце ў садзе свайго замка або памесця, канцэрты, экскурсіі па агляду радавога замка, аматарскія спектаклі моладзі, раздачу брашур і правядзенне агітацыі[8].

Задача стварэння жаночых рабочых клубаў ставіла на мэце ўтрыманне маладых работніц ад вінаўжывання і маральнага падзення. Аднак, і тут назіраліся значныя перакосы, таму што побач з арэндай памяшканняў і іх абсталяваннем, фундатары практычна падбіралі склад членаў таго ці іншага клуба, і толькі пасля складалі статут. Тым не менш, у грамадскім жыцці гэтыя клубы таксама адыгралі значную ролю. Сродкамі і метадамі работы жаночых рабочых клубаў былі асветныя і прафесійныя бяседы, адукацыйныя вячэрнія класы, танцы, чытанне літаратуры (самастойнае і групавое), заняткі спевамі і танцамі, музычна-літаратурныя вечарыны, заняткі англійскай мовай, рукадзеллем, маляваннем, гімнастыкай. Акрамя таго, жаночыя клубы, як і мужчынскія, мелі свае бібліятэкі, чытальныя залы, бясплатнае харчаванне, невялікія грашовыя ўзносы. Такім чынам, добра відаць, што жаночыя клубы мелі ў большай ступені адукацыйную мэтанакіраванасць, чым мужчынскія. У іх для маладых жанчын ствараліся ўмовы далучэння да каштоўнасцей англійскага грамадства (веданне мовы, чытанне літаратуры і інш.), замацаванне разумення праведнага вобразу жыцця, фарміраванне культуры паводзінаў і быту, прывіванне добрага густу і манер.

Акрамя гарадскіх, ствараліся і вясковыя клубы, якія працавалі па той жа схеме, што і гарадскія. Адрозніваліся яны высокім ўзроўнем і пастаянствам наведвання. Яны ўяўлялі сабой своеасаблівы прататып сучаснага вясковага дома культуры або клуба, працавалі кожны дзень, справамі ж клуба займаўся выбарны камітэт з 10 членаў клуба. Аб высокім грамадскім статусе англійскага вясковага клуба-згуртавання сведчыць і факт актыўнага ўдзелу членаў клуба ў вясковым жыцці, вырашэнні спрэчных пытанняў. Яны атрымлівалі назву ад тых мясцовасцей, у якіх працавалі. Формамі работы вясковага клуба былі вечарыны, дыспуты, лекцыі, чытанне (дома ды ў клубе), класы па навучанні садаводству і агародніцтву.

Такому пашырэнню клубаў у Англіі, шматвобразнасці формаў і метадаў іх дзеяння спрыяла і сістэма адукацыі, адпаведна якой малады англічанін быў уцягнуты ў клубную дзейнасць практычна з дзяцінства. Пры школах і універсітэтах ствараліся рознага роду клубы: спартыўныя, гульнявыя, дыспутныя, мастацкія і іншыя. Усё гэта дапамагала мэтанакіраванаму выхаванню асобы з пачуццём чалавечай годнасці, развітымі маральнымі арыенцірамі і пачуццём справядлівасці.

У Францыі клубы пачыналіся з салоннай формы работы. Сам тэрмін «салон» сведчыць аб французскім паходжанні. Узнік ён яшчэ ў XVI стагоддзі і першапачаткова азначаў толькі пакой для прыёму гасцей. Пазней гэтым словам сталі называць і своеасаблівыя творчыя сустрэчы з паэтамі, якія арганізоўвалі Маргарыта Шатландская і Маргарыта Наварская. Гэты факт сведчыць,

[8] **Там жа.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што перадгісторыя стварэння гэтага своеасаблівага тыпу культурнага ўтварэння мела першапачаткова на мэце не столькі забаўляльную, колькі мастацка-развіваючую функцыю.

Пашыранае стварэнне салонаў на тэрыторыі Францыі выпадае на канец XVI – пачатак XVII стагоддзя, калі жанчына ў вышэйшым свеце становіцца своеасаблівым прадметам пакланення і ў яе з'яўляецца мноства прыхільнікаў. Цікава, што нават добравядомы драматург эпохі класіцызма П. Карнэль быў у ліку наведвальнікаў салона мадам Рамбуж'е – найвядомейшага ў Францыі XVII стагоддзя.

Аднак, у XVIII стагоддзі французскія салоны пад уплывам набліжэння буржуазнай рэвалюцыі становяцца цэнтрамі палітычнай адукацыі, дзе абмяркоўваюцца філасофска-палітычныя пытанні. З цягам часу французскія салоны ўсё мацней набываюць палітычны характар і пачынаюць нагадваць рэвалюцыйна-палітычныя клубы. Буйнейшым у сацыяльна-палітычным жыцці быў Якабінскі клуб, у склад якога ўваходзілі будучыя буйнейшыя дзеячы рэвалюцыі Мірабо, Рабесп'ер і інш., а таксама ўрачы, адвакаты, настаўнікі, вучоныя, літаратары, купцы, а колькасць членаў налічвала больш за 1200 чалавек. Формамі ж работы былі палітычная агітацыя, агітацыйныя мітынгі.

Безумоўна, што ўсе французскія палітычныя клубы (Якабінскі клуб, «89», «Сябры манархічнай Канстытуцыі», «Пантэон» і інш.) адыгралі вельмі вялікую ролю ў ходзе Вялікай Французскай рэвалюцыі. Яны былі не толькі цэнтрамі сацыяльных зносін, але і выпрацоўвалі нормы палітычнага выхавання, былі ўжо такой палітычнай сілай, якая ў многім прадвызначыла лёс сваёй краіны, дастаткова трагічны.

У часы Парыжскай Камуны развіццё палітычных клубаў атрымлівае новы віток, ствараюцца так званыя народныя сходы, вулічныя і вандроўныя клубы. Адметнай рысай рэвалюцыйных клубаў Францыі было і тое, што ўпершыню ў гісторыі клубы маглі праводзіць пасяджэнні ў памяшканнях, прызначаных для выканання рэлігійных культаў (клубы-цэрквы). Камунальны клуб III округу, які размяшчаўся ў царкве св. Мікалая-на-Палях нават выдаваў сваю газету «Камунальны Бюлетэнь». Жанчыны прымалі самы актыўны ўдзел не толькі ў рэвалюцыі, але і ў стварэнні і дзейнасці рэвалюцыйных клубаў (як разам з мужчынамі, так і асобна).

Значныя змены, якія адбыліся ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя закранулі і такую форму клубных фарміраванняў, як салоны. У эпоху Асветніцтва яны атрымалі на тэрыторыі Польшчы вялікае распаўсюджванне і аказалі вельмі значны ўплыў на развіццё культуры ўсёй Заходняй Еўропы. У 60-я гг. XVIII стагоддзя адчыніў свае дзверы клуб літаратараў і вучоных, створаны Адамам Казімежам Чартарыйскім. Гэта мастацкае аб'яднанне працавала пры яго палацы ў Варшаве. Не менш папулярнымі былі і другі літаратурны клуб «князя паэтаў» Ігнацыя Красіцкага[9], створанага ў 1768 г., і знакамітыя «чацвярговыя абеды» караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага[10]. Па сведчанні польскага літаратуразнаўцы Калета, нараджаліся значныя ідэі і пачынанні таго часу, галоўнай мэтай якіх было

[9] Bartoszewich J. Ignacy Krasicki: Znakomici mezowie Polscy w XYIII w., t. III. – Petersburg, 1856. – S. 44.

[10] Libera Z. Zycie lbterackie w Warshawie w czasah Stanislawa Augusta. – W., 1971. – S. 63–68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіццё польскай мовы[11]. Па серадах у караля абедалі мастакі-жывапісцы і архітэктары.

У эпоху Асветніцтва ў дамах магнацкай вярхушкі польска-літоўскага грамадства працавалі салоны ў Казімежа Сапегі, Ігнація Патоцкага, Антонія Тызенгаўза. Існавалі і жаночыя салоны.

Наведвальнікамі польскіх салонаў пры палацах буйнейшых магнатаў у другой палове XVIII стагоддзя былі пераважна выхадцы з арыстакратычных колаў і вышэйшае духавенства. Калі ў магнацкіх салонах і з’яўляліся мастакі, то яны ўсё ж не былі паўнацэннымі партнёрамі, а выконвалі хутчэй забаўляльную функцыю. Галоўнай мэтай дзейнасці салонаў пры палацах магнатаў была рэкрэацыя і адпачынак, аднак, у некаторых дамах збіралася публіка, якая запаўняла свой вольны час дыскусіямі аб літаратуры і мастацтве.

На рубяжы XVIII і XIX стагоддзяў у Варшаве атрымалі распаўсюджанне ў асноўным мастацкія і навуковыя салоны (напр., знакамітае Варшаўскае таварыства сяброў навук). Прыкладам такога, у поўным сэнсе мастацкага салона, можа таксама служыць салон А. Гюнтэравай, якая ў сваім палацы ў Дабраўлянах прымала мастакоў, чыя творчая дзейнасць была звязана з Віленскім універсітэтам (Дамель, Рустэм, Бахматовіч). Да таго ж, у палацы аматаркі-мастачкі мелася багатая калекцыя твораў выяўленчага мастацтва[12].

У першай трэці XIX стагоддзя ствараецца аснова для сапраўдных мастацка-літаратурных салонаў, створаных на аснове ўласна мастацкіх інтарэсаў і адбываецца дэмакратызацыя салона. У ролі арганізатараў пачынаюць выступаць не толькі арыстакраты, але і інтэлігенцыя ды прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя. Агульнасць духоўных інтарэсаў, а не знатнае паходжанне, усё больш становіцца асновай для традыцыйных рэгулярных сустрэч. У гэты перыяд назіраецца далейшае замацаванне ўнутраных сувязяў у асяродку інтэлігенцыі, развіццё сяброўскіх кантактаў. Характэрнай формай зносін становяцца абеды, прысвечаныя ўшанаванню заслуг асобных дзеячаў. У гэты перыяд ствараюцца новыя цэнтры сяброўска-мастацкага жыцця, звязаныя з прафесійнай інтэлігенцыяй і адыграваючыя ўсё большую ролю ў сацыяльна-культурным жыцці Польшчы.

Эстафету мастацкіх салонаў пераймаюць клубы-кафэ, якія выконваюць і функцыю прафесійнага клуба па інтарэсах (літаратурныя, тэатральныя, эстэтычныя, палітычныя і інш.). Клубы-кафэ знаходзіліся пад пастаянным наглядам паліцыі (асабліва пасля падзей Лістападаўскага паўстання). Паступова мастацкія клубы-кафэ сталі характэрнай рысай польскага культурнага жыцця. І па сённяшні дзень яны адыгрываюць вельмі значную ролю ў сацыяльна-культурным жыцці польскага народа.

У Расіі салоны атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў сярэдзіне XVIII стагоддзя, куды, дарэчы, прыйшлі з тэрыторыі нашай краіны. Іх дзейнасць была цесна звязана са знакамітымі рускімі жанчынамі эпохі: С.Д. Панамаровай, Э.Ф. Радэн, Вялікай княгіняй Аленай Паўлаўнай, а дзейнасць салонаў Е.А. Карамзіной, Зінаіды Валконскай, княгіні К.І. Галіцынай, А.П. Елагінай і іншых аказала вельмі значны ўплыў на развіццё

[11] Kaleta R. Obiady czwartkowe na dworze Stanislawa Augusta (Proba monografii). – Warszawa XYIII w, z. 2. – W., 1973. – S. 20–21.
[12] Slownik artystow, t. II, s. 521.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускай літаратуры і, увогуле, мастацкай культуры. Аб гэтым красамоўна сведчаць гістарычныя факты. Напрыклад, салон С.Д. Панама-ровай («Общество любителей премудрости и словесности») наведвалі І.А. Крылоў, М.І. Грэч, П.А. Каценін, П. Якаўлеў і іншыя, а салон княгіні К.І. Галіцынай ў Пецярбургу цікавіў маладога А.С. Пушкіна, В.А. Жукоўскага, П.А. Вяземскага, К.М. Бацюшкава і іншых[13]. Трэба падкрэсліць і тое, што названыя намі ўладальніцы салонаў былі самі вельмі таленавітымі і высокаадукаванымі асобамі. Але, на жаль, гэтая культурная з'ява на тэрыторыі Расіі мела хутчэй спантанны, чым усеахопны характар.

У Расіі ўпершыню тэрмін **«клуб»** як паняцце сустракаецца ў знакамітым слоўніку Ф.А. Бракгаўза і І.А. Эфрона. Саксонскае слова **«clubbe»** спачатку азначала **«палку»**, затым – «**складчыну, долю,** якая прыходзілася па раскладу на кожнага ўдзельніка якога-небудзь таварыства, сходу», пасля – **«сход,** або **будынак для грамадскіх сходаў»**[14]. Прыметы ўдзельнікаў клуба – у прыналежнасці да адпаведнага класа, людзі якога з пэўнымі мэтамі збіраліся ў вызначаным месцы. Мэты ж маглі быць рознымі: ад палітычных, навуковых, мастацкіх да чыста забаўляльных[15].

У «Талковым слоўніку...» У.І. Даля слова «**Клуб**, або **клоб м.** – англ. **сход**, **пастаяннае таварыства**, якое збіраецца ў асобных памяшканнях для бяседы і забаў: ёсць і палітычныя клубы, суполкі, таварыствы»[16].

У ХІХ стагоддзі паняцці **«клуб»** – **«сход»** – **«таварыства»** разумеліся як тоесная з'ява. У фарміраванні клубных аб'яднанняў гэтага перыяду выразна вызначыліся дзве асноўныя тэндэнцыі развіцця: **па вертыкалі** і **па гарызанталі**. *Першая* ўяўляла сабой збор удзельнікаў па сацыяльнаму і грамадскаму статусу (напр., дваранскія, купецкія, прыказчыцкія, мяшчанскія, жаночыя, студэнцкія і іншыя сходы і таварыствы).

Сутнасць гэтай тэндэнцыі ў тым, што ўключэнне людзей у клубны рух адбываецца па вертыкальных сувязях, што асабліва ярка праявілася ў арыстакратычных або элітных клубах. Гэтыя клубы аб'ядноўвалі дзяржаўных дзеячаў, дыпламатаў, фінансістаў, адным словам, людзей, якія займалі пэўную вяршыню ў іерархічнай структуры грамадства і валодалі дастаткова вялікім маёмасным становішчам, таму што ўваходная плата ў арыстакратычны клуб налічвала 2 руб. срэбрам за раз, падпісная гадавая цана – 10 руб. срэбрам у год. У сваіх арганізацыйных прынцыпах гэтыя

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКМ

---

[13] **Комиссаренко С.С. Клуб как социально-культурное явление. Исторические аспекты развития: Учебное пособие. – СПб., 1997. – С. 127–133.**
[14] **Энциклопедический словарь Ф.А. Брокгауза и А.И. Эфрона. Т. 20. – М., 1895. – С. 424.**
[15] **Там жа.**
[16] Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т.2. – М., 1978. – С. 120.

клубы характарызуюцца каставасцю, выбранасцю сваіх членаў. Дзейнасць іх насіла закрыты характар[17].

*Другая* ўключала ў сябе аб’яднанні, якія мелі на мэце правядзенне вольнага часу па інтарэсах (літаратурныя, музычныя, драматычныя, танцавальныя, спартыўныя і іншыя клубы).

У канцы XIX стагоддзя адбыўся бурны ўсплёск нацыянальнай самасвядомасці, які не абмінуў і Беларусь. Інтэлігенцыя шукала шляхі для самаўдасканалення і самавыяўлення. Гэтыя працэсы знайшлі адлюстраванне як на старонках перыядычнага друку таго часу, так і ў работах беларускіх этнографаў, напр., М.Я. Нікіфароўскага і П.В. Баброўскага[18]. Клубы і рознага роду грамадскія таварыствы, суполкі, сходы, аб’яднанні ў той час атрымалі вельмі шырокі размах. З другой паловы XIX стагоддзя ў гарадскім асяроддзі пачалі з’яўляцца аматарскія аб’яднанні пераважна асветнага, адукацыйнага і выканальніцкага напрамкаў, актывізаваўся рух за стварэнне і памнажэнне пазакласнай адукацыі і адкрыццё Народных дамоў, якія пазней сталі базай для далейшага развіцця аматарскай творчасці шырокага кола насельніцтва.

Тэндэнцыя пашырэння клубнага руху на тэрыторыі Беларусі была цесна звязана з падобнымі працэсамі на тэрыторыі Расіі. Напрыклад, па сведчанні бытаапісальніка горада Масквы У. Гіляроўскага, у гэты перыяд там працавалі англійскі дваранскі сход і шэраг музычных клубаў, у адным з якіх адбыўся дэбют славутага спевака Ф.І. Шаляпіна[19]. Рускі пісьменнік С. Каронін (Петрапаўлаўскі) у артыкуле «Грамадскі чалавек» таксама канстатаваў факт аб стварэнні рознага роду таварыстваў і аб’яднанняў: ад клубаў, у якіх збіраліся паклоннікі «любімых цешчаў» да таварыстваў «колотых свиней». Аўтар артыкула спрабаваў даць абгрунтаванне гэтым з’явам, у ходзе чаго ён выказаў думку аб прыроджанай неабходнасці чалавека выходзіць на вуліцу і разам з сабе падобнымі рабіць нейкую справу, і вынішчыць гэтую неабходнасць у стварэнні агульнаграмадскіх інтарэсаў, зносін паміж людзьмі – проста немагчыма[20].

Клубныя таварыствы гэтага часу пры стабільнай дзейнасці выпрацоўвалі ўласную сістэму звычаяў, нормаў, правілаў паводзін, якія, часам, выносіліся і за межы клуба, у розныя галіны ўзаемаадносін паміж людзьмі і грамадскага жыцця. Такім чынам, зараджалася і развівалася пэўная клубная традыцыя, якая характарызавалася непарыўнасцю і непаўторнасцю кожнага клубнага аб’яднання.

**[17] Витебское общество. Устав. – С.11.**

**[18] Бобровский П.О. Гродненская губерния. Ч. 2. – СПб.: Типография генштаба, 1853. – С. 795; Никифоровский Н.Я. Страничκи из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – 250 с.**

[19] Комиссаренко С.С. Клуб как социально-культурное явление. Историчекие аспекты развития: Учеб. пособие. – СПб: СПбГАК, 1997. – 157 с.

[20] Коронин С. Общественный человек / В кн.: собр. соч. в 2 т. Т. 2. – М., 1958. – С. 255.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# § 2. Элітныя клубы і салоны XIX стагоддзя

Сёння ў сувязі са зменамі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным жыцці ў нашай краіне адбываецца перагляд і пераацэнка вопыту і здабыткаў папярэдніх пакаленняў, у тым ліку і ў напрамках арганізацыі сацыяльна-культурнай сферы, культурнага адпачынку насельніцтва Беларусі. Аднаўленне дзейнасці клубаў, членамі якіх з'яўляюцца матэрыяльна забяспечаныя грамадзяне краіны, стварэнне рознага роду «элітных» аб'яднанняў і клубаў закрытага тыпу, мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца рэкрэацыя, аднаўленне духоўных і фізічных сіл, а часам – і дабрачыннасць, вымушае нас звярнуцца да гісторыі фарміравання і развіцця клубнага руху (шматбаковая арганізацыя і дзейнасць клубаў закрытага і адкрытага тыпу, салонаў, сходаў, гурткоў і таварыстваў рознага роду) на Беларусі. На жаль, гэта з'ява грамадскага, культурнага і мастацкага жыцця пакуль што ў поўнай меры не вывучана.

На аснове дадзеных архіўных дакументаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіву (фонды 1430; 295; 24; 2555; 2649), аналізу перыядычнага друку дарэвалюцыйнага часу («Вестник Могилевского земства», «Вестник Минского губернского земства», «Виленский вестник», «Гомельская мысль»), а таксама работ беларускіх этнографаў (П.В. Бабpоўскага, П.І. Шпілеўскага, М.Я. Нікіфароўскага, А.П. Сапунова), можна зрабіць вывад, што менавіта з другой паловы XIX – пачатаку XX стагоддзя назіраецца перыяд росквіту аб'яднанняў, фарміраванняў клубнага тыпу (не ў сэнсе месцазнаходжання, а ў сэнсе формаў арганізацыі).

Для таго, каб больш глыбока даследаваць гісторыю ўзнікнення, стварэння і развіцця клубных аб'яднанняў на тэрыторыі нашай краіны, трэба прасачыць увесь складаны і супярэчлівы шлях фарміравання і развіцця клубных традыцый з канца XVIII стагоддзя.

Канец XVIII – пачатак XIX стагоддзя – складаная і супярэчлівая эпоха ў гісторыі Беларусі. Яна характарызуецца вострым крызісам феадальнага ладу жыцця, фарміраваннем і ўзмацненнем буржуазных адносін. Пад уплывам капіталістычнага ладу жыцця адбываецца размыванне саслоўнай замкнёнасці. Безумоўна, што гэтыя працэсы не маглі не адбіцца і не паўплываць на сферу адпачынку.

У працэсе палітычных, эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў ў гэты перыяд вылучылася як пануючае саслоўе, якое замацавала свой статус, дваранства. Яно таксама распрацавала пэўную сістэму каштоўнасцей і структуру сацыяльных паводзін, якія ўключылі ў сябе і формы свецкага, і формы культурнага жыцця. Гэтую ж думку мы сустракаем і ў рабоце аб быце і традыцыях рускага дваранства ў вядомага даследчыка-культуролага Ю.М. Лотмана, які, у прыватнасці, пісаў: «Формы адпачынку, узаемаадносінаў моладзі, каляндарнага рытуалу, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі ў асноўным агульнымі і для народнай, і для баярска-дваранскай сям'і, павінны былі саступіць месца спецыфічнаму дваранскаму асяроддзю»[21].

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гг.) тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. На яе тэрыторыі былі ўведзены тыя ж прынцыпы кіравання, што і ў Расіі. Акрамя гэтага, Кацярына II перадавала расійскім дваранам і беларускія землі. Так, толькі ў перыяд з 1772 па 1796 гг., яна перадала ва ўласнасць расійскіх дваран адпаведна 150 і 550 сялянскіх душ. Павел I на працягу 1796–1801 гадоў працягваў гэту палітыку і перадаў рускім дваранам 28 тысяч душ беларускіх сялян. У выніку гэтых дараванняў удзельная вага расійскіх памешчыкаў – уладальнікаў беларускіх зямель – у сярэдзіне XIX стагоддзя склала 1%, а агульная плошча іх землеўладанняў – 21,7%[22]. Акрамя таго, ў губерні на кіруючыя пасады, як правіла, прызначаліся менавіта расійскія дваране, што таксама спрыяла ўкараненню на тэрыторыі Белай Русі і новых формаў арганізацыі вольнага часу.

У сваю чаргу, у Расіі палітыка Кацярыны II дапамагла стварэнню шырокай сістэмы ахопу рускага дваранства і грамадства рознага кшталту клубамі, якія давалі магчымасць праяўлення і станаўлення культуры розных слаёў грамадства. Так было, напрыклад, з Англійскім клубам, створаным па ініцыятыве Ф. Гарднера ў Пецярбургу 1 сакавіка 1770 года. Гэты клуб стаў узорам, нязменным элементам у структуры культуры рускага грамадства. «Англійскі сход» у сталіцы на Няве абрусеў з першых жа год свайго стварэння, але назву сваю не змяніў. Наведвальнікі Англійскага клуба праводзілі вольны час у вясёлых размовах, за чытаннем газет або гульнёй у карты. Не выключалася ўжыванне спіртных напояў: віна і піва. Стварэнне такіх клубаў паказала магчымасць выкарыстання вольнага часу не толькі як забавы, але і як пэўнага роду культурнай дзейнасці, пры дапамозе ўвядзення ў адпачынак бяседы і змястоўнай размовы.

У 1784 г., у тым жа горадзе на Няве, у мэтах даць біржаваму купецтву магчымасць збірацца для правядзення нарад па камерцыйных справах і правядзення часу ў бяседзе і гульні ў карты было заснавана Камерцыйнае таварыства. «Зімой у гэтым клубе для пастаянных членаў і іх сем'яў ладзіліся балі. Госці абавязкова плацілі за ўваход. У першы час заснавання клуба было прынята правіла, што дамы павінны былі прыязджаць не інакш, як у паркалёвых сукенках. Пазней гэтыя балі атрымалі назву «паркалёвых» («ситцевых»), хаця само правіла пратрымалася толькі да першай зімы»[23].

Культуролаг Ю.М. Лотман у рабоце «Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX века)» акцэнтуе

[21] Лотман Ю.М. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII– начало XIX века). – СПб, 1994. – С. 91.
[22] Гісторыя Беларусі, т.1., с. 269.
[23] **Пыляев М.И. Старый Петербург. – СПб., 1889. – С. 286.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвагу на тым, што менавіта «баль быў галіной грамадскага прадстаўніцтва, формай сацыяльнай арганізацыі, адной з нешматлікіх формаў дазволенага ў Расіі калектыўнага быту таго часу»[24].

Да канца першай чвэрці XIX стагоддзя «Камерцыйныя таварыствы» былі створаны амаль што ва ўсіх губернскіх гарадах Расіі і, адпаведна, Беларусі, а традыцыя правядзення «паркалёвых баляў» захавалася аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак, дастаткова хутка такія балі набываюць не толькі забаўляльную, але і дабрачынную мэтанакіраванасць. Не выключэннем былі дабрачынныя балі і на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, у маёнтку «Адамава» ў Старасельскай воласці Віцебскага павета купцы Б.І. Гершун і М.А. Бернштэйн 6 ліпеня 1910 года на карысць пагарэльцаў у Магілёве арганізавалі «паркалёвы баль». У яго праграму ўваходзілі танцы ў суправаджэнні аркестра ваеннай музыкі, канфеці і серпанцін, кветкі і «лятучая» пошта. Кошт квітка складаў 1 рубель 50 кап., з якіх 10 кап. – дабрачынны сбор. Чыстага даходу было атрымана 111 руб. 43 кап.[25]

На аснове аналізу архіўных дакументаў можна зрабіць вывад, што паняцці **«клуб»** – **«сход»** – **«таварыства»** ў першай палове XIX стагоддзя тоесныя, і гэты перыяд мы з поўным правам можам назваць «стагоддзем клубаў і таварыстваў», якія сталі адной з новых і асноўных формаў правядзення вольнага часу прывілеяванай часткі жыхароў Беларусі. Яна прымала ўдзел у рознага кшталту дабрачынных і добраахвотных таварыствах, саслоўных і саслоўна-прафесійных клубах і адыграла значную ролю ў грамадскім, палітычным і культурным жыцці. Клубы звычайна аб'ядноўвалі людзей аднаго сацыяльнага кола (дваранскія, «англійскія», афіцэрскія і г.д.), а іх дзейнасць была мэтанакіравана на сумесны адпачынак, фарміраванне культурных зносін і рэкрэацыйных забаў. Дваранскія клубы (або «благородные собрания») дзейнічалі амаль ва ўсіх губернскіх і некаторых павятовых гарадах не толькі ў Расіі, але і ў Беларусі. Членамі «англійскіх» і арыстакратычных клубаў былі чыноўнікі вышэйшых рангаў, дваране. Клубы насілі замкнуты характар. Такі ж маладаступны для іншых сасловій, а таксама, і жаночага полу, характар мелі і афіцэрскія клубы (або афіцэрскія сходы). Акрамя гульні ў карты, бясед і размоў на палітычныя, мастацкія і іншыя тэмы, у клубах праводзіліся маскарады і розныя дабрачынныя мерапрыемствы.

Прычыну такой папулярнасці дваранскіх сходаў можна растлумачыць і тым, што ў першай палове XIX стагоддзя ў краіне адсутнічалі нарматыўна-юрыдычныя перашкоды для арганізацыі клубаў і адзінае, што неабходна было зрабіць, гэта падаць прашэнне ў Міністэрства ўнутраных спраў, якое і займалася зацвярджэннем статута таго ці іншага клуба. У ім павінна было быць «вызначана, якія асобы могуць быць

[24] Лотман Ю.М. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX века). – СПб., 1994. – С. 91.
[25] ЦДГА, ф.1430, сп. 1., адз. зах. 53734, арк. 1081.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыняты ў лік яго членаў». Гэта было адзіным патрабаваннем, змены ж маглі адбывацца згодна з рашэннямі агульнага сходу, які на 2/3 галасоў зацвярджаў або адхіляў якія-небудзь прапановы або палажэнні.

Калі зрабіць аналіз статутаў беларускіх дваранскіх клубаў XIX стагоддзя, то відавочным будзе тое, што ўсе яны, за невялікімі выключэннямі, мелі аднолькавую структуру і змест работы. Мы можам таксама выказаць меркаванне, што існаваў адзіны ўзор, па якому клубы і стваралі свой асноўны дакумент[26].

Благародныя сходы арганізоўваліся з мэтай даць сваім удзельнікам і членам іх сем'яў магчымасць праводзіць вольны ад асноўнага занятку час не толькі з прыемнасцю, але і з карысцю.

Усе знакамітыя людзі таго часу, у тым ліку і дзяржаўныя дзеячы, нягледзячы на сваю занятасць на дзяржаўнай і царскай службе, лічылі за пашану быць старшынямі клубаў або займацца яго гаспадарчымі справамі.

На прыкладзе Слуцкага Таварыства Благароднага сходу[27], «Сямейных вечароў» у Навагрудку[28], лепельскага Грамадскага сходу, Віцебскага Благароднага сходу[29], Мінскага рускага Грамадскага сходу, Гродзенскага Благароднага сходу і іншых клубных аб'яднанняў падобнага тыпу можна ў той ці іншай ступені прасачыць гісторыю стварэння і развіцця дваранскіх клубаў на тэрыторыі Беларусі. Іх дзейнасць характарызавалася тыповым наборам формаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Па-першае, гэта аднатыпнасць унутрыклубнага жыцця: абавязковыя абеды (як штодзённыя, так і святочныя) і гульні (у карты, шашкі, даміно, лато, кеглі, більярд). Кожны клуб меў спецыяльна прыстасаваныя асобныя пакоі для розных відаў гульні. Цікава, што ў клубах дазваляліся любыя картачныя гульні, акрамя азартных, якія былі катэгарычна забаронены. Тлумачэнні, якая гульня носіць камерцыйны або азартны характар, а якая – не, уваходзілі ў абавязкі старшыні клуба. Цікава, што за ўдзел у гульні члены клуба павінны былі заплаціць грашовы ўзнос. Напрыклад, у Віцебскім дваранскім клубе за глазентавую гульню плацілі срэбрам 2 руб. 10 кап., за атласную – 1 руб. 90 кап., за адборную – 1 руб. 60 кап., а звычайная каштавала 1 руб. 30 кап. Існавалі свае тарыфы на гульню ў даміно (50 кап. срэбрам) і більярд (днём – 5 кап., а пры свечках – 10 кап. срэбрам). Бясплатнымі былі толькі гульні ў шашкі і шахматы[30], што

---

**[26] ЦДГА, ф.1430, воп. 1., адз. зах. 1, арк. 44.**

**[27] Адчынена ў 1848 г., да гэтага мела назву таварыства «Сямейных вечароў».**

**[28] У 1875 г. перайменавана ў Навагрудскі Грамадскі сход.**

**[29] Было адчынена ў 1806 г. як «Таварыства сямейных вечароў», а з 1857 г. было перайменавана ў Віцебскі Благародны сход.**

[30] Витебское общество Благородного собрания. Устав. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1857. – 17 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама сведчыць аб своеасаблівым заахвочванні ўдзельнікаў клуба да больш «інтэлектуальных» гульняў.

Нормы грамадскага жыцця ў клубах часам пераўтвараліся ў нормы паводзін у грамадстве. Так, напрыклад, паняцце картачнай запазычанасці ў клубах вырашалася вельмі строга і пры абставінах, калі член клуба своечасова не мог яе выплаціць, то ён назаўсёды пазбаўляўся членства ў клубе. Акрамя таго, і іншыя сходы ўводзілі ў свае статуты палажэнні, што чалавек, які быў выключаны з якога-небудзь клуба (гэта значыць, меў благую рэпутацыю), не мае права балаціравацца нават ў кандыдаты для пазнейшага залічэння ў члены клуба. Калі ж нехта з іншых членаў клуба спрабаваў паручыцца за такога чалавека, то і ён таксама мог быць выключаны з ліку членаў клуба. Так што паняцце гонару не насіла абстрактнага значэння і нормы ўзаемаразлікаў пры гульні ў карты былі не толькі нормамі клуба, але і нормамі дваранскага жыцця ў XIX стагоддзі.

Для бясед звычайна выкарыстоўвалі асобныя пакоі з камінам, дзе клубмэны, якія не гулялі ў карты або пасля карцёжных партый, маглі весці бяседы, абмен думкамі, навінамі з палітычнага, грамадскага, эканамічнага, свецкага і культурнага жыцця горада або краіны.

Газеты і часопісы як айчыннага, так і замежнага выдання былі прадстаўлены ў клубах у поўным аб’ёме, аднак карыстацца імі можна было толькі ў сценах клуба. Парушальніка гэтага правіла чакаў штраф.

Многія клубы мелі дастаткова багатыя кнігазборы, якія ўтрымліваліся за кошт членскіх узносаў або за кошт дадатковых спецыяльных субсідый, якія плацілі тыя ж удзельнікі клуба. Напрыклад, у бібліятэцы Віцебскага Благароднага сходу ў 1864 годзе налічвалася 400 тамоў перыядычных выданняў[31]. У бібліятэцы Гродзенскага Благароднага сходу, акрамя перыядычных выданняў, былі таксама творы на рускай, польскай, французскай, нямецкай мовах. Яна працавала штодзённа з 10 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара. Асобы, якія не прымалі ўдзел у ахвяраванні (а гэта складала 1% ад атрымліваемага дваранамі жалавання), плацілі ў год 6 руб., у месяц – 75 кап., у дзень – па 10 кап. срэбрам[32].

Штодзённы ход падзей у жыцці клубаў рэдка калі парушаўся. Звычайна перад днём узнаўлення членскіх квіткоў у кожным клубе арганізоўвалася «безштрафная ноч». Што тычыцца штрафаў, то тут існавала свая строга вызначаная сістэма іх узаемадзеяння, якая падрабязна распісвалася ў статуце клуба. Напрыклад, курыць дазвалялася толькі ў буфеце, пакоях для гульні і більярднай, прычым з парушальнікаў гэтых правіл упершыню ўтрымлівалі штраф у 2 руб. на карысць бедных, у другі

[31] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 114.
[32] Бобровский П.О. Гродненская губерния. Ч. 2. – СПб: Типография генштаба, 1863. – С. 791.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раз, калі парушальнік быў членам клуба, то яго выключалі, а калі госцем, то яму забаранялі далейшы ўваход у гэты сход.

Наведванне клуба каштавала дастаткова дорага: заснавальнікі плацілі па 10 руб. срэбрам у год; разавы ўваход каштаваў 50 кап.; квіток на баль – 1 руб. або 1 руб. 50 кап. срэбрам. Аднак жанчыны на балі запрашаліся бясплатна[33].

Па-другое, арганізацыя пазаклубнага жыцця была прадстаўлена абавязковымі маскарадамі, балямі, танцавальнымі, музычнымі і літаратурнымі вечарамі, на якія члены клубаў запрашалі сваіх гасцей. Па той прычыне, што ўсе клубы былі пераважна мужчынскімі, жанчыны маглі трапіць у клуб толькі ў час баляў, маскарадаў і розных вечароў.

Але нават у тыя дні, калі жанчыны маглі наведаць клуб, старшыня клуба павінен быў строга сачыць за тым, каб тая ці іншая жанчына, якую запрасіў член клуба, мела «прекрасную репутацию». Многія статуты клубаў адводзілі гэтаму пытанню асобныя параграфы, у якіх рэгламентаваліся правілы запрашэння жанчын у клуб.

На аснове параўнальнага аналізу дзейнасці розных клубаў, можна заўважыць, што графік іх работы меў некаторыя адрозненні. Напрыклад, Віцебскі Благародны сход працаваў кожны дзень (акрамя панядзелка), слуцкія дваране сустракаліся ў клубе па аўторках, чацвяргах і суботах, а ўдзельнікі Гродзенскага Благароднага сходу – па панядзелках, чацвяргах і суботах.

Рэпутацыя клуба ў многім залежыла ад узроўню правядзення баляў. Таму ў статутах клубаў сустракаюцца параграфы, якія даюць пэўныя прадпісанні па арганізацыі і правядзенню гэтай формы культурнага адпачынку. Колькасць баляў, якія давалі на працягу года, залежыла найперш ад фінансавага становішча клуба. Па сведчанні даследчыка М.Я. Нікіфароўскага, у Віцебскім Благародным сходзе з дня заснавання (16 верасня 1857 г.) па 1 лістапада 1859 года адбылося 65 танцавальных вечарын, а з гэтага часу да 1 студзеня 1861 года даходу было атрымана 17 106 руб. 26 кап. срэбрам пры ўмовах расходаў у памеры 15 504 руб. 65 кап. срэбрам[34].

Існавалі таксама і патрабаванні да формы адзення. Напрыклад, па прадпісанні статута (параграф 41) Слуцкага Благароднага сходу на балі неабходна было з’яўляцца ў фраках (для чыноўнікаў) і ваенных мундзірах (для вайскоўцаў). Сурдуты апраналі толькі на мужчынскія сходы. Танцавальныя вечарыны ў гэтым клубе арганізоўвалі толькі пад час карнавалаў (ад Каляд да Вялікага Посту) адзін раз у тыдзень (параграф 2)[35].

Распараджаліся на балях і танцавальных вечарах, а таксама, назіралі за захаваннем парадку, спецыяльныя асобы (адна або некалькі), якіх

---

[33] **ЦДГА, фонд 296, адзел зах. 983, арк. 10.**

[34] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 47.

[35] ЦДГА, ф.295, воп. 1., адз. зах. 983, арк. 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызначалі старшыні. Ніхто не меў права змяніць вызначаны старшынёй парадак танцаў або ўмяшацца ў распараджэнне музыкай[36].

У Гродзенскім Благародным сходзе сямейныя танцавальныя вечары (ressursy) адбываліся адзін раз у тыдзень, і толькі па суботах[37].

У некаторых клубах існавалі свае традыцыі адкрыцця танцавальных вечароў. Напрыклад, у слуцкім сходзе «вечар адкрываўся танцам з першай замужняй дамай, якая ўвайшла ў залу» (гл. параграф 37 Статута Слуцкага Благароднага сходу)[38].

У другой палове XIX стагоддзя ў Благародных сходах Беларусі па жаданні грамадства замест сямейных пачалі ладзіцца музычныя вечары. Удзел бралі члены і госці клуба абодвух палоў, якія складалі своеасаблівыя музычныя гурткі і прымалі ўдзел у музычнай частцы. Члены клуба разам з сем'ямі мелі права на бясплатны ўваход, а госці плацілі па 1 руб. 50 кап. Любоў да музыкі, магчымасць, якую атрымалі маладыя музыканты, каб раскрыць сваё дараванне, свой талент, хутка зрабілі гэтыя вечары дастаткова папулярным відам правядзення вольнага часу ў сходах. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя не меншую папулярнасць атрымалі і канцэрты. Яны праходзілі ў памяшканнях гэтых дваранскіх клубаў і ўключалі ў сябе не толькі музычныя імпрэзы, але і выступленні замежных тэатральных труп і музыкантаў. У канцы XIX стагоддзя да гэтых забаў далучыліся дзіцячыя балі і навагоднія ёлкі са святочнымі частаваннямі і цацкамі.

І, па-трэцяе, ва ўсіх клубах найбольш ярка сацыяльна-культурная дзейнасць праявіла сябе ў дабрачыннасці, якая займала дастаткова значнае месца ў гісторыі дзейнасці дваранскіх і афіцэрскіх клубаў.

З першых гадоў заснавання клубаў пры іх адчыняліся касы на карысць бедных, якія папаўняліся за кошт штрафных грошай. Гэта была ўсталяваўшаяся традыцыя. Акрамя таго, ствараліся касы для сірот, удоў і г.д. Так, напрыклад, у Віленскім афіцэрскім клубе (Ваенным сходзе) 27 снежня 1899 г. на карысць Чырвонага Крыжа быў наладжаны баль[39], а 30 студзеня 1900 г. адбыўся дабрачынны вечар «з жывымі карцінкамі» і музычна-вакальным аддзяленнем, у якім прымаў удзел аркестр мясцовых навучальных установ. Мэта правядзення вечара – матэрыяльная дапамога небагатым навучэнцам гімназіі[40]. У Гродзенскім дабрачынным сходзе за зіму 1860 года ў дабрачынных мэтах было дадзена 4 маскарады[41]. У Віцебскім клубе ў 1864 годзе быў арганізаваны і праведзены маскарад, сродкі ў памеры 200 руб. срэбрам былі перададзены на карысць інвалідаў,

---

[36] ЦДГА, ф.295, воп. 1., адз. зах. 2582, арк. 21.
[37] Бобровский П.О. Гродненская губерния. Ч. 2. – СПб.: Типография генштаба, 1863. – С. 795.
[38] ЦДГА, ф.295, воп. 1., адз. зах. 983, арк. 10.
**[39] Виленский вестник. – 1900. – № 17, от 21 января.**
**[40] Виленский вестник. – 1900 – № 24, от 30 января.**
[41] Бобровский П.О. Гродненская губерния. Ч. 2. – СПб.: Типография генштаба, 1863. – С. 795.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а 29 чэрвеня 1845 года ў Дваранскім сходзе было арганізавана своеасаблівае святкаванне Дня нараджэння цара Мікалая Паўлавіча, на якім igralі два аркестры, выступаў хор, была арганізавана раскошная ілюмінацыя і феерверк, а для простага люду на вуліцах былі ўстаноўлены арэлі. Гулянне паўтарылася 30 чэрвеня, а ўсе атрыманыя ад іх сродкі былі перададзены «зале-прыюту» для дзяўчынак-сірот[42]. У 1851 годзе з мэтай збору матэрыяльных сродкаў на карысць яўрэйскага шпіталя быў арганізаваны баль у Мінску.[43]

Дабрачынная дзейнасць мела ўстойлівы характар, змяняўся толькі памер грашовых сум, які залежыў ад таго, наколькі добра ішлі справы ў той перыяд часу ў тым ці іншым клубе. Мы не ставілі на мэце падрабязнае вывучэнне гэтага боку дзейнасці клубаў[44], таму разглядаем толькі агульную тэндэнцыю, і то ў гістарычным разрэзе. Аднак і па прыведзеных намі прыкладах відаць, што дабрачынная работа дваранскіх і афіцэрскіх клубаў – з’ява маштабная і традыцыйная для элітарнага беларускага грамадства XIX стагоддзя.

Першыя клубы-салоны, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці нацыянальнай музычнай культуры і літаратуры, трапілі на тэрыторыю Беларусі яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай. Напрыклад, у першай чвэрці XIX стагоддзя вызначаліся салоны графа Рудольфа Тызенгаўза ў Жалудку Гродзенскай губерні, графа Людвіка Ракіцкага ў Гарадзішчы Мінскай губерні, генерала Завішы ў Кухцічах Мінскай губерні, князя Міхала Казімір Клеафаса Агінскага ў Залессі – «паўночных Афінах» Беларусі. Вечары карысталіся вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў, а на музычных вечарынах Ракіцкага і Завішы igralі вялікія аркестры.

У 1793 годзе салон Аляксандры Агінскай у Гродна належыў да найбольш прэстыжных. Яго часта наведваў «усемагутны рускі пасол» Северс[45].

У цэлым беларускія клубы-салоны не вельмі адрозніваліся ад польскіх, мелі той жа прынцып стварэння і кіравання. Але калі ў мужчынскіх дваранскіх сходах былі дастаткова строгія нарматыўна-прававыя палажэнні, замацаваныя статутам, то салон ўяўляў сабой больш вольнае ўтварэнне. Безумоўна, што кожны салон меў свае «не писанные

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[42] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 248.
[43] ЦДГА, фонд 24, воп. 1., адз. захав. 441.
**[44] На наш погляд, гэта не толькі цікавы, але і карысны напрамак, які патрабуе дальнейшых даследаванняў, вывучэнне і выкарыстанне вопыту якога можа быць карысным і сёння ў сувязі аднаўленнем работы клубаў, членамі якіх з'яўляюцца матэрыяльна забяспечаныя грамадзяне краіны.**
[45] Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і «яго сядзіба музаў» у Слоніме / Пер. з ням. мовы У. Сакалоўскага. Навук. рэд., пер. і тэкст прадм. А. Мальдзіса. – Мінск: Беларусь, 1993. – С. 40.

правила», якія ўсталёўвала яго гаспадыня, а мэтанакіраванасць яго дзейнасці залежала ад яе інтарэсаў і густаў.

Паказальным прыкладам беларускага жаночага салона больш позняга часу з'яўляецца салон Софіі Пятроўны Галіцынай, які працаваў у Віцебску ў 1846–1853 гадах. Сучаснікі характарызавалі яе як абаяльную, энергічную жанчыну, якая мела еўрапейскую адукацыю і, да таго ж, была жонкай генерал-губернатара, мела сувязі з вышэйшым светам дзвюх сталіц. Вакол яе асобы сталі збірацца не толькі заможныя дваране і купцы, але і літаратурна-мастацкая эліта Віцебска. Дзейнасць гэтага салона і асабіста яго гаспадыні выклікалі да жыцця пастаянную акцёрскую трупу пад кіраўніцтвам сп. Морыца, якая праславілася сваім мастацтвам, і аркестр сп. Яганава, які абслугоўваў тэатральныя пастаноўкі і розныя балі. Пры гэтым узровень такога «культурнага адпачынку» быў настолькі высокім, што, – як сцвярджае М.Я. Нікіфароўскі, – «… сцэнічныя і музычныя навіны таго часу аднаўляліся ў Віцебску настолькі паспяхова, што нядаўнія шукальнікі сталічных прыемнасцей з ліку багатых і радавітых дваран, лічылі дастатковым і тое, што даваў Віцебск, а цудоўныя «живые картинки», якія ствараліся дзякуючы вынаходніцтву сп. Морыца ..., прыцягвалі ўвагу аматароў і знатакоў нават з Варшавы»[46].

Акрамя таго, княгіня С.П. Галіцына была арганізатарам загарадных пікнікоў, розных гулянняў у садах і парках. Але побач з арганізацыяй рознага роду забаў для прадстаўнікоў «вышэйшага свету» яна не забывала і аб простым насельніцтве Віцебска. Для яго арганізоўваліся канцэрты бульварных аркестраў, выступленні скараходаў і канатаходцаў, «дзяды», «пятрушкі» у розных бойкіх месцах (у асноўным, насупраць «палаца»), стаялі каруселі, а зімой устройвалі бульварную горку з музыкай і пацешнымі агнямі ў вечары[47].

Акрамя таго, княгіня значную ўвагу надавала дабрачыннасці. Яна наносіла візіты найбольш значным асобам і прадавала ім квіткі-запрашэнні (на дабрачынныя спектаклі і канцэрты) або латарэі. Напрыклад, квіток на спектакль ці канцэрт у ложу каштаваў 25–100 руб., а крэсла ў партэры – 25 руб[48].

Побач з салонамі падобнага тыпу на Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя пачалося стварэнне жаночых клубаў. Адным з іх быў жаночы клуб ў Віцебску, адкрыты 28 кастрычніка 1909 года[49]. Аднак трэба заўважыць, што як у Расіі, так і на Беларусі, жаночыя салоны і клубы не атрымалі такога шырокага распаўсюджання, як мужчынскія дваранскія сходы. Магчыма гэта было звязана з той нязначнай сацыяльнай роляй, якая

---

[46] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 15.
**[47] Там жа. – С. 16.**
**[48] Там жа. – С. 19.**
[49] ЦДГА, фонд 2649, воп. 1., адз. захав. 209.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адводзілася жанчыне ў буржуазным грамадстве. Але салонам было суджана адыграць больш значную ролю ў дваранскай культуры толькі дзякуючы асабістаму фактару гаспадыні гэтых салонаў (і гэта красамоўна відаць па прыведзеных намі прыкладах). Салоны сталі адметным элементам быту і культуры таго часу, якія да таго ж адлюстроўвалі норавы, прынцыпы, сацыяльныя і мастацкія тэндэнцыі развіцця беларускага дваранства ў XIX стагоддзі.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што клуб для любога двараніна XIX стагоддзя быў не проста месцам адпачынку ў вольны час ад грамадскага і сямейнага жыцця, а хутчэй уяўляў сабой вобраз жыцця, а членства ў клубе ўваходзіла ў сістэму сацыяльна-культурных зносін людзей аднаго кола, а пазней і нацыянальнасцей, і прафесій, і мастацка-творчых інтарэсаў.

Салоны, у тым ліку і жаночыя, таксама адыгралі вельмі значную ролю ў росце ўзроўню сацыяльна-культурнага жыцця Беларусі, таму што іх дзейнасць плённа паўплывала на станаўленне літаратуры, музычнага і сцэнічнага мастацтваў, іх развіццё і прафесіяналізацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## § 3. Гісторыка-педагагічны агляд накірункаў развіцця клубных традыцый на Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя

У апошняй чвэрці XIX – пачатку XX стагоддзя пачынаюць паступова з'яўляцца ды пашырацца і іншыя саслоўныя клубы – **грамадскія сходы**, наведвальнікамі якіх былі ў асноўным чыноўнікі, **клубы** і **клубы па інтарэсах**: ***камерцыйныя і таварыствы спажыўцоў***, якія аб'ядноўвалі купцоў, служачых прамысловых прадпрыемстваў, чыноўнікаў; ***прыказчыцкія,*** членамі якіх былі гандляры і дробныя служачыя; ***прафесійныя*** (чыгуначныя, пажарныя, фармацэўтычныя, будаўнікоў, рамеснікаў, кушнерскія, клуб хатняй прыслугі ў Віцебску і інш.), ***дабрачынныя таварыствы*** і ***клубы па інтарэсах*** (спартыўныя, музычныя, літаратурныя, артыстычныя і інш.). Да гэтага перыяду стварэнне клубаў-таварыстваў па пералічаных вышэй накірунках мела спантанны, адзінкавы характар.

У пачатку XIX стагоддзя паняцце «благародны сход» разумелі дастаткова вузка. Яно нібыта забараняла ўваход усім тым, хто быў «не з благародных». Гэта тычылася чыноўнікаў з асабістых дваран і разначынцаў, вымушаных уласнаручна зарабляць кавалак хлеба. Знешне прыналежнасць да чыноўніцкіх колаў выдзяляла іх з агульнай масы гараджан, але яны не карысталіся пашанай сярод асоб благароднага паходжання. Таму «чыноўніцтву давялося выдзеліцца ў асобны мірок і

стаць носьбітамі культуры, інтэлігентамі»[50]. У сярэдзіне XIX стагоддзя яны сталі ствараць свае клубы-таварыствы, якія атрымалі назву «грамадскіх сходаў». У цэлым дзейнасць гэтых клубаў нагадвала работу дваранскіх сходаў, «англійскіх» і афіцэрскіх клубаў. Адрозненні назіраюцца тут толькі ў складзе і сацыяльна-прафесійнай прыналежнасці людзей, якія былі іх членамі і гасцямі.

Асноўнымі заняткамі ў гэтых сходах была гульня ў віст, прэферанс, більярд, танцы і наведванне буфета. Пры некаторых клубах адчыняліся дабрачынныя гурткі, бібліятэкі. У мэтах павелічэння магчымасці доступу ў такія клубы грамадзян членская плата была невялікай. «Стары тэатр рухнуў, новы яшчэ не стварыўся, цудоўныя хары сп. Ягонава змяніліся вулічнымі катрынкамі; … прыгонныя аркестры… страціліся ў часе і прасторы; … і ў гэты час менавіта чыноўніцтва папоўніла тое, што стаіць прабелам у жыцці культурнага чалавека: яно стварыла шматлікія хатнія спектаклі, праўда, першапачаткова ставіла на мэце задавальненне асабістых інтарэсаў і інтарэсаў абмежаванага кола сваіх знаёмых»[51].

Вышэйшыя чыноўнікі з ахвотай наведвалі аматарскія спектаклі, што рэхам адгукнулася і ў дваранскіх клубах. Напрыклад, у Полацку ў канцы XIX стагоддзя ў Дваранскім клубе, які знаходзіўся на Невельскай вуліцы ў доме Кісіна, быў арганізаваны гурток аматараў драматычнага мастацтва. Удзельнікі тэатра займаліся непасрэдна пастаноўкай спектакляў.

Асноўная маса беларускай інтэлігенцыі гуртавалася вакол музеяў, прыватных бібліятэк, перыядычных выданняў, якія да гэтага часу паступова пачалі страчваць сваю элітарнасць, або збіралася на вечарыны ў прыватных кватэрах. Гэта форма правядзення вольнага часу была перанята беларускай інтэлігенцыяй ад сялянскай моладзі, якая збіралася вечарамі па суботах, нядзелях або святочных днях на танцы і гульні ў прасторнай хаце або карчме. Вечарыны, якія ладзіла гарадская і местачковая інтэлігенцыя, спрыялі папулярызацыі літаратурнага, музычнага, драматычнага і іншых відаў мастацтва на Беларусі, прычым не толькі беларускага, але і рускага, і заходнееўрапейскага. Напрыклад, у Нясвіжы, па сведчанні П.І. Шпілеўскага, былі ў пашане хатнія музычныя і літаратурныя вечарыны інтэлігенцыі, дзе чыталі і абмяркоўвалі творы М. Гогаля, В. Жукоўскага, Ч. Дзікенса, У. Тэкерэя, навіны заходнееўрапейскага музычнага жыцця[52]. Гэта традыцыя захавалася яшчэ з канца XVIII стагоддзя.

[50] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 112.
[51] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 113.
**[52] Шпилевский П.И. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. – Мінск: Полымя, 1992. – С. 63.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікай папулярнасцю ў колах чыноўнікаў карысталіся чытанні. Можна нават сказаць, што гэта была адна з асноўных формаў сяброўскіх зносін паміж сабой. Па сведчаннях таго ж Нікіфароўскага «…чыноўніцтва чытала значна больш, чым можна было чакаць; чыталі групамі, пры гэтым абменьваліся думкамі і ўражаннямі з прычыны прачытанага; шляхам чытання некаторыя асобы папаўнялі вучэбныя прабелы, спецыялізаваліся ў пэўнай галіне ведаў…»[53].

Менавіта чыноўнікам належыць адкрыццё першых прыватных бібліятэк-чытальняў на тэрыторыі Беларусі. Так, напрыклад, малады чыноўнік былой палаты дзяржаўнай маёмасці, віцяблянін Іван Феліксавіч Місюра, які атрымаў хатнюю адукацыю, стварыў прыватную чытальню (1864 г.). У яе фондах налічвалася 539 тамоў розных твораў (205 – на рускай, 327 – на польскай і 7 – на французскай мовах). За карыстанне літаратурай з чытальні І. Місюры плата была дастаткова даступнай – 30 кап. у месяц, таму ў ёй налічвалася 80 пастаянных чытачоў[54].

У 1840–1850-я гады сярод шматлікага кола мясцовай інтэлігенцыі ўзнікла цікавасць да вывучэння фальклору і побыту карэннага насельніцтва і гісторыі Беларусі. Дзеячы літаратуры і мастацтва групаваліся вакол гурткоў А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску і А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Менавіта ў гэтых гуртках была закладзена аснова для развіцця беларускай мастацкай культуры.

Асноўным заняткам гурткоў інтэлігенцыі былі духоўныя зносіны, якія выяўляліся ў форме бясед, спрэчак, размоў. Хатнія гурткі былі больш лакальнымі, чым клубы, пастаянны склад іх удзельнікаў напаўняў сустрэчы цёплым духам сяброўства. Нефармальнасць, неафіцыйнасць як асноўная прымета такіх гурткоў дапамагала ў стварэнні сяброўскай атмасферы.

Пад уплывам грамадска-дэмакратычных рухаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя ліберальныя і дэмакратычна настроеныя колы інтэлігенцыі пачалі ствараць разнастайныя культурна-асветніцкія і навуковыя таварыствы.

Яшчэ адзін тып грамадскіх аб’яднанняў, якія існавалі ў гарадах Беларусі ў гэты час, прадстаўлялі таварыствы, заснаваныя на адзінстве прафесійных або аматарскіх інтарэсаў. Самым старэйшым з іх было Віленскае медыцынскае таварыства, створанае пры Віленскім універсітэце ў 1805 г. і прадстаўляючае сабой тып навукова грамадскай арганізацыі. Яно аб’ядноўвала выкладчыкаў універсітэта і медыкаў-практыкаў не толькі з Вільні, але і з іншых гарадоў Беларусі ды Літвы і праіснавала да 1939 года. У 1886 г. узнікла Мінскае медыцынскае таварыства, якое, як і

[53] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 113.
[54] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С. 114–115.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віленскае, выдавала свой часопіс. У 1903 года ўзнікла Брэсцкае таварыства ўрачоў, якое аб'ядноўвала 28 чалавек. Адным з напрамкаў дзейнасці гэтага таварыства было наладжванне публічных чытанняў, выданне папулярных твораў для распаўсюджання ў народзе ведаў па праблемах агульнай і асабістай гігіены.

Вялікае распаўсюджанне атрымалі сельскагаспадарчыя таварыствы, у склад якіх уваходзілі пераважна памешчыкі і заможныя сяляне. Яны праводзілі выстаўкі пародзістай жывёлы і сельгаспрадукцыі, абменьваліся агранамічнымі навыкамі. У Вільні такое таварыства было адкрыта ў 1899 годзе. Статут Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў быў зацверджаны 2 чэрвеня 1895 года.

У 1877 годзе гурток ідэйных інтэлігентных памешчыкаў Магілёўскай губерні, якія мелі цікавасць да садаводства і да культурных прыёмаў яго вядзення, заснаваў сельскагаспадарчае таварыства, пры якім у 1900 годзе была арганізавана «Школа садовых рабочых». Дзякуючы гэтаму сярод беларускіх памешчыкаў з'явіліся вучоныя-садаводы і «садовыя рабочыя» – практыкі сярод сялян[55].

Менавіта ў канцы XIX стагоддзя сельскагаспадарчымі таварыствамі пачынаюць актыўна падтрымлівацца і развівацца традыцыі народных рамёстваў, асабліва ткацтва. З іх дапамогай у вёсцы адбываецца распаўсюджанне новых ткацкіх тэхнік і тэхналогій. Такія школы-майстэрні былі адчынены ў Клецку і Койданава Мінскай губерні, у м. Барок Дзвінскага павета, ткацкія майстэрні пры Слуцкім аддзяленні Мінскага сельскагаспадарчага таварыства, у мм. Брамчыцы і Каты Мінскай губерні, у Дзісне Віцебскай губерні і інш.[56]

Папулярызацыі народнага ткацтва спрыялі розныя выставы, пераважна сельскагаспадарчай накіраванасці, звычайна дэманструючыя вырабы саматужнікаў і рамеснікаў. Шэраг выстаў быў арганізаваны ў гарадах Беларусі ў пачатку XX стагоддзя, прычым найбольш багатыя і змястоўныя раздзелы складала ткацтва. Магчыма, што ўзоры ткацтва было лягчэй збіраць, а з другога боку, арганізатараў выстаў несумненна вабіла яркая дэкаратыўнасць ткацкіх вырабаў у параўнанні, напрыклад, з драўлянымі або ганчарнымі вырабамі. Інфармацыя з такіх выстаў нязменна ўтрымлівала словы захаплення гэтым відам народнага мастацтва[57].

Асабліва багата і разнастайна было прадстаўлена беларускае ткацтва на саматужна-прамысловай выставе ў Вільні (1911 год) і II Усерасійскай саматужнай выставе ў Пецярбургу ў 1913 годзе. Тут дэманстраваліся сотні ўзораў адзення, разнастайных дэкаратыўных і абрадавых тканін з Вілейскага, Ашмянскага, Лідскага, Дзісненскага і іншых паветаў Паўночна-Заходняй Беларусі. Багатыя традыцыі ткацтва і

---

[55] Вестник Могилёвского земства. – 1916. – № 20. – С. 10–14.
[56] Трызна Д.С. Беларускія дываны і габелены. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – С. 15.
[57] Наша ніва. – 1908. – № 19; Наша ніва. – 1913. №№ 21, 38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышыўкі, іх шырокае распаўсюджванне сталі асновай для арганізацыі мастацкіх промыслаў у канцы XX стагоддзя.

У пачатку XX стагоддзя побач з сельскагаспадарчымі таварыствамі атрымалі сваё развіццё і «Таварыствы дапамогі хатнім рамёствам і народным промыслам». Напрыклад, у Варшаве такое таварыства ўпершыню было створана ў 1907 годзе, у Вільні – у 1912 годзе, у Брэсце – у 1924 годзе, а ў Навагрудку арганізавана «Рамесніцкая хата» або «Дом рамёстваў». «Таварыствы дапамогі хатнім рамёствам і народным промыслам» ставілі на мэце вырашэнне не толькі культурна-прапагандысцкіх, але і гаспадарчых задач. Заўважым, што найбольшую ўвагу гэтыя таварыствы надавалі развіццю ганчарнага майстэрства. З гэтай мэтай яны арганізоўвалі заняткі ў зімовыя месяцы, імкнуліся да рацыянальнага выкарыстання мясцовай сыравіны, навучалі ганчароў прагрэсіўным дасягненням у галіне керамічнай вытворчасці, аказвалі дапамогу ў збыце вырабаў. У 1920-я гады гэтымі таварыствамі была арганізавана выстава ў Брэсце, у 1929 годзе – у Познані, дзе высокую ацэнку атрымаў белагліняны посуд з Агароднай і «чорналешчаныя сівакі» з Міру і Івянца[58].

Камісія па кераміцы Варшаўскага таварыства арганізоўвала пастаянныя курсы для ганчароў, якія пражывалі на тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі, якая ў той перыяд таксама адносілася да польскіх земляў (да 1939 года). Іх навучалі навыкам абпалу вырабаў, нанясенню палівы і дэкарыраванню. Аднак, магчымасці гэтых курсаў былі абмежаваны: на іх навучаліся толькі некалькі беларускіх ганчароў. Больш прадуктыўнай была арганізацыя курсаў на месцах, у буйных ганчарных цэнтрах, дзе можна было ахапіць найбольшую колькасць майстроў. Так, у 1924 годзе Віленскае таварыства правяло ганчарныя курсы ў Крэва, у 1926 – у Ракаве і ў 1937 годзе – у Маладзечна.

У 1901 годзе ў Вільні быў створаны гарадскі клуб для асоб інтэлігентных прафесій, які аб'ядноўваў урачоў, юрыстаў, інжынераў, настаўнікаў, архітэктараў, артыстаў, літаратараў. Членскі ўзнос складаў 10 руб. у год. Існаваў яшчэ дадатковы «бібліятэчны» узнос – 1 руб. 20 кап., на які закупалі літаратуру для бібліятэкі клуба. Вялікая ўвага надавалася падтрымцы небагатай, але таленавітай моладзі, якая атрымлівала вышэйшую адукацыю дзякуючы грашовым стыпендыям ад клуба. Галоўнымі формамі яго работы былі семінары, бяседы, музычныя і сямейныя вечары. Уваход на іх быў платны: для жанчын – 50 кап., для мужчын – 1 руб., але нягледзячы на гэта дзейнасць Віленскага клуба карысталася вялікай папулярнасцю ў гарадской інтэлігенцыі.

---

**[58] Jankowska-Orynzyna J. Sztuka ludowa na P.W.K. // Tygodnik ilustrowany. – 1929. – N. 38. – S. 738–739.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пэўнай ступені прафесійным аб'яднаннем можна лічыць і жаночыя клубы. Напрыклад, клуб, адкрыты 28 кастрычніка 1909 года ў Віцебску[59]. Пры яго праўленні працавалі пастаянныя камісіі: бібліятэчная, дзіцячых забаў, гаспадарчая. Клуб арганізоўваў лекцыі, даклады, субяседванні, а па нядзелях – навукова-папулярныя чытанні і літаратурна-музычныя вечары. Уваходная плата складала 10 кап. Па чацвяргах адбываліся «чаепития», на якіх прысутныя вялі бяседы на літаратурныя, грамадскія, культурныя і педагагічныя тэмы. Устройвалі так званыя «падпісныя вечары», камерныя канцэрты, дзіцячыя ранішнікі і ёлкі.

Члены камісіі жаночага клуба па арганізацыі дзіцячых забаў імкнуліся да таго, каб дзяўчынкі і хлопчыкі найбольш плённа і з карысцю для развіцця сваёй асобы праводзілі вольны час. Работа з дзецьмі вялася дэферэнцыравана, з улікам узросту і іх здольнасцей. Малодшыя займаліся 1 раз у 2 тыдні па нядзелях, а старэйшыя – кожную суботу. У клубе іх навучалі пляценню кошыкаў, разьбе па дрэве, пераплётнай справе, лепцы з гліны, спевам і маляванню. Акрамя гэтага праводзіліся розныя рухавыя гульні, наладжваліся экскурсіі. Пры клубе была бібліятэка.

У пачатку ХХ стагоддзя пачалося захапленне маладых гараджан веласпортам і футболам, а ў гарадах пачалі стварацца гурткі і таварыствы аматараў гэтых відаў спорту. Напрыклад, у 1894 годзе было створана Дзвінскае таварыства веласіпедыстаў. У Гомелі ў 1909 годзе ўзніклі 2 гурткі (каманды): «Спорт» і «Надзея». У 1910 годзе ў Гомелі іх было 10, а ў Беліцы – 4, налічваючы наогул каля 300 чалавек[60]. Мінскае таварыства аматараў спорту, якое ўзнікла ў 1895 годзе, займалася добраўпарадкаваннем велатрэка і спартыўнага павільёна, арганізацыяй дзіцячых спартыўных гульняў, спаборніцтваў па гімнастыцы і веласпорту, наладжвала калектыўныя выезды за горад. У 1899 г. таварыства налічвала 196 чалавек[61].

У канцы ХІХ стагоддзя ў гарадах вялікую папулярнасць атрымалі аматарскія літаратурныя, музычныя, драматычныя таварыствы, якія наладжвалі публічныя лекцыі, канцэрты, музычныя вечарыны, спектаклі па п'есах прагрэсіўных беларускіх, рускіх і замежных драматургаў. Вядомасцю карысталіся і аркестры чыноўнікаў, у склад якіх уваходзілі пераважна 5–6 інструментаў. Вядомы, напрыклад, віцебскія аркестры пад кіраўніцтвам братоў Д. і С. Шароўскіх, братоў Целіца і іншых. Акрамя аркестраў выступалі і асобныя чыноўнікі – аматары музыкі – гітарысты, флейтысты, выканаўцы музыкі на раялі і інш. Аматарскія хары з чыноўнікаў выступалі ў сваіх прыхадскіх цэрквах, а тыя, хто быў больш здатным да вакальных спеваў, станавіліся рэгентамі ў тых жа цэрквах.

59 ЦДГА, ф. 2649, воп. 1., адз. зах. 209.

60 Гомельская мысль. – 1913. – 28 мая. – № 48.

61 Минский листок. – 1899. – № 47. – 18 апреля.; Отчёт о деятельности Минского общества любителей спорта за 1899 г. – Минск: Типолит. Тасьмана, 1900. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прычым усе гэтыя канцэрты і выступленні ладзіліся на дабрачыннай аснове, без усялякай матэрыяльнай карысці[62]. У тым жа Віцебску ў 1878 годзе па ініцыятыве мясцовых чыноўнікаў было закладзена Таварыства аматараў тэатральнага мастацтва, а ў 1883 – Таварыства аматараў музычнага і драматычнага мастацтваў. У 1880 годзе ў Мінску створана музычнае таварыства, якое ставіла на мэце распаўсюджванне музычнай адукацыі і развіцця ўсіх галін музычнага мастацтва, арганізацыю дабрачынных канцэртаў з мэтай аказання матэрыяльнай дапамогі музыкантам, якія жылі ў нястачы, і прызначэнне стыпендыі маладым таленавітым музыкантам. Узнос складаў 5 руб. У 1883 г. членамі таварыства былі 215 чалавек[63].

Вялікую ролю ў развіцці беларускай культуры адыграла Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, створанае ў Мінску ў 1899 годзе. У хуткім часе яно стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця горада. Яно ставіла на мэце спрыяць збліжэнню мясцовых дзеячаў, якія працавалі ў галіне прыгожых мастацтваў, дапамагаць жыхарам горада, якія жадалі ўдасканальвацца ў розных жанрах прыгожых мастацтваў, актывізаваць развіццё культуры насельніцтва. Таварыства мела 4 секцыі (літаратурную, драматычную, музычную і мастацкую), імкнучыся ахапіць асветнай дзейнасцю і працоўны народ. Літаратурная секцыя рэгулярна праводзіла нядзельныя чытанні, літаратурныя «серады» і гутаркі, папулярныя лекцыі па гісторыі і літаратуры. На яе пасяджэннях абмяркоўваліся творы вядомых пісьменнікаў, чыталіся рэфераты, выступалі вядомыя крытыкі. Музычная секцыя таварыства мела свой аркестр і арганізоўвала суботнія вечары з музычнымі і літаратурнымі аддзяленнямі, а з 1903 года ладзіла агульнадаступныя канцэрты, музычныя вечары, лекцыі аб жыцці і творчасці вялікіх кампазітараў і выканаўцаў. Пры садзейнічанні таварыства з канцы XIX стагоддзя пачалі адчыняцца музычныя школы.

Не менш актыўна з 1899 г. працавала і драматычная секцыя таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Ёй кіравалі прафесійныя акцёры, а рэпертуар складаўся з лепшых твораў рускай і замежнай драматургіі (А. Астроўскі, А. Чэхаў, М. Горкі, К. Гуцкоў, Г. Ібсен і інш.). Перад спектаклямі звычайна ладзіліся лекцыі на актуальныя тэмы, а з пачатку XX стагоддзя на сцэне таварыства адбываліся гастролі выдатных майстроў рускай сцэны і сусветна вядомых спевакоў.

Дзякуючы рабоце мастацкай студыі, якая працавала пад эгідай таго ж таварыства, у Мінску значна ажывілася дзейнасць выстаў. Толькі ў

---

[62] Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – С.116.

[63] Капілаў А.Л. Музычнае таварыства ў Мінску // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 4. – С. 24; Устав музыкального общества в г. Минске. – Минск: Скоропечатня Р. Дворжеца, 1880. – 18 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1899 годзе адбыліся выставы майстроў-«перадзвіжнікаў» і экспазіцыя работ І.Я. Рэпіна. У 1901, 1902 і 1904 гг. побач з карцінамі рускіх мастакоў экспанаваліся і работы беларускіх майстроў пэндзаля Я. Кругера, Ф. Рушыца, Ю. Пэна, Я. Дамеля, І. Хруцкага, І. Трутнева і інш.

Не менш значнай падзеяй для абуджэння культурнага жыцця горада было стварэнне ў 1899 г. публічнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, асноўны фонд якой, дарэчы, быў сабраны на ўступныя ўзносы членаў таварыства. У 1908 г. яе кнігазбор налічваў 5272 асабовікі[64].

Дзейнасць культурна-асветных таварыстваў у мэтах «забароны» ўзнікнення і пашырэння на тэрыторыі Беларусі рэвалюцыйнага руху (асабліва ў 1905–1907 гг.) падвяргалася мэтанакіраванаму цэнтралізаванаму кантролю з боку царскага ўраду. У мэтах узмацнення гэтага кантролю 4 сакавіка 1906 года былі апублікаваны часовыя правілы, у якіх агаворвалася сістэма рэгістрацыі, разгляду праектаў статута і кантролю за дзейнасцю таварыстваў і саюзаў. Юрыдычна гэтыя абавязкі ўскладаліся на спецыяльна створаныя губернскія або валасныя дзяржаўныя ўстановы, так званыя «присутствия». Згодна з правілам, таварыствам лічылася аб'яднанне некалькіх асоб, якія не ставілі на мэце атрыманне матэрыяльных прыбыткаў, а да саюзаў адносілі аб'яднанні двух або некалькі таварыстваў. Забаранялася ствараць таварыствы або саюзы, якія «…преследовали цели, противозаконные общественной нравственности, запрещённые уголовным законом, угрожающие общественному спокойствию и безопасности, управляемые учреждениями или лицами, находившимися за границей, а также… преследующие политические цели»[65].

Статуты культурна-асветных таварыстваў заўсёды зацвярджаліся ў Міністэрстве ўнутраных спраў, але спачатку для таго, каб падаць праект статута, арганізатар таварыства павінен быў падрыхтаваць пісьмовую заяву на імя губернатара. У ёй указвалася назва таварыства, мэта яго стварэння, раён і спосабы (формы) яго дзеяння, прозвішча, імя і імя па бацьку заснавальніка, месцазнаходжанне таварыства, парадак прыняцця і выбыцця членаў, памер членскіх узносаў, парадак іх выплаты і інш. Да заявы прыкладаўся праект статута, які належыў рэгістрацыі. Цікава, што дабрачынныя таварыствы (пахавальныя касы, згуртаванні ўзаемадапамогі і інш.) карысталіся прывілеямі[66].

Але, нягледзячы на абмежаванні з боку царскага ўраду, дзейнасць большасці беларускіх клубных фарміраванняў усё больш пачынала атрымліваць палітычны, рэвалюцыйна-вызваленчы напрамак. Па гэтай жа

[64] Абецэдарская А.Л. Дзейнасць таварыства аматараў прыгожых мастацтваў у Мінску (1898–1806) // Веснік БДУ. – Сер. 3. – № 1. – 1996. – С. 21–24; Шебеко З.Б., Шебеко С.Ф. Страницы жизни дореволюционного города. – Мінск, 1990. – 213 с.
[65] ЦДГА ф. 306, воп.1.
[66] ЦДГА, ф. 2649, воп.1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прычыне кіраўнікі дзяржавы, напалоханыя рэвалюцыйнымі падзеямі ў Расіі, пасля правядзення лекцыі, прысвечанай творчасці А.П. Чэхава, на якой прысутнічала больш за тысячу чалавек, прымусова спынілі работу Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў (1906 г.)[67]. Але прагрэсіўная інтэлігенцыя горада хутка аднавіла яго работу пад назвай «Літаратурна-артыстычнае таварыства», дзейнасць якога працягвала культурна-асветныя і рэвалюцыйныя традыцыі таварыства, створанага ў 1899 г.[68]

Найбольш прэстыжным лічыўся ўдзел ва ўсялякага роду філантрапічнай дзейнасці розных дабрачынных таварыстваў і папячыцельстваў. Некаторыя з іх, як, напрыклад, «Таварыства імператрыцы Аляксандры Фёдараўны» і інш., былі агульнарасійскімі і мелі філіі ў гарадах, а мясцовыя падраздзяляліся на губернскія, павятовыя і гарадскія. Сабраныя ад дзейнасці гэтага таварыства сродкі ішлі на дапамогу маламаёмасным вучням гімназій[69], апекунства і выхаванне сірот[70], адкрыццё «дамоў працавітасці»[71], на культурна-асветніцкія і забаўляльныя мерапрыемствы «для простага народа», якія заўсёды прымяркоўваліся да дат царкоўнага календара або найбольш значных падзей у жыцці грамадства[72].

Часта дабрачынная дзейнасць насіла саслоўна-прафесійны характар, аб'ядноўвала прадстаўнікоў пэўнай прафесіі або нацыянальнасці, напрыклад, кушняроў, прыказчыкаў, шаўцоў, пажарнікаў і г.д. Працавалі таксама і яўрэйскія таварыствы, якія дапамагалі найбольш бедным сем'ям яўрэяў выдачай беспрацэнтных пазык або аднаразовых грашовых дапамог. Гэтыя таварыствы мелі спецыяльныя фонды для дабрачынных мэт[73].

Насельніцтва Беларусі заўсёды ўяўляла, у поўным сэнсе слова, «кангламерат» прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Таму амаль ва ўсіх буйных гарадах існавалі таксама клубы, якія аб'ядноўвалі людзей той ці іншай нацыянальнасці. У яўрэйскія клубы ўваходзілі пераважна людзі, якія былі прадстаўнікамі свайго роду «вышэйшага саслоўя» – крамнікі, карчмары і гандляры. Дарэчы, адным з напрамкаў іх дзейнасці быў збор сродкаў і аказанне дапамогі больш бедным яўрэйскім сем'ям. Яўрэйскія літаратурныя, музычна-артыстычныя таварыствы дзейнічалі амаль у кожным населеным пункце, дзе пражывалі прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці. У Пінску, напрыклад, працавала яўрэйскае музычна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[67] ЦДГА, ф. 295, воп. 1., адз. зах. 7666, арк. 9–11.
[68] ЦДГА, ф. 306, воп. 1., адз. зах. 2.
[69] Гомельский вестник. – 1909. – № 64. – 18 марта.
[70] Обзор Виленской губернии за 1903 год. – Вильна, 1904. – С. 70.
**[71] Отчёт о деятельности правления попечительного общества о доме трудолюбия за 1902 год. – Мн., 1903. – С. 3–5.**
[72] Виленский вестник. – 1900. – №9. – 12 января.
[73] Гомельская мысль. – 1913. – № 16. – 12 марта.

літаратурнае таварыства «Газамір»[74], а ў Нясвіжы – літаратурна-артыстычнае таварыства[75].

Асноўным месцам грамадскіх зносін яўрэяў-рамеснікаў былі сінагогі, якія ў нейкім сэнсе выконвалі ролю клубаў, прытым не толькі рэлігійных, але і прафесійных. Цікава, што ў многіх мястэчках Беларусі працавалі сінагогі гандляроў, краўцоў, шаўцоў і іншых прадстаўнікоў «нізкіх» прафесій, куды ніколі не заходзілі прадстаўнікі «вышэйшых» прафесій – крамнікі, карчмары і гандляры, якія ўяўлялі своеасаблівую яўрэйскую шляхту. Там даведваліся пра гарадскія навіны, абменьваліся думкамі, прадказвалі змяненне цэн на рыначныя тавары, заключалі гандлёвыя здзелкі[76].

У Віцебску прадстаўнікі латышскай нацыянальнасці таксама стварылі свой клуб, дзе для правядзення розных асветных і культурных мерапрыемстваў збіраліся латышы[77]. Не выключэннем была і дзейнасць польскіх клубаў і таварыстваў, напрыклад, у Нясвіжы працаваў грамадскі сход «Агніска»[78], у Мінску – спартыўна-гімнастычнае таварыства «Сокал»[79] і іншыя.

Пад час Першай сусветнай вайны ў вялікіх і маленькіх гарадах на неакупаваных тэрыторыях Беларусі пачалі дзейнічаць розныя нацыянальныя па зместу дзейнасці арганізацыі, у асноўным, культурна-асветніцкага напрамку. Маладая беларуская інтэлігенцыя аб’ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі. Асноўнымі цэнтрамі такіх згуртаванняў былі «беларускія хаткі». Як правіла, па суботах у іх адбываліся вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя навіны і пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся нацыянальныя справы, арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветныя мерапрыемствы.

Напрыклад, па сведчанні гісторыка М. Шчаўлінскага, у Мінску адным з такіх пунктаў, які аб’ядноўваў беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і іншых культурных дзеячаў, была «Беларуская хатка», створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны». У яе рабоце, таксама як і ў працы самога таварыства, бралі актыўны ўдзел М. Багдановіч, Ус. Фальскі, А. Смоліч, Л. Дубейкаўскі, З. Бядуля, Ядвігін Ш. (А. Лявіцкі), А. Паўловіч, Я. Лёсік, Ф. Шантыр, З. Верас (Л. Сівіцкая), В. Лявіцкая. У шматлікіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла «Беларуская

[74] ЦДГА, ф.306, воп.1., спр. 21.
[75] ЦДГА, ф.295, воп.1., спр. 8247.
[76] Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык, В.М. Бялявіна, С.А. Мілючэнкаў і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 248 с., іл. – С. 62.
[77] Лыч Л, Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – С. 195.
[78] ЦДГА, ф.306, воп.1., спр. 1., арк. 103.
[79] ЦДГА, ф.306, воп.1., спр. 19, арк. 186.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хатка» абмяркоўваліся вострыя сацыяльныя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа[80].

Для гараджан простага саслоўя, дарэчы, як і для сялян, апроч традыцыйных кірмашоў, святаў і абрадаў, як трапна заўважыў А. Кіркор, «карчма складала і клуб, і раўт»[81]. Напрыклад, у Віцебску ў 1825 годзе працавала 8 корчмаў, 150 шынкоў на 16,9 тысяч жыхароў[82]. У карчме пасля працоўнага дня збіраліся навакольныя жыхары выключна мужчынскага полу, але цягнула іх туды не столькі выпіўка, колькі магчымасць даведацца пра мясцовыя і сусветныя навіны, паразмаўляць, падзяліцца вопытам вядзення гаспадаркі і г.д. Для народа большасць устаноў гэтага тыпу ўяўлялі сабой нешта накшталт «народнага клуба», дзе акрамя выпіўкі, гульні ў більярд або ў карты па выхадных днях ладзіліся танцы. Некаторыя гарадскія корчмы падымаліся да ўзроўню своеасаблівых саслоўна-прафесійных клубаў і мелі пастаяных наведвальнікаў.

Напрыканцы XIX стагоддзя ў своеасаблівую культурна-асветную дзейнасць уключаюцца таварыствы народнай цвярозасці, якія пачалі сваю работу з 1897 г., а таксама існуючыя пры цэрквах рэлігійныя брацтвы, напрыклад, Віцебскае праваслаўнае брацтва імя св. Роўнаапостальскага князя Уладзіміра, заснаванае ў Лепелі[83]. Гэтыя аб’яднанні ставілі на мэце асвету і рэлігійна-маральнае выхаванне народных мас.

Таварыствы народнай цвярозасці ажыццяўлялі нагляд за продажам спіртных напояў, распаўсюджвалі спецыяльную літаратуру, праводзілі гутаркі – народныя чытанні аб шкодзе алкагалізму, спрыялі адкрыццю чытальняў, бібліятэк, Народных дамоў, што з’яўлялася значным праяўленнем педагагічнай арганізацыі вольнага часу з боку царскай улады і кіравання на месцах.

Камітэтамі папячыцельства аб народнай цвярозасці ўсё шырэй прызнаецца мэтазгоднасць дзейнасці чайных як месца грамадскага збору. Для іх узводзілі асобныя будынкі, як, напрыклад, у г. Дзвінску (сучасны г. Даўгаўпілс, Латвія), або прыстасоўвалі памяшканні. Напрыклад, Заслаўскім камітэтам 1 студзеня 1900 года ў сяле Вялікія Пупыркі Мінскай воласці ў памяшканні, бескарысна прадстаўленым мясцовым прычтам, была адчынена чайная-чытальня.

Віцебскі губернатар Чапялеўскі неабходнай умовай паспяховай дзейнасці чайных лічыў неабходным набліжэнне формаў работы чайных да дзейнасці народных клубаў. Для гэтага «... пры чайных, дзе па мясцовых умовах не могуць быць створаны бібліятэкі і чытальні, неабходна арганізаваць карцінныя насценныя бібліятэкі; завесіць сцены карцінамі і даведачнымі аб’явамі. Усе гэтыя насценныя выданні могуць па сканчэнні

---

[80] Шчаўлінскі М. // Беларуская думка. – 1999. – № 8. – С. 160–162.
[81] Живописная Россия. – СПб, 1883. – Т. 3.– С. 25.
[82] Гісторыя Беларусі. Т.1.
[83] ЦДГА, ф. 1430, воп.1., адз. зах. 41827, арк. 15–17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнага часу перавозіцца з адной чайной да другой, і, такім чынам, для наведавальнікаў кожнай чайной будзе пастаянна новы матэрыял для чытання і агляду»[84].

Загадванне чайнымі, бібліятэкамі, чытальнямі віцебскі губернатар лічыў мэтазгодным ускладаць на найбольш інтэлігентных дам, якія, па яго назіраннях, сталі дастаткова карыснымі кіраўнікамі гэтага роду ўстаноў[85]. Народныя чытанні арганізоўвалі з 1 кастрычніка да 1 мая па нядзелях і царскіх днях у чайных, народных вучылішчах, валасных управах, вёсках, і, па магчымасці, у маёнтках. Асноўнымі тэмамі для чытанняў былі: рэлігійна-духоўныя, па гісторыі Расіі, па прыродазнаўстве, па геаграфіі, па сельскай гаспадарцы, па творах рускіх класікаў (А.С. Пушкин, М.В. Гогаль і іншыя). Чытанні для народа праводзіліся бясплатна, усе расходы па іх арганізацыі камітэт прымаў на свой кошт. У кожны павет паступала па тры тэмы і праз тры тыдні яны перадаваліся ў суседні раён, такім чынам за сем месяцаў усе тэмы «абыходзілі» ўвесь павет. Часта лекцыі «разбаўляліся» харавымі спевамі і дэкламацыяй вершаў і прозы. Напрыклад, у Рэжыцкай чайной артыстам Ліпаўскім быў дадзены літаратурна-гумарыстычны вечар, які прынёс 24 руб. 70 кап. чыстага даходу[86].

Абапіраючыся на дадзеныя Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі, можна гаварыць аб тым, што губернскія камітэты клапаціліся і аб матэрыяльным забеспячэнні арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў вольнага часу для жыхароў горада, раёна і вёскі. Напрыклад, Мінскім губернскім камітэтам у 1899 годзе было пералічана 10 руб. 75 кап. на набыццё спецыяльных сродкаў для павятовых камітэтаў. З гэтых сродкаў на набыццё 7 «чароўных ліхтароў» былі выдзелены 1 руб. 50 кап., на ўзнагароджанне кіраўніка харавых спеваў – 9 руб. 25 кап. Між асобнымі павятовымі камітэтамі грошы раздзелены наступным чынам: Бабруйскаму – 565 руб; Барысаўскаму – 485 руб.; Ігуменскаму – 1015 руб.; Мінскаму – 1235 руб.; Мазырскаму – 560 руб.; Навагрудскаму – 2555 руб.; Пінскаму – 1202 руб.; Слуцкаму – 484 руб. У сваю чаргу, Ігуменскім павятовым камітэтам на выпіску карцін і брашур для чытанняў ў бібліятэках-чытальнях было выдзелена: Бярэзінскай – 200 руб., Смілавіцкай – 200 руб., Якшыцкай – 50 руб. Для арганізацыі чытанняў у Магілёве для набыцця «чароўных ліхтароў» і карцін да іх выдзелена 1000 руб., а на падтрымку народнага хору – 280 руб.[87]

У распараджэнне Аршанскага камітэта землеўладальніцай Е.А. Азідавай былі перададзены ўсе яе прадпрыемствы ў мястэчку Любавічы, на сродкі з якіх утрымліваліся чайныя і праводзіліся народныя чытанні.

---

**[84] ЦДГА, ф. 2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 6.**
**[85] ЦДГА, ф. 2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 31.**
[86] ЦДГА, ф.2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 36.
**[87] Там жа.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На першым плане пасля стварэння чайных паўстала праблема арганізацыі народных чытанняў, якія карысталіся вялікім поспехам сярод насельніцтва і, на думку папячыцельства, служылі «не толькі забавай для народа», але і спрыялі «пад'ёму разумовага і маральнага яго развіцця», пры гэтым пажадана было «арганізоўваць і спецыяльныя чытанні па пытанні аб шкодзе п'янства»[88].

У Рэжыцкім павеце Віцебскай губерні камітэтам была арганізавана спецыяльная Рада з удзелам настаўніцкага персаналу па пытанні аб распаўсюджванні народных чытанняў у павеце. Яна распрацавала падрабязную праграму чытанняў «на пачатках узаемнага абмену тэмамі і карцінамі між 14 раёнамі, на якія з гэтай мэтай быў падзелены павет, прычым лектарамі выступалі настаўнікі народных і царкоўна-прыходскіх школ»[89]. Па звестках Пінскага павета «народныя чытанні і гутаркі заўсёды прыцягваюць народу больш, чым дазваляе памяшканне, асабліва калі яны разбаўляюцца спевамі»[90].

Значнае месца ў дзейнасці папячыцельстваў займае арганізацыя народных хароў, якія таксама карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Рэчыцкі і Слуцкі камітэты аддавалі перавагу не дарагім гарадскім харам, а арганізавалі цэлую сетку дробных хароў пры цэрквах і школах. На выдаткі па стварэнні хароў і на ўзнагароджанне выкладчыкаў спеваў і народных настаўнікаў, якія арганізоўвалі хары ў 1899 годзе, было ў агульнай колькасці асігнавана да 5500 руб.[91]

Акрамя таго, у мэтах прадстаўлення народу магчымасці запоўніць вольны час, прадпісвалася ладзіць «танцавальныя вечары, ёлкі, гульні ў шашкі і іншыя забавы»[92]. Вялікай папулярнасцю ў народных мас карысталіся пераважна танцавальныя вечары, гулянні і тэатралізаваныя прадстаўленні.

Пры некаторых гарадскіх чайных, якія выконвалі ролю народных клубаў, ладзіліся бясплатныя кансультацыі для беднага люду па прававых і юрыдычных пытаннях[93].

Зразумела, што арганізаваць падобныя прадпрыемствы магчыма было толькі там, дзе мелася для гэтага спрыяльная глеба з ліку мясцовых юрыстаў, а ініцыятыва, у першую чаргу, павінна была зыходзіць ад папячыцельстваў.

Такім чынам, першым крокам, які прадпрынялі царскія ўлады ў накірунку стварэння сеткі клубных устаноў для народа ў мэтах замены «дзікага разгула неабходным духоўным пажыткам», была менавіта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

88 ЦДГА, ф.2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 5.
**89 ЦДГА, ф.2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 31 «а».**
**90 ЦДГА, ф.2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 32 «а».**
**91 Там жа. Арк. 32 «а».**
**92 Там жа. Арк. 6.**
**93 Там жа. Арк. 32 «а».**

арганізацыя і дзейнасць камітэтаў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, якія займаліся непасрэдна адкрыццём, дзейнасцю і матэрыяльным забеспячэннем чайных, бібліятэк, чытальняў і г.д. Другім значным крокам у напрамку да мэтанакіраванай арганізацыі і дзейнасці культурна-асветных устаноў для народа быў клопат аб пашырэнні агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва, што, у рэшце рэшт, прывяло да стварэння Народных дамоў.

У 1911 годзе Першы маскоўскі агульназемскі саюз па народнай асвеце закрануў пытанне аб пазашкольнай адукацыі і вынес пастанову: «правільнае і паспяховае развіццё гаспадарчага і грамадскага жыцця магчыма толькі пры высокім культурным узроўні ўсяго насельніцтва. Школа, нават пры самай дасканалай яе арганізацыі і значнай працягласці курсу, не можа задавальняць запыты насельніцтва, якія павышаюцца, ..., так як яна абслугоўвае ў кожны момант параўнальна невялікую частку насельніцтва і пры гэтым яшчэ тую, якая не прымае актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, ...а атрыманыя ў школе веды без далейшага замацавання і папаўнення іх хутка забываюцца, у выніку чаго выдаткі на школьную адукацыю без арганізацыі пазашкольнай адукацыі з'яўляюцца малапрадуктыўнымі. У сілу гэтых абставін пазашкольная адукацыя павінна заняць самастойнае месца ў шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне культурнага ўзроўню насельніцтва і быць прызнанай з боку грамадскасці і дзяржавы, і ва ўсялякім выпадку, не менш каштоўнай, чым адукацыя школьная, і павінна быць прызнанай аднолькава неабходнай[94].

Перад губернскімі і павятовымі ўправамі паўстала пытанне аб распрацоўцы мадэлі пазашкольных адукацыйных устаноў. «Складанасць задачы – ажыццяўленне пазашкольнай адукацыі – была абумоўлена markdownрознабаковасцю яе відаў, неабходнасцю зберагчы між імі сувязь і ўзгадніць іх дзеянні, разлічыць па складзе і памеры кола асоб, і ўвогуле, адрозненне ўмоў і асаблівасцей работы ў гэтай справе»[95].

У якасці прыкладу вырашэння праблемы стварэння сеткі пазашкольнай адукацыі і асветы разгледзім праект павятовай управы м. Быхаў Магілёўскай губерні, якая спраектавала для пазашкольнай адукацыі наступныя віды ўстаноў.

**а) Установы адукацыйнага тыпу:**

1. *Нядзельныя (вячэрнія) школы для дарослых і падлеткаў*, якія мелі на мэце вучыць непісьменных чытанню, пісьму і ліку, паўтараць і дапаўняць пройдзены курс з тымі, хто скончыў школу, з такім разлікам, што праз 2 гады школы будуць пераносіцца ў іншыя мястэчкі.

[94] Вестник Могилёвского земства. – 1915. – № 12. – С. 12.
[95] Вестник Могилёвского земства. – 1914. – № 19. – С. 14.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Народныя чытанні,* якія ілюстраваліся нагляднымі дапаможнікамі, светлавымі карцінкамі, кінематографам, грамафонам, і якія прымалі формы гутарак са слухачамі, асобных лекцый і цэлых курсаў.

3. *Бібліятэка,* якая адкрывала доступ да кнігі насельніцтву, якое атрымлівала магчымасць часова карыстацца ёю ў сябе дома, у чытальні або набываць сабе ва ўласнасць.

4. *Музеі і выставы*, якія дасягалі адукацыйных мэтаў наглядным шляхам пры дапамозе прадметаў, што ілюстравалі розныя віды мастацтваў, навукі і тэхнікі, а таксама розныя бакі духоўнага жыцця мясцовага краю.

**б) Мерапрыемствы выхаваўчага характару**: *спектаклі і канцэрты, кінематограф і «чароўны ліхтар»*, якія не толькі задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні насельніцтва, але і спрыялі замацаванню і пашырэнню навуковых і прыкладных ведаў.

У Быхаўскім павеце сетка ўстаноў культуры пазашкольнай адукацыі складалася па раённаму прынцыпу: у цэнтры простых сельскіх ячэек, якія абслугоўвалі кожная сваё мястэчка, размяшчаўся раённы цэнтр, больш складаны па свайму становішчу, які забяспечваў сельскія ячэйкі кнігамі, карцінамі, дапаможнікамі, а таксама дасылаў у вёскі выкладчыкаў і лектараў.

У мэтах забеспячэння «культурнымі прадуктамі» найбольшай колькасці насельніцтва павет дзяліўся на 10 раёнаў па колькасці валасцей – яго натуральных цэнтраў прыцягальнасці, якія да таго ж мелі эканамічнае, культурнае і адміністрацыйнае значэнне. У цэнтры кожнага раёна знаходзіўся Народны дом, які сумяшчаў у сабе ўсе віды пазашкольнай адукацыі, а менавіта: раённую чытальню, раённы музей наглядных вучэбных дапаможнікаў, раённы кінематограф, класы для дарослых, кнігагандлёвы склад. У астатніх паселішчах працавалі простыя ячэйкі, прычым у адным мястэчку раёна, якое займала найбольш цэнтральнае і зручнае становішча (адносна астатніх), размяшчаліся раённая бібліятэка-чытальня, «чароўны ліхтар», курсы для дарослых; у дзвюх – раённыя «ліхтары» і курсы для дарослых, а ў астатніх – толькі «ліхтары». Узначальваў усю арганізацыю павятовы цэнтр, які кіраваў усімі відамі пазашкольнай адукацыі, маючы на мэце дапаўняць адукацыйна-асветныя дапаможнікі і асабісты склад ячэек на месцах і быў даведачнай, пасрэдніцкай і паказальнай арганізацыяй ў педагагічных адносінах ніжэйшым ячэйкам. Да павятовага цэнтра адносіліся таксама 2 рухомыя кнігагандлёвыя склады. Згодна гэтага праекта павятовыя і раённыя цэнтры павінны былі мець уласныя памяшканні, а сельскія ячэйкі знаходзіліся пры пачатковых школах або ў арэндаваных памяшканнях, бібліятэкі – таксама ў спецыяльна арэндаваных будынках.

Пасады загадчыкаў асноўнымі раённымі ячэйкамі – бібліятэкараў, лектараў і іншых дзеячаў пазашкольнай адукацыі, у ведамстве якіх павінны былі знаходзіцца галіны, што патрабавалі спецыяльных навыкаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведаў, па праекту сеткі павінны былі аплочвацца вызначаным зместам. Тэрмін жыццядзейнасці сеткі вызначаецца пятнаццаццю гадамі, а на першы час прадугледжваецца абмежаванне устаноў аднымі бібліятэкамі-чытальнямі, арганізацыяй заняткаў з дарослымі і падлеткамі і народных чытанняў[96].

Менавіта дзейнасць камітэтаў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, якая выклікала да жыцця і шырокую сетку пазашкольных устаноў, спрыяла стварэнню такой значнай формы культурна-асветнай дзейнасці, як Народны дом. Першыя звесткі аб іх адкрыцці на тэрыторыі Беларусі адносяцца да 1899 г. (в. Ліпна Люцынскага павета Мінскай губерні)[97]. Адзначым, што ініцыятарам стварэння Народнага дома было зноў жа папячыцельства аб народнай цвярозасці, а будынак для яго быў прадстаўлены прыватнай асобай – Р.І. Зарай. Пазней менавіта Народныя дамы сталі любімымі тыпамі ўстаноў культуры для народа, якія адчыняліся і дзейнічалі пад патранажам папячыцельстваў. Пазней такія ж Народныя дамы былі адкрыты ў Ваўкавыскім і Купянскім паветах.

Неабходнасць стварэння Народных дамоў выцякала з *трох галоўных неабходнасцей*:

- у асвеце;
- у пашырэнні кола зносін;
- у эканамічнай ўзаемадапамозе адзін аднаму.

Народныя дамы маюць таксама дастаткова багатую гісторыю. Ідэя іх стварэння з’явілася ў Англіі ў канцы XIX стагоддзя. Народны дом, нешта накшталт завешчанага англійскім сацыялістам Фур’е «фаланстэра Дварца будучыні», у якім павінна сканцэнтравацца ўся матэрыяльная і духоўная культура народа, яго сямейнае і грамадскае жыццё. Першы Народны дом быў арганізаваны ў 1887 годзе ў Лондане па ініцыятыве пісьменніка Вальтэра Бэнзага. Затым падобныя ўстановы з’явіліся і ў Францыі, Бельгіі і іншых краінах ды дзяржавах, у тым ліку, і ў Расіі. На тэрыторыі Беларусі (якая ў той час мела назву «Паўночна-Заходні край Расіі») Народныя дамы сталі адчыняцца з 1898 года. Нярэдка ініцыятыва іх стварэння ішла знізу, ад народа. У многіх месцах яны ствараліся на аснове чайных-чытальняў, як, напрыклад, у в. Карсава, і ахоплівалі сваёй дзейнасцю ўсё наваколле.

*Па прынцыпу арганізацыі* існавала *тры віды* Народных дамоў:

а) арганізаваных земствамі;

б) створаных аб’яднаннямі кааператараў і асветных таварыстваў;

в) самастойныя таварыствы «Народны дом».

[96] Внешкольное образование в Быховском уезде // Вестник Могилёвского земства. – 1914. – № 13. – С. 13–16.

[97] ЦДГА, ф. 2555, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 35 «а».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яны былі не столькі клубамі, а хутчэй, менавіта таварыствамі, якія ахоплівалі сваёй дзейнасцю вялікія тэрыторыі, а калі-некалі – і цэлыя рэгіёны.

Грунтуючыся на архіўных дадзеных ЦДГА і перыядычнага друку гэтага часу можна зрабіць выснову, што кожнае таварыства «Народны дом», як і любое іншае аб’яднанне або клуб, мела свой статут, у якім вызначаліся мэты стварэння і асноўныя формы яго дзейнасці, арганізацыя і кіраванне справамі таварыства, склад таварыства, яго юрыдычныя правы і абавязкі, памер грашовых укладаў ды умовы прыняцця і выключэння членаў таварыства, будаўніцтва спецыяльных памяшканняў, яго фінансаванне і кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў, а таксама умовы закрыцця таварыства.

На тэрыторыі Беларусі Народныя дамы ствараліся «по образу и подобию» расійскіх. Таму, як прыклад такога дакумента, можна прывесці праект статута Пермскага Народнага дома, надрукаванага ў «Вестнику», як узор для стварэння статутаў беларускіх устаноў адпаведнага тыпу. Мэтай яго стварэння было «развіццё культурна-асветных пачаткаў сярод мясцовага насельніцтва і дастаўлення яму разумнага выкарыстання святочнага і вольнага часу». У гэтых мэтах былі зацверджаны стварэнне бібліятэкі-чытальні, арганізацыя спектакляў, лекцый, сістэматычныя курсы чытання, якія суправаджаліся «туманнымі і кінематаграфічнымі карцінкамі», кніжны склад, нядзельныя школы, спецыяльныя класы і т.п.

У адрозненне ад дваранскіх клубаў і салонаў гэта таварыства атрымлівае юрыдычныя правы па набыцці і продажы нерухомай маёмасці, наследаванні па тэстаментах, уступленні ў дазволеныя законам дагаворы, і, увогуле, дзейнасці на правах юрыдычнай асобы. Цікавы і той факт, што сродкамі ўтрымання Народнага Дома былі не толькі членскія ўзносы, як у клубах, але і адлічэнні з платных вечароў, спектакляў, канцэртаў, грашовыя выдаткі мясцовых кааператыўных і грамадскіх арганізацый, а таксама, дабравольныя ўклады прыватных асоб.

Членства ў таварыстве «Народны дом» насіла даступны ўсім слаям насельніцтва характар. Не абмяжоўвалася і колькасць удзельнікаў. Забарона тычылася толькі вучняў ніжэйшых і вышэйшых навучальных устаноў, якія не дасягнулі 21 года, ваеннаслужачых і юнкераў, а таксама, асоб, якія падлягалі абмежаванню правоў па суду. Члены таварыства падзяляліся на тры катэгорыі: 1) ганаровыя – асобы, вядомыя культурна-асветнай дзейнасцю; 2) пажыццёвыя – асобы, якія ўносілі адначасова вызначаны ўзнос; 3) сапраўдныя, якія штогод уносілі не менш 25 кап. Усе пытанні (акрамя набыцця і продажу нерухомасці, выбрання ганаровых членаў, выключэння з ліку членаў, для чаго патрабавалася 2/3 галасоў), вырашаліся агульным сходам шляхам галасавання (пры большасці галасоў членаў таварыства).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праўленне складалі 5 асоб, сярод якіх прызначаліся старшыня, сакратар і скарбнік. Яны ж вялі грашовую справаздачу, форму якой вызначаў таксама агульны сход. Тэрмін іх кіравання – 1 год. Штогод на чарговым сходзе выбіралі і рэвізійную камісію, якая сачыла за дзейнасцю кіравання і прадстаўляла даклад агульнаму сходу членаў таварыства. Пытанні ўнясення змен у статут або закрыцця таварыства таксама вырашалі на агульным сходзе.

Побач са статутам Пермскі губернскі сход зацвердзіў і вельмі каштоўны дакумент – правілы выдачы грашовай дапамогі з ліку спецыяльнага фонду губернскага земства. У ім сказана, што памеры выдаткаў на будаванне Народных дамоў у сельскай мясцовасці даходзілі да паловы сабекошту будынка, але не перавышалі 5000 руб., а астатнія сродкі збіраліся сіламі мясцовай арганізацыі. Вызначэнне памераў такіх выдаткаў адбывалася на земскім губернскім сходзе.

Да хадайніцтва аб выдзяленні сродкаў са спецыяльнага фонду на будаўніцтва Народных дамоў неабходна было прыкласці: а) генеральны план мясцовасці (у 2-х экз.), дзе планавалася будаўніцтва з указаннем існуючых паблізу будынкаў і вуліц; б) каштарыс і праект будынка (2 экз.); в) памер сродкаў, сабраных на месцы для гэтых мэтаў. Абавязковым для ўсіх (і гарадскіх, і сельскіх) Народных дамоў было патрабаванне наяўнасці гардэробу і прыбіральні. Сродкі на будаўніцтва Народных дамоў выдавалі і тым паселішчам, дзе зараджалася ініцыятыва стварэння такога таварыства «з нізу», і дзе мясцовае насельніцтва або грамадскія ўстановы бралі на сябе арганізацыю таварыства, матэрыяльны ўдзел у будаўніцтве і далейшае яго ўтрыманне.

Прагрэсіўныя земскія дзеячы бачылі мэтазгоднасць стварэння сеткі Народных дамоў – губернскіх, павятовых, валасных і сельскіх, якія і сталі цэнтрамі пазашкольнай адукацыі і асветы. На тэрыторыі Беларусі гэтыя таварыствы адрозніваліся багаццем і разнабаковасцю формаў арганізацыі і дзейнасці. Па форме арганізацыі яны ўключалі ў сябе бібліятэку, чытальні, вячэрнія класы для дарослых, нядзельныя школы, рамесніцкія майстэрні, дзе навучалі практычнаму авалоданню якім-небудзь рамяством, а таксама сцэны, лекцыйныя і глядзельныя залы для спектакляў, канцэртаў і кінапраглядаў, чайную, гімнастычныя залы, кнігагандлёвыя крамы і склады, хары і аркестры, чытальні і г.д. Галоўнымі формамі работы былі лекцыі, бяседы, канцэрты, спектаклі, чытанні, спартыўныя заняткі, распаўсюджванне кніг, выставы.

У пачатку XX стагоддзя згодна з «Даведнікам па Вільні» А.А. Вінаградава, на 1908 г. толькі ў Вільні налічваліся 11 клубаў, аматарскіх аб’яднанняў і гурткоў і 7 чайных:

Дваранскі клуб – Дваранскі правулак, 1;

Ваенны сход – Ігнацьеўскі правулак, 4;

Рускі грамадскі сход – Трокская вуліца, дом Умястоўскай;

Клуб палескіх чыгуначных дарог – Херсонская вуліца, 5;

Купецкі клуб – вуліца Роса, дом Піманава;

Клуб асоб інтэлігентных прафесій – Завальная, дом Фалевіча;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачтова-тэлеграфны гурток – Дабравешчанская вуліца, 31;
Шахматны гурток – Ігнацьеўскі правулак, 4;
Мастацкі гурток – Херсонская, 5;
Таварыства веласіпедыстаў – у Звярынцы;
Скакавы гурток – Бакшта вуліца, 6
Чайныя:
Пушкінская чайна-сталовая і бібліятэка-чытальня;
Мураўёўская чайна-сталовая і бібліятэка-чытальня;
Лукішская чайна-сталовая і бібліятэка-чытальня;
Сніпшыская чайная і бібліятэка-чытальня;
Сувораўская чайная і бібліятэка-чытальня;
Чайная на Хлебным рынку;
Чайная на Коннай вуліцы.

Прафесійныя, дабрачынныя, спажывецкія і іншыя аб’яднанні ў вольны час задавальнялі патрэбу ў нефармальных зносінах, стваралі ўражанне сацыяльнай роўнасці ўдзельнікаў аб’яднання, што было значным ва ўмовах саслоўнага падзелу ў грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л 2

# УМОВЫ І НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ПРАЦЯГУ XX СТАГОДДЗЯ

## § 1. Клубныя традыцыі XX стагоддзя

Клубная традыцыя (арганізацыя і дзейнасць Народных дамоў, хат-чытальняў, клубаў па інтарэсах) працягваецца і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Дзяржаўная сетка устаноў культуры Беларусі пачала складацца і развівацца на аснове прыняцця ў 1919 годзе палажэння Наркамасветы «Аб арганізацыі сістэмы пазашкольнага выхавання» і распачатай палітыкі нацыяналізацыі ў 1920 годзе пасля вызвалення краіны ад белапалякаў. Згодна з поглядамі тэарэтыкаў клубнай справы гэтага перыяду (Н.К. Крупскай, А.В. Луначарскага, М.В. Пятроўскага, П.П. Блонскага, В. Кержанцава, А.С. Макаранкі, Я.М. Мядынскага) клуб разглядаўся як збіральнік рабочай і сялянскай творчай ініцыятывы, месцам сумеснага адпачынку, асновай якога павінна стаць дзейнасць саміх наведвальнікаў клуба. Але на многія дзесяцігоддзі на справе рэалізоўвалася іншая мадэль клубнай работы, якая была заснаваная на ідэалагічным выхаванні працоўных і атрымала афіцыйную назву «культурнае абслугоўванне насельніцтва».

Для таго, каб надаць большую эфектыўнасць дзейнасці культурна-асветных устаноў, дэцэнтралізаваць кіраўніцтва палітыка-асветнай работай, восенню 1920 года пры Наркамасвеце БССР стварылі Глаўпалітасвет, які павінен быў стаць адзінай планамернай арганізацыяй, якая ажыццяўляла культурнае будаўніцтва ў краіне, аб’ядноўвала на сваёй базе розныя ведамствы і ўстановы культуры, каардынавала дзейнасць на тэрыторыі пэўнага рэгіёна.

На першым пасяджэнні Усерасійскага сходу ў лістападзе 1919 г. Н.К. Крупская зачытала даклад, у якім прапанавала свой план стварэння і развіцця сеткі клубных устаноў культуры на вёсцы, які, дарэчы, быў заснаваны на вопыце дзейнасці Народных дамоў, што працавалі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пазней асноўныя палажэнні сталі грунтам для культурнага будаўніцтва ў нашай краіне. Для ўпарадкавання сеткі ўстаноў культуры і больш якаснай яе работы Н.К. Крупская прапаноўвала 2 асноўныя формы: «цвёрдую», якая стваралася, кіравалася і дзейнічала на дзяржаўныя сродкі і пад дзяржаўным кантролем, і «мяккую», якая стваралася сіламі грамадскасці. «Цвёрдая» сетка разумелася як аснова ўсёй сеткі, будавалася і размяшчалася па тэрытарыяльна-адміністрацыйным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпе з цэнтрам у воласці. «Мяккая» стваралася пераважна па вытворчым прынцыпе і задавальняла запыты розных груп насельніцтва або працоўных калектываў. Іх існаванне было цесна звязана: «мяккая» сетка падпарадкоўвалася «цвёрдай», і таму планавала сваю работу адпаведна ёй, карыстаючыся неабходнай дамапогай, у тым ліку і метадычнай.

Для вясковых жахароў Н.К. Крупская прапаноўвала ствараць не профільныя культурна-асветныя ўстановы (як у горадзе), а адзіныя культурныя комплексы, цэнтрам якіх была хата-чытальня, якая з'яўлялася «...у той жа час і клубам, і сталом-даведкай, і ячэйкай, вакол якой ствараецца школа для дарослых, і экскурсіі, і спектаклі, і розныя практычныя мерапрыемствы культурна-асветнага характару»[98]. У цэнтры ж воласці яна бачыла Народны дом, які павінен быў стаць «сумай усіх культурных устаноў. ... А менавіта... асаблівай бібліятэкай, асаблівым клубам, адмысловай школай, выстаўкай...»[99]. Пры гэтым яны не абавязкова знаходзіліся пад адным дахам, але іх дзейнасць павінна была ўзмацняцца менавіта ўзаемадапамогай, узаемадзейнасцю, аб'яднаннем сіл і сродкаў.

Такім чынам, у вызначаны гістарычны перыяд асноўнымі прынцыпамі дзяржаўнай культурнай палітыкі сталі:

- фарміраванне дзяржаўнай сеткі ўстаноў культуры;
- арганізацыя цэнтралізаванай сістэмы кіравання;
- стварэнне адпаведнай заканадаўчай базы.

**Асновай сеткі пазашкольных устаноў клубнага тыпу сталі шматлікія працоўныя і чырвонаармейскія клубы, дамы асветы, народныя дамы, хаты- і бібліятэкі-чытальні, «чырвоныя куткі». Напрыклад, у Віцебскай губерні колькасць пазашкольных устаноў на 1 ліпеня 1919 года ўяўляла сабой наступную карціну[100]:**

| Паветы | Бібліятэкі | Хаты-чытальні | Культ.-асвет. гурткі | Курсы для дарослых | Народныя дамы |
|---|---|---|---|---|---|
| Сенненскі | 15 | 272 | 22 | – | 3 |
| Невельскі | 44 | 221 | – | 6 | 15 |
| Дрысенскі | 20 | 296 | 18 | 4 | 6 |
| Лепельскі | 39 | 227 | 26 | 49 | 2 |
| Віцебскі | 30 | – | – | 20 | 28 |
| Себежскі | 15 | 53 | 23 | 2 | 5 |
| г. Віцебск | 22 | – | 27 | 9 | 3 |

[98] Крупская Н.К. О работе в деревне в области внешкольного образования / О культурно-просветительной работе. – М., 1969. – С. 29.
**[99] Там жа.**
[100] Віцебскі архіў, ф. 246, воп. 3, спр. 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Акрамя гэтага, у Віцебску на прадпрыемствах горада працавалі 3 клубы для рабочых. Гэта былі савецкія клубныя ўстановы першага пакалення. У многім яны захоўвалі сувязь з дарэвалюцыйнымі пазашкольнымі ўстановамі, размяшчаліся ў іх памяшканнях, але ўжо набывалі адзнакі новага часу: былі пастаўлены цалкам на дзяржаўнае забеспячэнне, значна пашырылася іх аўдыторыя, змяніўся характар і змест дзейнасці.**

Значную цікавасць для нашага даследавання прадстаўляюць і дадзеныя аб складзе сеткі культурна-асветных установ за перыяд з 1921 па 1925 гады, прыведзеныя гісторыкам М.Д. Тацішчавай:

| Тып установы | 1921 | 1922/23 | 1923/24 | 1924/25 | 1925/26 |
|---|---|---|---|---|---|
| Бібліятэкі | 445 | 394 | 404 | 376 | 349 |
| Хаты-чытальні | 2321 | 177 | 355 | 479 | 589 |
| Клубы | 136 | 137 | 176 | 241 | 246 |
| Пункты ліквідацыі непісьменнасці | 3547 | 295 | 234 | 2502 | няма дадзеных |
| Народныя дамы | 151 | няма дадзеных | 51 | 67 | 95 |

**У 1920-я гады паняцце «клуб» і «клубныя ўстановы» сталі атаясамліваецца. Між тым, як вынікае з прыведзеных намі вышэй прыкладаў, яшчэ задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі паняцце «клуб» азначала вольную самадзейнасць і «самоуправляемую» арганізацыю грамадзян, якія аб'ядноўваліся на аснове агульных інтарэсаў. Тут мелі месца як самадзейнасць і аматарская творчасць, так і ініцыятыва адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання, пры якіх стварылася і развівалася на працягу больш 70 год суб'ект-аб'ектная мадэль арганізацыі вольнага часу насельніцтва.**

**З сярэдзіны 1920-х гадоў у рэспубліцы разгарнулася антырэлігійная прапаганда, якая нанесла жорсткі ўдар па працуючых храмах і па традыцыях беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны. Замест старажытных царкоўных абрадаў – хрэсьбін, вянчання, адпявання ўводзіліся новыя: «чырвоныя хрэсьбіны», «камсамольскія шлюбы» і г.д. У дні рэлігійных святаў праводзіліся тэматычныя мерапрыемствы – Дзень лесу, Дзень ураджаю і інш. Новая абраднасць не знаходзіла падтрымкі ў насельніцтва, таму што не выкарыстоўваліся багатая спадчына народа і традыцыі. Цэнтрам аб'яднання ўсіх атэістычных сіл з'яўляліся структуры «Саюза ваяўнічых бязбожнікаў» (СВБ), якія дзейнічалі на ўсіх узроўнях.**

**Саюз ствараўся як культурна-асветная арганізацыя, але часцей за ўсё менавіта з яго выходзілі ідэі гвалтоўных мер барацьбы з царквой. Гэта**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**тэндэнцыя паглыблялася ідэяй «нацыянальнага нігілізму», у выніку чаго пачалося згортванне дзейнасці краязнаўчых таварыстваў. У краіне замацавалася арыентацыя на ўсебаковае рэгуляванне культуры, якая выключала магчымасць яе самаразвіцця.**

**У пачатку 1930-х гадоў пачынаецца фарміраванне сістэмы творчых саюзаў, асноўная ідэалагічная функцыя якіх – кантроль за творчай інтэлігенцыяй і арганізацыя яе дзейнасці ў патрэбным партыйна-ідэалагічным напрамку. З гэтага часу дзяржаўная палітыка абсалютна дамінуе ў дзейнасці сеткі ўстаноў культуры. Здзяйсняецца вызначаная падпарадкаванасць ў катэгорыях саюзнага, рэспубліканскага, абласнога і мясцовага значэння. Паказчыкі культурнага абслугоўвання насельніцтва ўключаюцца ў пяцігадовыя планы развіцця народнай гаспадаркі, замацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база культуры, складваецца сістэма падрыхтоўкі кадраў. У выніку ўзрасла і колькасць культурна-асветных устаноў: з 1930 па 1940 гг. колькасць клубаў у краіне павялічылася з 266 да 1776, хат-чытальняў – з 461 да 1387. Значную ролю ў павелічэнні сеткі сельскіх культурных устаноў адыграла тое, што многія калгасы ўводзілі іх сваімі сіламі[101].**

Такім чынам, нельга не заўважыць, што клубныя ўстановы ў 1920–1930-я гады фарміраваліся пад уздзеяннем разумення «сацыялістычнай культуры» і яе задач. У гэты перыяд паступова ўсталяваўся погляд на культуру, як на з’яву, для якой характэрна ідэалагічна-выхаваўчая функцыя і калектывізм. Менавіта ў гэты перыяд фарміруецца прадстаўленне аб культурна-асветнай рабоце, якая разумеецца як «ідэалагічна-арыентаванае асветніцтва мас», арганізацыя іх культурнай актыўнасці ў калектыўных формах, прапаведзь сацыялістычнага вобраза жыцця і каштоўнасцей з дапамогай новага мастацтва. Паколькі ў 1920–1930-я гады культурныя працэсы ў цэлым збліжаліся з вытворчымі, на ўстановы культуры аўтаматычна пераносілася і вытворчая схема адміністрацыйнага кіравання. Так, у 1930-я гады клуб, замест мабільнай творчай самадзейнай структуры, арыентаванай на нефармальныя сацыяльна-культурныя зносіны, стаў прамым праваднікам афіцыйнай ідэалогіі.

Галоўнай задачай галіны культуры ў 1940–1950-я гады было спрыянне паспяховаму вырашэнню гаспадарча-палітычных задач, якія паўсталі перад нашай краінай. У Беларусі ў 1948 годзе налічвалася 168 раённых Дамоў культуры, 389 калгасных клубаў, 171 сельскі Дом культуры, 2478 хат-чытальняў. Культурна-асветная работа трактавалася як складаючая частка ідэалагічнай дзейнасці дзяржавы па камуністычным выхаванні працоўных. Да гэтага часу ўсе існуючыя грамадскія, грамадска-палітычныя, сацыяльна-культурныя арганізацыі былі цалкам зліты з дзяржаўнымі інтарэсамі, усё культурнае жыццё было падпарадкавана дзяржаве і ідэалагізавана. Незалежнай ад дзяржавы сацыяльна-культурнай дзейнасці быць не магло.

Арганізацыя культуранага адпачынку насельніцтва грунтавалася на суб’ект-аб’ектнай аснове, пры якой насельніцтва краіны разглядалася не ў якасці суб’екта арганізацыі асабістага вольнага часу (і тым больш суб’екта сацыяльна-культурнай дзейнасці), а ў якасці аб’екта ўздзеяння з боку ідэалагічных і кіруючых структур. Гэты стэрэатып склаўся яшчэ ў 1920-я гады, а калі замацаваўся, то стаў адной з найбольш устойлівых дамінацый, якія вызначалі і змест, і методыку, і прынцыпы арганізацыі культурна-асветнай работы і, наогул, усёй дзейнасці ў сферы арганізацыі і правядзення вольнага часу.

**З сярэдзіны 1950-х гг. бюракратычная сістэма кіравання культурай набыла формы замкнутай галіны, упісалася ў агульную сістэму кіравання краінай, дзе фармальна паўната ўлады належала Саветам народных дэпутатаў усіх узроўняў, але кантралявалася партыйнымі органамі.**

**Дзяржаўная рэформа другой паловы 1950-х гг., так званая «хрушчоўская адліга», не магла не закрануць і сферу культуры, але, на жаль, чакаемых змен не адбылося. Станоўчым бокам гэтых пераўтварэнняў было толькі тое, што яны дазволілі захаваць у культурным жыцці краіны шматпланавасць і разнастайнасць. Нават**

[101] Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**наступнае ўзмацненне жорсткасці ідэалагічнага рэжыму ўжо не дасягала поўнага кантролю над сітуацыяй. Усё гэта ўзмацняла творчую энергію інтэлігенцыі, якая не толькі ў іншасказальным сэнсе выказвала сваё непагадненне з афіцыяльнай ідэалагічнай культурнай палітыкай, а ўжо стала выступаць больш адкрыта.**

З канца 1950 – пачатку 1960-х гадоў фарміруецца новая мадэль устаноў культуры. На першы план выступаюць задачы рацыянальнага размяшчэння ўстаноў культуры. Паступова змяняецца і погляд на «прыроду» культуры. Жыццесцвярджальныя і ідэалагічна-выхаваўчыя прадстаўленні аб культуры паступова адыходзяць на другі план, а першачарговай становіцца задача культурнага абслугоўвання насельніцтва.

У 1960-я гады пачалі складвацца новыя традыцыі ў грамадскім жыцці, якія ў многім вызначылі і сённяшнюю сацыяльна-культурную сферу рэгіёнаў. Найперш, гэта было развіццё грамадскіх пачаткаў у культурна-асветнай рабоце. У 1965 годзе ў рэспубліцы на грамадскіх пачатках працавала 878 клубаў і бібліятэк. Найбольш яркім прыкладам дзейнасці на грамадскіх пачатках была работа універсітэтаў і школ культуры, музычных і літаратурных лекторыяў.

У гэты ж час замацоўваецца планавы пачатак у клубнай дзейнасці. У эксперыментальным парадку распрацоўваліся нарматывы для раённых Дамоў культуры, якія прадугледжвалі колькасць самадзейных груп (гурткоў, аб'яднанняў, студый, секцый, клубаў па інтарэсах у разліку на адзін раённы Дом культуры), колькасць груп, рэгулярнасць заняткаў, колькасць масавых мерапрыемстваў.

Для мадэляў устаноў культуры 1960–1970-х гадоў характэрны тыя ж схемы кіравання, што і для 1920–1930-х гг., толькі ў дадзеным выпадку яны больш складаныя: пашыраюцца кіруючы персанал і справаздачнасць. У рамках працуючай ў гэты перыяд сферы кіравання істотна ўзмацняюцца функцыі кантролю (ідэалагічнага, рэпертуарнага і г.д.).

Сярэдзіна 1970-х гадоў у рэспубліцы характарызавалася працэсамі цэнтралізацыі, у выніку якіх відавочна звузіліся магчымасці сацыяльна-культурнай дзейнасці насельніцтва Беларусі, таму што яны з'явіліся вынікам агульнадзяржаўных працэсаў адміністравання ў афіцыйнай культуры, а дзейнасць клубных устаноў уступіла ў супярэчлівасць з сапраўднымі інтарэсамі і запытамі насельніцтва, яго імкненнем да нефармальных зносін, атрымання аб'ектыўнай інфармацыі.

З канца 1970 – пачатку 1980-х гадоў можна гаварыць аб фарміраванні новай мадэлі ўстаноў культуры. Неабходнасць пераходу да яе была выклікана тым, што менавіта ў гэты перыяд у сферы культурнага абслугоўвання вызначыўся шэраг негатыўных тэндэнцый. Па-першае, ужо з канца 1960-х гг. стала зніжацца наведвальнасць многіх устаноў культуры, у т.л. і клубных. Гэта можна растлумачыць многімі прычынамі, сярод якіх, напрыклад, канкурэнцыя тэлебачання і г.д. Па-другое, канкурэнцыя, вызначаная насычэннем сеткі прадпрыемстваў культурнага абслугоўвання, якое дазволіла наведвальніку самому выбіраць прадпрыемствы з больш высокім узроўнем культурнага абслугоўвання, больш зручна размешчаныя, тыя, што маюць больш цікавы рэпертуар і г.д. Па-трэцяе, адсутнасцю ўмоў (будынкаў спецыяльнага прызначэння, якасці паслуг, цікавага рэпертуара і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш.), якія дазвалялі б весці дыферэнцыраванае абслугоўванне насельніцтва з ўлікам узроўню жыцця, мастацка-творчых густаў і запатрабаванняў таго ці іншага грамадзяніна.

На працягу ўсяго савецкага перыяду павышаўся адукацыйны і агульнакультурны ўзровень насельніцтва. Галіна культуры значна замацавалася матэрыяльна і тэхнічна, павысіўся ўзровень падрыхтоўкі кадраў, адбылося станаўленне культурна-асветнай работы як навукі. З развіццём сучасных сродкаў сувязі і інфармацыі значная частка насельніцтва ўспрымала культурныя каштоўнасці ў абход ідэалагічных бар'ераў. Найбольш ярка гэта тэндэнцыя праявіла сябе ў практыцы «самвыдата» і распаўсюджвання самадзейных музычных запісаў у 1970–1980-я гады. Менавіта назапашванне падобных тэндэнцый падзяліла культуру на «афіцыйную» і «неафіцыйную», забяспечыўшы апошняй вядучую ролю ў сферы культуры ў рэформах сярэдзіны 1980-х гадоў.

Калі ў 1960 годзе ў нашай краіне працавала 5333 клубныя ўстановы, то да 1985 года іх колькасць павялічылася да 6374. Аднак формы работы многіх культурна-асветных устаноў не змяняліся дзесяцігоддзямі, адставалі ад запатрабаванняў часу, агульнаадукацыйнага ўзроўню людзей. Часта дубліраваліся і мерапрыемствы, якія праводзіліся культурна-асветнымі, спартыўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

З сярэдзіны 1980-х гг. была распачата спроба стварэння цэласнай сістэмы ўстаноў культуры, спорту, адпачынку, якая праявіла сябе ў будаўніцтве і адкрыцці шэрагу культурна-спартыўных комплексаў (КСК) амаль што ў кожнай мясцовасці. Комплексны сістэмны падыход да кіравання, які абумовіў і прынцыпы арганізацыі, дазваляў разглядаць культурна-спартыўны комплекс як цэласны аб'ект кіравання. Гэта забяспечвалася па-першае, адзінствам структур кіравання ўстаноў культуры і спорту на розных узроўнях, а па-другое, узаемасувяззю тэрытарыяльнага і галіновага кіравання. Да пачатку 1987 года ў рэспубліцы іх налічвалася 726, але сёння ідэя стварэння комплексаў разглядаецца як «спушчаная» «зверху» чарговая спроба цэнтралізацыі і рэгламентацыі сферы, якая найменш гэтаму адпавядае. Аб'яднанне ўсёй шматвобразнасці форм, відаў, праяўленняў дзейнасці ў сферы вольнага часу розных груп людзей, а таксама адпаведных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў да адзінага кіруючага імі органа. Гэтыя спробы не сталі паспяховымі і па прычыне рэштковага прынцыпу фінансавання КСК.

Пасля прыняцця курса на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, кіраўніцтва абяцала адмовіцца ад вышэйназванага прынцыпу фінансавання галін сацыяльнай сферы. І сапраўды, да 1990 года выдаткі на культуру павялічыліся. У 1991 годзе крызіс савецкай палітычнай і эканамічнай сістэм дасягнуў свайго апагею. У рэспубліцы павысіўся інтарэс да гісторыі і сучаснасці народнай культуры; ад процілпастаўлення розных культурных слаёў – афіцыйнага і андэграўндскага, бытавога да засваення полікультурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторы, якая ахоплівае традыцыйны фальклор, аматарскую культурна-мастацкую дзейнасць і розныя ініцыятыўныя формы і накірункі мастацка-творчай актыўнасці насельніцтва, як індывідуальныя, так і групавыя. На базе устаноў культуры пачалі стварацца фальклорныя калектывы, клубы народных майстроў, якія перараслі ў новы тып устаноў культуры – Дом рамёстваў, Дом фальклору. Гэты ж перыяд адзначаецца значным ростам аматарскіх аб’яднанняў, ствараемых па ініцыятыве «знізу», што выклікае неабходнасць перабудовы арганізацыі і дзейнасці сацыяльна-культурнай сферы па прынцыпу суб’ект-суб’ектных адносін.

Асветная накіраванасць выхаваўчай дзейнасці ў сферы вольнага часу на ўсіх яе этапах аказвала і аказвае вялікі ўплыў на культурны ўзровень чалавека, шматразова ўзбагачае яго духоўны свет і набор відаў паводзін і дзейнасці.

Авалоданне культурай азначае для чалавека ўзрастанне ступеняў свабоды ў самарэалізацыі і сацыяльных зносінах. Які б характар не атрымала правядзенне вольнага часу, спецыфічнай яго рысай было і ёсць імкненне чалавека праводзіць яго сумесна з іншымі людзьмі. Гэта знайшло ўвасабленне ў аб’яднаннях у сферы вольнага часу, у таварыствах, якія ствараліся для сумеснага правядзення вольнага часу на аснове агульных інтарэсаў і памкненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## § 2. Тэндэнцыі развіцця клубных традыцый Беларусі канца XX стагоддзя

Сацыяльна-культурная сітуацыя ў рэспубліцы на мяжы стагоддзяў складаецца ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічных рэформ, якія праводзяцца кіраўніцтвам дзяржавы і таму падуладна ўплыву як пазітыўных, так і негатыўных вынікаў дадзенага працэсу. Праблемнае поле сучаснай сферы вольнага часу вызначаецца і карэктуецца на аснове аналізу сацыяльна-культурнай сітуацыі, якая сёння шматскладаная і супрацьлеглая. З аднаго боку, назіраюцца пазітыўныя перамены, звязаныя з актывізацыяй сацыяльна-культурнай творчасці, узбагачэннем спектру культурных ініцыятыў за кошт развіцця рознага роду грамадскіх аб’яднанняў, рухаў, клубаў, асацыяцый.

Мадэрнізацыйныя працэсы апошняга дзесяцігоддзя нарадзілі новыя аб’екты культуры, пашырылі сферу паслуг, значна павялічылі культурны патэнцыял грамадства. З другога боку, набіраюць сілу тэндэнцыі і працэсы, якія негатыўна характарызуюць сённяшнюю сацыяльна-культурную сітуацыю. Павялічваецца разрыў паміж інавацыйным патэнцыялам культуры, масавай здольнасцю яго засваення і выкарыстання ў штодзённай сацыяльна-культурнай практыцы. Дынамізм грамадскага культурнага жыцця выклікаў значнае ўскладненне структуры і зместу адносін людзей адзін да аднаго, з прыродным і ненатуральным (штучным) наваколлем, якое выўляецца як у аб’ектыўных паказчыках (у колькасным павелічэнні якасна розных прадметаў, мастацкіх вобразаў, узораў паводзін і ўзаемадзеяння), так і ў суб’ектыўнай плоскасці ўскладнення.

Тэарэтычны аналіз нешматлікіх работ айчынных даследчыкаў гісторыі і тэорыі сучаснай сацыякультурнай сферы (у першую чаргу работ А.А. Макаравай) паказвае, што аптымальны варыянт развіцця, які мабільна рэагуе на перамены ў сацыяльна-культурнай сітуацыі рэгіёна, магчымы менавіта на ўзроўні правядзення рэгіянальнай культурнай палітыкі. Перспектыўнае развіццё сеткі ўстаноў культуры і ўсёй сферы правядзення вольнага часу павінен грунтавацца на аднаўленнні культурна-гістарычных каранёў, уліку ўмоў жыцця насельніцтва пэўнага рэгіёна Беларусі з аднаго боку, і пашырэння клубнага руху – з другога.

Улічваючы тое, што нацыянальная культура з’яўляецца асновай сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства, выхад з сённяшняй крызіснай сітуацыі трэба шукаць, перш за ўсё, у самой духоўнай сферы. Для гэтага культура (асабліва рэгіянальная) павінна вярнуць страчаную цэласнасць, адрадзіць гістарычную пераемнасць, асэнсаваць сваю духоўную самабытнасць. «Аднаўленне цэласнасці і арганічнасці нацыянальна-культурнага свету – задача, – пісаў Д.С. Ліхачоў, – не менш істотная, чым захаванне навакольнага асяроддзя, яна неабходна для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«духоўнай аседласці» чалавека, яго маральнай дысцыпліны і сацыяльнасці»[102].

Усё гэта дазваляе выявіць і некаторыя агульныя сацыяльна-культурныя тэндэнцыі, якія склаліся ў рэспубліцы ў перыяд рэфармавання грамадства. Усё больш відавочным становіцца, што недаацэнка духоўных заканамернасцяў, адсутнасць належнага разумення сацыякультурных прынцыпаў функцыянавання грамадства, значная недаацэнка ролі і магчымасцей клубных фарміраванняў для ўсёй сацыяльна-культурнай сферы краіны прыводзяць да многіх выдаткаў і новых крызісных з'яў у грамадстве.

Выбар напрамкаў далейшага развіцця сферы сацыяльна-культурнай дзейнасці, метадаў і формаў рэгулявання розных бакоў духоўнага жыцця грамадства вызначаюцца асаблівасцямі сацыякультурнай сітуацыі, якія склаліся пасля распаду СССР. Новая сітуацыя карэнным чынам адрозніваецца ад той, што фарміравалася і развівалася на працягу больш за 70 гадоў.

Таму ў кантэксце размовы аб сучасных магчымасцях і перспектывах накірункаў развіцця клубных фарміраванняў і ўстаноў на Беларусі, неабходна спыніцца на гэтых асаблівасцях культурнай сітуацыі. Шматзначнасць і супярэчлівасць у дастатковай ступені тлумачыцца тым, што яна сама знаходзіцца на этапе фарміравання, калі пазітыўныя працэсы самаарганізацыі культуры яшчэ не запрацавалі ў поўную моц, а негатыўныя тэндэнцыі прымаюцца за сацыяльна-культурныя з'явы.

Таму мы прапануем выдзяляць *тры канцэптуальныя напрамкі*, якія характарызуюць увесь зместавы стан сучаснай сацыяльна-культурнай сітуацыі. Унутранае развіццё гэтых напрамкаў вызначаецца закладзенымі ў іх супрацьлегласцямі, рэалізацыя якіх вызначае будучае беларускай цывілізацыі. Яны суадносяцца з іх рэгіянальнымі праявамі, як агульнае з прыватным, дзе ў спецыфіцы і самабытнасці канкрэтнай тэрыторыі вызначаюць асаблівасці сацыяльна-культурнай сітуацыі рэгіёнаў.

Заканамерна характарыстыку сацыякультурнай сітуацыі пачынаць з *працэсу кардынальнага змянення светапоглядных установак і агульнаметадалагічных прынцыпаў*. Са стратай манаполіі таталітарнай ідэалогіі, якая панавала як агульнадзяржаўная і абавязковая, у тым ліку ва ўсіх сферах духоўнага, грамадскага і культурнага жыцця, дамінуючымі становяцца агульначалавечыя каштоўнасці. Змяняюцца адносіны да культурнай спадчыны, рэлігіі, дасягненняў культуры «заходнееўрапейскага» грамадства і эміграцыі, пачынаецца працэс вяртання культуры Беларусі ў адзіную сусветную культурную прастору. Разам з тым, у сучасным грамадстве не паспелі сфарміравацца высокаўстойлівыя

[102] Лихачёв Д.С. Экология культуры // Прошлое – будущему. – Л.: Наука, 1995. – С. 51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўна-маральныя арыенціры, прасочваюцца тэндэнцыі дэгуманізацыі жыцця, культуры і мастацтва, нігілізму, грамадскай апатыі.

Наступным напрамкам з'яўляецца *гістарычны паварот да чалавека, яго запатрабаванняў, інтарэсаў, запытаў.* У Канстытуцыі чалавек як асоба абвяшчаецца вышэйшай каштоўнасцю. У «Законе аб культуры»[103] зацвярджаецца яго прыярытэт ва ўсіх сферах і формах культурнай дзейнасці, гарантуецца свабода творчасці, інтэлектуальная ўласнасць знаходзіцца пад аховай закона. Аднак сацыяльная безабароннасць работнікаў культуры, складанасці ў фарміраванні рынку культурных паслуг і мастацкіх каштоўнасцей прыўнеслі ў жыццё многія негатыўныя з'явы, у тым ліку, абнішчэнне мастацкай інтэлігенцыі, падзенне прэстыжу культуры ў грамадстве, у выніку чаго адбываецца і значная пераарыентацыя грамадскай свядомасці – з духоўных каштоўнасцей на каштоўнасці матэрыяльнага дастатку.

Трэцім накірункам з'яўляецца *развіццё рыначных адносін*, што нарадзіла новую парадыгму гаспадарчага механізма і менавіта тут узнікае адна з галоўных супярэчнасцей працэсу мадэрнізацыі ў сферы культуры – паміж неабходнасцю дастаткова хуткага абнаўлення існуючых культурных набыткаў і сістэмы духоўнай рэгуляцыі, якая ўжо не адпавядае патрэбнасцям новага грамадства, і зберажэннем таго каштоўнага, што падтрымлівае жыццёвазначныя функцыі грамадства ў яго шматвобразнай і шматузроўневай сістэме вытворчасці і дзейнасці[104]. Гэта супярэчнасць выліваецца ў супрацьстаянне паміж прыхільнікамі новай індустрыі культуры і яе пераводу на рыначныя адносіны і тымі, хто абараняе гуманістычныя набыткі культуры мінулых эпох. Разам з тым, гэта супярэчнасць мае адпаведнае функцыянальнае значэнне, неабходнае для паўнацэннага існавання грамадства. Другая супярэчнасць – у неабходнасці радыкальнага абнаўлення і пераадолення існуючых у грамадстве «застойных» парадкаў, якія прывялі да нарастаючага адставання грамадства ад сучаснага сусветнага ўзроўню, з аднога боку, да неабходнасці падтрымкі сацыяльнай стабільнасці і адзінства грамадства – з другога[105].

Мы падзяляем погляды даследчыкаў Т.Р. Кісялёвай і Ю.Д. Красільнікава, якія адрозніваюцца ад іншых пунктаў гледжання тым, што ў іх рабоце сацыяльна-культурная сітуацыя характарызуецца прынцыповай тэндэнцыяй, праходзіць заканамернае дыялектычнае перарастанне культурна-асветнай работы ў больш шырокую, шматгранную з'яву –

---

**[103] Закон Белорусской ССР «О культуре в Белорусской ССР» // Нормативно-правовые акты Республики Беларусь в сфере культуры. – Минск, 1996. Вып.1. – С. 5–20.**

**[104] Ерасов Б.С. Социальная культурология. – М., 1997. – С. 515.**

**[105] Ерасов Б.С. Социальная культурология. – М., 1997. – С. 516.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«сацыяльна-культурную дзейнасць»[106]. Гэта можна растлумачыць найперш зменлівай прыродай грамадства, актуалізацыяй гісторыка-культурных традыцый рэгіёнаў Беларусі.

У працэсе даследавання гэтых праблем на тэрыторыі Расіі, культуролаг А.І. Арнольдаў сцвярджае, што прынцыповая навізна выкарыстанння сацыякультурнага фактара пры аналізе грамадскага развіцця, заключаецца ў тым, што пры гэтым «павінна ўлічвацца спецыфіка законаў культуры і іх канкрэтнае сацыяльнае быццё»[107].

Такі падыход дае новую, сінтэтычную, гістарычна канкрэтную ацэнку рэалій, якія характарызуюць сацыяльнае і культурнае жыццё. Грамадства здольна працаваць і плённа развівацца толькі пры ўмове пераадолення супраціўлення між культурай і сацыяльнымі зносінамі, ва ўмовах пастаяннага аднаўлення іх адзінства, з абавязковым улікам спецыфічных законаў культуры.

Працэс развіцця культуры нельга адрываць ад змен, якія адбываюцца ў сацыяльным і эканамічным жыцці краіны. Культура не здольна развівацца без сувязі з рэальнымі грамадскімі магчымасцямі і ўзнікае як праява сукупнага духоўнага патэнцыялу, які рэалізуецца часта незалежна ад сацыяльнага заказу. Аналіз сацыяльна-культурнай дзейнасці будзе не поўным без выяўлення прычын актывізацыі і ўзрастання сацыяльнай значнасці культуры і яе перарастання ў віды і формы сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Найперш неабходна вызначыць рэальнае месца самой культуры ў жыцці сучаснага грамадства. Даследчык А.І. Арнольдаў пісаў аб законе прыярытэтнасці культуры[108]. Працягваючы гэтую думку, А.Я. Фліэр у 1994 годзе заклікае адмовіцца ад марксісцкай догмы аб абсалютным прыярытэце эканомікі ў развіцці грамадства, прызнаць прыярытэтнасць культуры, як сукупнасць каштоўнасна-адкарэктаваных формаў грамадскага жыцця[109].

Аднак аб’ектыўнае ўзрастанне сацыяльнай ролі культуры пакуль што ніяк не адбілася на культурнай палітыцы ў нашай краіне, на прызнанні яе адной з важнейшых і прыярытэтных сфер жыццядзейнасці грамадства. Відаць, не так шмат часу прайшло з рэальных перамен у духоўнай сферы дзяржавы, якія эмпірычна падцвердзілі сказанае вышэй. Але сёння тэарэтычна можна вызначыць і тыя працэсы, вынікам якіх з’яўляецца сацыялагізуючая і ўзрастаючая роля культуры:

---

[106] Киселёва Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельности. – М., 1995. – С. 14.

**[107] Арнольдов А.И. Человек и мир культуры. – М., 1992. – С. 11.**

**[108] Арнольдов А.И. Культурология как познание культуры: новые подходы // Культурология сегодня. Основы. Проблемы. Перспективы. – М., 1993. – С. 9.**

**[109] Флиер А.Я. Основы культурной политики России // Общественные науки и современность. № 5. 1994. – С. 19.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Вызваленне ад ідэалагічнага дыктату.

2. Акумуляцыя гістарычнага вопыту ў выглядзе сацыяльна-культурных каштоўнасных арыентацый.

3. Рэгуляванне практычнай жыццядзейнасці грамадства з дапамогай заснаваных на каштоўнасных арыентацыях сацыякультурных норм калектыўнага і індывідуальнага вобразу жыцця.

Такім чынам, культура не толькі выконвае функцыю механізму, які забяспечвае развіццё самой цывілізацыі як асаблівага гістарычна сфарміраванага спосабу існавання вялікай сацыяльнай лучнасці людзей[110].

Праблемы сацыялізацыі культуры асабліва праяўляюцца на рэгіянальным узроўні, таму што менавіта тут мае магчымасць аптымальны варыянт развіцця сацыяльных службаў сферы культуры і вольнага часу, які ўлічвае геапалітыку, рэгіянальную самабытнасць, наяўнасць мясцовых, інстытуцыянальных і чалавечых рэзерваў, што забяспечваюць сацыяльна-педагагічны працэс сацыялізацыі і інкультурацыі насельніцтва.

Перспектыўным ўяўляецца вывад даследчыкаў Т.Р. Кісялёвай і Ю.Д. Красільнікава аб тым, што сацыяльна-культурная дзейнасць, па сутнасці, можа разглядацца самастойнай падсістэмай агульнай сістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі жыхароў рэгіёна[111].

Асноўная мэта сацыяльнага выхавання – спрыянне развіццю чалавека як асобы, рэалізацыі яго здольнасцей і магчымасцей у грамадстве. У структуры канкрэтных мэт сацыяльнага выхавання наперад выступаюць задачы прывядзення ў адпаведнасць двух бакоў узаемадзеяннння: грамадства, якое накіроўвае выхаваўчыя магчымасці ўсіх суб’ектаў і сфер жыццядзейнасці ў інтарэсах кожнага чалавека, і механізма сацыялізацыі самой асобы, актывізацыі яе творчага патэнцыяла.

Адной з характарыстык сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, дастаткова ярка праявіўшыхся на фоне бурных культурных працэсаў, з’яўляецца палярызацыя мастацка-эстэтычных патрабаванняў людзей. З аднога боку, даводзіцца гаварыць аб слабым развіцці патрэбнасцяў у сферы вольнага часу вялікіх груп людзей, асабліва моладзі, іх арыентаванні на простае выкарыстанне масавых, далёка не лепшых узораў культурнай дзейнасці як айчыннай, так і заходняй вытворчасці.

Сённяшняя сацыяльна-культурная сітуацыя дазваляе чалавеку як ніколі раней бесперашкодна займацца любымі відамі заняткаў у вольны час. Аднак далёка не кожны у сілу непадрыхтаванасці, наразвітасці культурна-эстэтычных патрэбнасцяў, здольны выкарыстаць рэальныя магчымасці, аддаючы перавагу тыражыруемым, модным і найбольш масавым формам выкарыстання вольнага часу.

---

**[110] Новикова Л.И. Цивилизация как идея и как объяснительный принцип исторического процесса // Цивилизация, 1992. Вып. 1. – С. 21.**

**[111] Киселёва Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельности. – М., 1995. – С. 12.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З другога боку, назіраецца ўзмацненне асабістых пачаткаў, «суб'ектывізацыя» культурных працэсаў вядзе да развіцця ў пэўнай групе людзей патрэбнасці не толькі ў далучэнні да каштоўнаснага фонду культуры як да нечага чыста знешняга, але і засвоіць яго як асабісты. Вынікам гэтага стала змяшчэнне акцэнту з выкарыстання «гатовых» каштоўнасцей культуры на іх актыўнае стварэнне, хоць дадзеная тэндэнцыя характэрна не для шырокіх слаёў насельніцтва.

Новая сацыяльна-культурная сітуацыя абумовіла і новы падыход да методыкі культурна-дасугавай дзейнасці, якая будуецца на аснове стварэння арганізацыйна-педагагічных ўмоў задавальнення і павышэння запатрабаванняў чалавека ў сферы вольнага часу. Гэта методыка зацвярджае ў сферы вольнага часу **суб'ектна-суб'ектыўныя адносіны,** забяспечвае пераўтварэнне аб'екта культурна-дасугавага ўздзеяння ў суб'ект сацыяльна-культурнай творчасці.

Эвалюцыя сацыяльна-культурнай дзейнасці – гэта не толькі вынік яе ўнутранага развіцця, але і вынік незваротных змен, якія адбываюцца ў жыцці грамадства. На культуру рэгіёнаў Беларусі аказваюць уплыў (непасрэдны і апасродкаваны) тэндэнцыі развіцця сусветнай культуры мяжы XX–XXI стагоддзяў: усё большая інтэграцыя розных складаючых частак культуры, яе экалагізацыя і інфарматызацыя, распаўсюджванне масавай культуры, дыялог з заходнееўрапейскай, усходняй і славянскай культурамі, які ў апошні час значна ўзмацніўся.

Праблемы рэфармавання сучаснага грамадства ў многім караняцца ў культурнай сферы. Пераход да свабоднай рыначнай эканомікі не можа быць здзейснены аўтаматычна, без выпрацоўкі адпаведных правіл і адначасова адпавядаючых культуры народа рыначных працоўных матывацый і формаў грамадскага жыцця, калі застаюцца незапатрабаванымі нацыянальныя культурныя традыцыі, і побач з гэтым дастаткова моцна адчуваецца цікавасць да аднаўлення аўтарытарных спосабаў мыслення і дзеяння.

Сучасная навукаёмкая вытворчасць патрабуе павышэння ў ёй долі жывой творчай працы, развіцця творчага патэнцыялу ўсіх яго ўдзельнікаў, што магчыма толькі пры дастаткова высокім узроўні культуры. Названыя тут абставіны дазваляюць разглядаць сацыяльна-культурныя рэаліі непасрэдна ў кантэксце сённяшніх сацыяльна-эканамічных працэсаў і новай геапалітыкі.

Вызначым ***асноўныя спецыфічныя характарыстыкі*** сацыяльна-культурнай сітуацыі ў нашай краіне ў канцы XX стагоддзя:

**I.** Працэс змяншэння колькасці насельніцтва.

**II.** Адмоўны інтэнсіўны прырост насельніцтва.

**III.** Высокая жыццядзейнасць малых гарадоў.

**IV.** Дэфіцыт сельскага насельніцтва пры яўнай яго палавой дыспрапорцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**V.** Высокі ўзровень адукаванасці грамадства.

**VI.** Дастаткова вялікая колькасць культур, якія адрозніваюцца ад традыцыйнай, беларускай.

**VII.** Міграцыйны паток з краін бліжняга замежжа і з аднаго рэгіёна ў другі.

**VIII.** Сукупнасць маланаселеных, аддаленых ад гарадоў і адзін ад аднаго населеных пунктаў сельскага тыпу.

**IX.** Нераўнамернасць даступнасці ўстаноў культуры для насельніцтва.

**X.** Наяўнасць беспрацоўя ў рэспубліцы.

Разгледзім іх больш падрабязна. *Першай* з вызначальных спецыфічных характарыстык сацыяльна-культурнай сітуацыі ў нашай краіне з’яўляецца працэс змяншэння колькасці насельніцтва.

У пасляваенны час колькасць насельніцтва Рэспублікі Беларусь да 1994 г. пастаянна ўзрастала. Аднак тэмпы прыросту грамадзян нашай краіны пачалі паступова скарачацца ўжо з пачатку 1970-х гг. У перыяд між перапісамі насельніцтва 1989 і 1999 гг. адбылося абсалютнае змяншэнне колькасці насельніцтва на 107 тысяч чалавек (або на 1%). Гэта выклікана тым, што з пачатку 1993 г. у краіне пачалася дэпапуляцыя: гадавая колькасць памерлых перавысіла колькасць народжаных. У 1990-я гг. пачынаецца міграцыйны прыток у рэспубліку, які ўсё ж не кампенсуе змяншэння насельніцтва. У выніку – аб’ём інтэнсіўнага змяншэння насельніцтва працягвае павялічвацца. Гэта адбываецца па прычыне зніжэння колькасці жанчын узросту найбольшага дзетараджэння (20–29 гадоў) і падзення агульнай колькасці дзетараджэння.

Скарачэнне жыццёвага ўзроўню за апошнія гады таксама аказала ўплыў на памяншэнне частаты дзетараджэння ў беларускіх сем’ях. Рэзкае змяншэнне нараджальнасці абумовіла і змяншэнне лічбы дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў. Калі ў 1989 г. колькасць дзяцей перавышала колькасць людзей пенсійнага ўзросту амаль на 500 тысяч, то ў 1999 г. колькасць асоб, старэйшых за працаздольны ўзрост, на 28 тысяч чалавек павялічылася ў параўнанні з колькасцю дзяцей.

Аналіз узроставай структуры насельніцтва сведчыць, што ў рэспубліцы ўзмацняецца працэс старэння насельніцтва. У адпаведнасці з класіфікацыяй Арганізацыі Аб’яднаных Нацый насельніцтва лічыцца старым, калі доля асоб ва ўзросце больш 65 гадоў складае 7%. У 1993 г. доля гэтай часткі насельніцтва ў РБ перавысіла 13%. Пятая частка ўсяго нашага насельніцтва – асобы, старэйшыя за працаздольны ўзрост. Доля працаздольнага насельніцтва ў гарадскіх пасяленнях складае 62% супраць 46% у сельскай мясцовасці, а доля асоб пенсійнага ўзросту ў гарадскім насельніцтве – 16% супраць 34% сельскага. На аснове прыведзенага прыкладу відаць, што ўзрастае неабходнасць стварэння і развіцця клубных фарміраванняў і ўстаноў для людзей сталага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Другой* асаблівасцю сацыяльна-культурнай сітуацыі ў рэспубліцы мы вызначылі адмоўны інтэнсіўны прырост насельніцтва.

Колькасць гарадскога насельніцтва нашай краіны стабільна ўзрастала ў перыяд з 1959 па 1999 гг. – у 2,8 разоў; а колькасць вясковага насельніцтва за гэты ж час зменшылася на 45%. У перыяд з 1989 па 1999 гг. лік жыхароў гарадоў павялічыўся на 5%, што ў пяць разоў менш, чым за папярэднія 10 год (з 1979 па 1988 гг.). Рэзкі спад міграцыйнага прыросту ў буйных гарадах назіраецца па прычыне ўнутранай міграцыі сельскай моладзі з-за цяжкасцей і, найчасцей, немагчымасці працаўладкавання, адсутнасці перспектыў у атрыманні дзяржаўнага жылля або будаўніцтва ўласнага жылля ў горадзе для большасці маладых спецыялістаў. Гэтыя пытанні лягчэй вырашаць у раённых гарадах або пасёлках гарадскога тыпу, адсюль – незвычайны рост насельніцтва ў гарадах з папярэдне малой колькасцю насельніцтва. Гэта палажэнне прынцыпова важна для характарыстыкі сацыяльна-культурнай сітуацыі рэспублікі, таму што яно адлюстроўвае высокую жыццядзейнасць малых гарадоў. Менавіта па гэтай прычыне мы вызначылі яго як *трэцюю* асаблівасць сацыяльна-культурнай сітуацыі ў рэспубліцы. Гэта сцвярджае неабходнасць аб стварэнні большай колькасці ўстаноў культуры сферы вольнага часу, а тым ўстановам, якія дзейнічаюць, стварацць больш шырокі спектр розных аб'яднанняў, клубаў, таварыстваў па інтарэсах.

Асобнага аналізу патрабуе структура сельскага насельніцтва краіны як традыцыйна-аграрнай. Найперш, гэта ярка выяўлены недахоп сельскага насельніцтва – 31% ад агульнай яго колькасці. Акрамя абсалютнага недахопу насельніцтва ў сельскай мясцовасці выклікаюць сур'ёзныя хваляванні і дыспрапорцыі ў полаўзроставых групах. Колькасць жанчын у гарадскіх пасяленнях ва ўзроставай групе да 25 гадоў менш колькасці мужчын, а ў сельскай мясцовасці – ва ўзроставай групе да 50 гадоў. Гэта ў значнай ступені можна растлумачыць больш высокім міграцыйным адтокам сельскіх жанчын ва ўзросце ад 15 да 20 гадоў на працягу ўсіх пасляваенных гадоў у гарадское насельніцтва для працягу вучобы і працаўладкавання ў параўнанні з адтокам мужчын з сельскай мясцовасці. Відавочныя вынікі сітуацыі ў сельскай мясцовасці – каэфіцыент шлюбнасці ў 1,2 разы ніжэй, чым ў гарадах; палавая дыспрапорцыя вядзе да ўзмацнення сацыяльнага напружання, п'янства, злачыннасці. Такім чынам, *чацвёртай* асаблівасцю сацыяльна-культурнай сітуацыі з'яўляецца дэфіцыт сельскага насельніцтва пры яўнай яго палавой дыспрапорцыі. Гэты факт выклікае неабходнасць стварэння і развіцця сацыяльна арыентаваных клубаў, клубаў-супольнасцей рэкрэацыйнага характару.

Паказчык адукаванасці насельніцтва – адна з чатырох складаючых, якія выкарыстоўваюцца ААН для разліку індэксу чалавечага развіцця. Дадзеныя перапісу насельніцтва дазваляюць фактычна лічыць Беларусь краінай усеагульнай адукаванасці насельніцтва. Па дадзеных перапісу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1999 г., 85% насельніцтва рэспублікі ва ўзросце 15 гадоў і старэй мелі закончаную вышэйшую, сярэднюю і базавую адукацыю. Доля асоб, якія маюць вышэйшую адукацыю, за апошнія 10 год павялічылася з 11% да 14%, а сярэднюю спецыяльную – з 17% да 22%.

За мінулыя 10 гадоў значна павысіўся ўзровень адукацыі сельскага насельніцтва. Калі ў 1989 г. сярод сельскіх жыхароў ва ўзросце 15 гадоў і больш частка асоб, якія мелі закончаную вышэйшую, сярэднюю і базавую адукацыю складала 56%, то па дадзеных перапісу 1999 г. – 68%. Сярод жыхароў горада гэты паказчык павялічыўся з 89% да 93%[112]. Павелічэнню ўзроўню адукацыі сельскага насельніцтва спрыяла побач з іншымі фактарамі рэзкае скарачэнне аб'ёмаў міграцыі моладзі з сяла ў горад і прыток у вёску эмігрантаў з іншых рэспублік былога Савецкага Саюза. Такім чынам, высокі ўзровень адукаванасці грамадства з'яўляецца *пятай* асаблівасцю сацыяльна-культурнай сітуацыі ў Беларусі. Такім чынам, дзейнасць устаноў культуры ў дадзеных умовах павінна набываць асабліва высокую якасць. Для падтрымкі, захавання і развіцця атрыманых ведаў для наведвальнікаў клубаў і клубных фарміраванняў побач з рэкрэацыйнай дзейнасцю неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы: дыскусійныя клубы, клубы як сістэма гасцёўняў, правядзенне асветных, вучэбных праграм, інтэлектуальных гульняў і г.д.

У якасці *шостай* асаблівасці вызначым дастаткова вялікую колькасць культур, якія адрозніваюцца ад традыцыйнай, беларускай. На тэрыторыі Беларусі па дадзеных перапісу насельніцтва 1999 г. пражывалі прадстаўнікі больш 130 нацыянальнасцей і народнасцей. Беларусы – 81,2%, рускія –11,4%, палякі – 3,9%, украінцы – 2,4%, яўрэі – 0,3%[113]. Межы Беларусі з Польшай, Расіяй, Украінай, Літвой і Латвіяй, і тое, што ў пэўныя перыяды гісторыі Беларусь уваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, дапамагло з'яўленню пэўных дыялектных асаблівасцей, якія праніклі ў мову насельніцтва.

На мове сваёй нацыянальнасці ў сям'і размаўляе 45% насельніцтва. На беларускай мове ў хатніх умовах звычайна размаўляе 37% насельніцтва рэспублікі, сярод беларусаў 41%. На рускай мове размаўляе 63% ад агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі, сярод беларусаў – 59%[114].

У сувязі са з'яўленнем надзвычай складанай для Беларусі праблемы бежанцаў і перасяленцаў, выклíканай чарнобыльскай экалагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**[112] Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Итоги переписи населения Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 14.**

**[113] Население республики Беларусь. Статистический сборник. Итоги переписи населения Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 168.**

**[114] Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Итоги переписи населения Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 11.**

катастрофай і вяртаннем беларусаў з краін бліжэйшага замежжа, неабходна прагназаваць іх доўгачасовае ўздзеянне на сацыяльна-культурную сітуацыю рэгіёнаў, дзе яны пасяліліся. Міграцыя насельніцтва аказвае станоўчы ўплыў на фарміраванне колькаснага і якаснага складу насельніцтва рэгіёна. Міграцыйны прырост насельніцтва рэспублікі склаў 21,099 тыс. чалавек. Сярод мігрантаў кожны пяты раней пражываў у Латвіі, кожны шосты – у Казахстане, кожны сёмы – у Літве, кожны дзявяты – ва Узбекістане, кожны чатырнаццаты – у Таджыкістане і Кыргызстане. Па нацыянальным складзе 83% складаюць беларусы[115].

Змяніліся і напрамкі міграцыйных патокаў. Калі ў 1988 г. міграцыйны прырост насельніцтва адбываўся за лік прыбываючых у гарадскія населеныя пункты, то да 1997 г. больш паловы іх асядае ў сельскай мясцовасці. Міграцыя аказвае станоўчы ўплыў і на полаўзроставую структуру насельніцтва, бо найбольшая мабільнасць уласціва людзям працаздольнага ўзросту і іх сем’ям. Насельніцтва краіны здольна ў значнай меры папаўняцца за кошт міграцыі, аднак адсутнасць свабоднага жылля нават у сельскай мясцовасці і зніжэнне аб’ёмаў жыллёвага будаўніцтва стрымліваюць прыток насельніцтва з іншых тэрыторый. Неабходны дадатковыя інвестыцыі для будавання жылля і аб’ектаў сацыяльна-культурнага быту ў мэтах забеспячэння і замацавання сямей, якія прыбываюць у нашу рэспубліку. Гэтыя асаблівасці патрабуюць стварэння і развіцця цэнтраў нацыянальных культур і клубных устаноў з наборам розных відаў рэкрэацыйных паслуг (асабліва для перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны).

Такім чынам, *сёмай* асаблівасцю сацыяльна-культурнай сітуацыі з’яўляецца міграцыйны паток з краін бліжэйшага замежжа і з аднаго рэгіёна ў другі, які ўсё павялічваецца. У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС іх уплыў на сацыяльна-культурную сітуацыю ў рэгіёнах, праблема захавання культурных стэрэатыпаў мігрантаў і інтэграцыі іх у культуру Беларусі і асобных рэгіёнаў.

З агульнай колькасці сельскіх населеных пунктаў (23459) да катэгорыі малых, лічба жыхароў якіх не перавышае 50 чалавек, адносіцца 4 372. У іх пражывае 5,2 % сельскага насельніцтва[116].

Аўтатранспартную сувязь па дарогах з цвёрдым пакрыццём маюць у асноўным былыя цэнтральныя сядзібы калгасаў і саўгасаў. Гэта дазваляе сфармуляваць вельмі важную *восьмую* асаблівасць сацыякультурнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, такую, як сукупнасць маланаселеных, аддаленых ад гарадоў і адзін ад аднаго населеных пунктаў сельскага тыпу.

---

**[115] Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 89.**

**[116] Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Итоги переписи населения Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 65–66.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1999 г. у краіне налічвалася 23459 сельскіх населеных пунктаў, у якіх пражывала 3 мільёны 84 тысячы чалавек – 31% ад агульнай колькасці насельніцтва[117].

Калі гаварыць аб агульнай колькасці ўстаноў культуры клубнага тыпу, то ў 1999 г. іх налічвалася 4246, з іх 32% патрабавалі капітальнага рамонту. Бібліятэк жа на гэты тэрмін было 4778 адзінак. Больш паловы сельскіх жыхароў не маюць ні стацыянарных, ні перадзвіжных устаноў культуры. Кожны 10 жыхар сяла для наведвання ўстановы культуры павінен пераадолець адлегласць больш за 5 км. Такім чынам, *дзевятай* асаблівасцю з'яўляецца нераўнамернасць даступнасці ўстаноў культуры для насельніцтва. У сувязі з напісаным вышэй падкрэслім неабходнасць аднаўлення і жыццядзейнасці пры клубных установах перадзвіжных бібліятэк і аўтаклубаў, якія не маюць магчымасці працаваць сёння пераважна па матэрыяльнай прычыне.

Новай, *дзесятай* асаблівасцю з'яўляецца беспрацоўе ў рэспубліцы. 2,1% насельніцтва працаздольнага ўзросту не маюць работы[118]. Дастаткова высокая сацыякультурная актыўнасць беспрацоўных. Яны з'яўляюцца самай актыўнай катэгорыяй наведвальнікаў Дамоў рамёстваў, клубаў народных майстроў, таму што разглядаюць магчымасць атрымання навыкаў рамеснай працы, народных промыслаў як форму занятасці, а значыць – аснову свайго матэрыяльнага дабрабыту.

Такім чынам, вынікі аналізу сацыяльна-культурнай сітуацыі ў рэспубліцы паказалі, что ў перспектыве фарміравання і развіцця сеткі устаноў культуры ў XXI стагоддзі неабходна ўлічваць спецыфічныя асаблівасці сацыякультурнай сітуацыі, бо яны з'яўляюцца галоўным фактарам стварэння новых формаў і відаў сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва, якія будуць больш поўна і якасна задавальняць запыты і запатрабаванні жыхароў нашай краіны.

На новым этапе развіцця грамадства ўзнікае неабходнасць стварэння такіх арганізацый і клубных фарміраванняў для правядзення вольнага часу грамадзян, дзе індывідуальныя мэты і запыты чалавека з'яўляліся б асноўнай каштоўнасцю, дзе чалавек разглядаецца не як аб'ект культурнага абслугоўвання, культурнага ўздзеяння і культурна-масавай работы, а як актыўны суб'ект, раўнапраўны партнёр ў вялікім доме пад назвай «установа культуры». Выяўленне, задавальненне і развіццё культурных запатрабаванняў і інтарэсаў, якое адбываецца ў сістэме ўстаноў і арганізацый, якія служаць менавіта гэтай мэце, непарыўна звязаны з задавальненнем і развіццём культурных запатрабаванняў і інтарэсаў грамадства ў цэлым. Гэтыя працэсы аказваюць вызначальны ўплыў на сучаснае развіццё сеткі клубных устаноў культуры.

[117] **Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Итоги переписи населения Республики Беларусь. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2000. – С. 65–66.**

[118] Статистический портрет Беларуси. Статистический сборник. – Минск: Информстат, Минстат Республики Беларусь, 2001. – С. 31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыканцы XX стагоддзя вялікую ролю пачынаюць адыгрываць клубныя ўстановы і фарміраванні прыватнага накірунку, якія ўсё больш пачынаюць прадстаўляць альтэрнатыву клубным установам сістэмы Міністэрства культуры. У правядзенні вольнага часу насельніцтва адбыўся пераход сацыяльна-культурнай сферы Беларусі да рыначных адносін, які абумовіў пераўтварэнні ў яе сістэме, з'яўленне новых крыніц фінансавання, пераарыентацыю кадравага патэнцыялу, у першую чаргу прывёў да перабудовы арганізацыйна-кіруючых механізмаў. Побач з дзяржаўнай сеткай клубных устаноў з'яўляюцца камерцыйныя клубныя ўтварэнні. Гэтаму спрыяе расслаенне грамадства на больш забяспечаную катэгорыю насельніцтва (звычайна гэта бізнесмэны-прадпрымальнікі). У развіцці камерцыйна-уласных клубных устаноў і аб'яднанняў канца XX стагоддзя, таксама як і ў XIX стагоддзі, назіраецца дзве тэндэнцыі развіцця. Першая ўяўляе сабой збор удзельнікаў па сацыяльнаму і грамадскаму статусу (бізнесмены, палітыкі, жанчыны), што асабліва ярка праяўляецца ў дзейнасці элітных клубаў. Іх асноўны кантынгент – бізнесмены, прадпрымальнікі, так званыя «новыя беларусы», палітыкі, дыпламаты, фінансісты.

У сваіх арганізацыйных прынцыпах элітныя клубы канца XX стагоддзя маюць тую ж аснову, што і элітныя клубы XIX стагоддзя, характарызуюцца каставасцю, выбранасцю сваіх членаў, маюць Статут. Іх дзейнасць носіць закрыты характар. Клубнае жыццё складаецца з наведвання рэстарана або бара, гульні ў казіно, більярд, рулетку. Кожны клуб мае спецыяльна прыстасаваныя пакоі для гульні.

Другая ўключае ў сябе аб'яднанні, якія маюць на мэце правядзенне вольнага часу па інтарэсах (спартыўна-аздараўленчыя, музычныя, танцавальныя, камп'ютэрныя і інш.). Аднак нягледзячы на багатыя клубныя традыцыі, прыватныя клубы хутчэй фарміруюцца ў выглядзе трансфармацыі і адаптацыі заходняй мадэлі (адносна існуючай былой савецкай сеткі устаноў культуры). У працэсе такога пераўтварэння адбываюцця змены матывацыі функцый, зместу і прынцыпаў арганізацыі ды кіравання ў сферы вольнага часу, з'яўляюцца новыя віды дзейнасці.

У працэсе вывучэння вопыту дзейнасці прыватных клубаў, мы б хацелі засяродзіць увагу на арганізацыі і вопыце дзейнасці музычна-танцавальных клубаў, бо яны з'яўляюцца самымі папулярнымі сярод моладзі на сённяшні дзень. Дадзеная культурная адзінка мае адкрыты характар, статут, у якім вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці. Аднак яны не характарызуюцца зафіксаванай колькасцю ўдзельнікаў і па свайму прынцыпу арганізацыі нагадваюць клубы-кафэ, якія былі распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай, часткова захаваліся ў Гродна і Вільні ў XIX стагоддзі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі яны мелі назву «аўстэрыі» і «кандытэрыі», а прынцыпы іх арганізацыі і дзейнасці нагадвалі рымскую харчэўню, англійскую таверну або рускія чайныя.

У канцы XX стагоддзя губляюць сваю актуальнасць звыклыя дыскатэкі, якія на сённяшні дзень ужо не могуць цалкам задаволіць запыты моладзі. Галоўнай праблемай становіцца багацце і разнастайнасць музычных напрамкаў. Таму ў мэтах задавальнення гэтых запытаў і стварэння ўмоў для зносін па інтарэсах маладых людзей сталі папулярнымі джаз-, рок-, тэхна-, рэгі- і іншыя клубы. На сённяшні дзень разнастайнасць такіх музычных клубаў, у якіх выконваецца музыка ад рамансаў да рока, могуць прапанаваць амаль усе буйныя гарады Беларусі.

Працэс індывідуалізацыі клубнай дзейнасці на аснове інтарэсаў наведвальнікаў клубаў таксама пачынае пранікаць ў клубную практыку. Галоўнай мэтай работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстановы культуры і клубнага фарміравання становіцца задавальненне запатрабаванняў чалавека ў сацыяльна-культурных і творчых зносінах, цікавым і карысным правядзенні часу, дапамога ў раскрыцці і развіцці яго творчых талентаў і здольнасцей, стварэнне ўмоў для творчай самарэалізацыі і самавыяўлення асобы.

На сённяшні дзень адной з самых папулярных формаў арганізацыі вольнага часу насельніцтва Беларусі з'яўляюцца аматарскія аб'яднанні. Творчая дзейнасць удзельнікаў дзяржаўных аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах якасна паляпшае ўсю работу ўстаноў культуры, робіць яе больш разнастайнай, змястоўнай і насычанай. Пераканаўчы ў гэтых адносінах вопыт работы клубаў мастацкага напрамку (аб'яднанні самадзейных мастакоў, паэтаў, кампазітараў, клубы творчай інтэлігенцыі, выяўленчага мастацтва, фотамастацтва, фларыстыкі, цікавых сустрэч, якія працуюць у форме салонаў).

Даволі шырокае распаўсюджванне атрымалі гісторыка-краязнаўчыя аб'яднанні: клубы аматараў гісторыі, рыцарства і культуры Сярэднявечча, клубы па вывучэнні гісторыі роднага краю. Напрыклад, у студзені 1997 г. у г. Наваполацку, энтузіястамі, якія цікавіліся гісторыяй Беларусі, быў створаны ваярска-гістарычны рыцарскі клуб «Жалезны воўк». Пазней яго месцам знаходжання стаў старажытны Полацк. Згодна са статутам, гэты клуб з'яўляецца дабравольным аб'яднаннем, здольным згуртаваць аматараў нацыянальна-гістарычнага напрамку, і існуе пры цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка. Асноўнай задачай дзейнасці клуба з'яўляецца выхаванне беларускай моладзі на аснове рыцарскіх ідэалаў і агульначалавечых каштоўнасцей, развіццё творчасці моладзі ва ўсіх яе праявах. Гэта – развіццё і падтрымка талентаў (асабліва ў галіне сярэдневяковых рамёстваў), выставачная дзейнасць, адраджэнне нацыянальнай культуры, гісторыя духу і ідэалаў беларускага рыцарства сярод моладзі, культурна-асветніцкая дзейнасць (тэатралізаваныя спектаклі-відовішчы, фільмы, шоў), стварэнне агульнабеларускай рыцарскай федэрацыі. Вышэйшым органам кіравання «Жалезнага воўка» з'яўляецца Рада, якая ўстанаўлівае парадак прыёму ў сябры клубу, вызначае асноўныя напрамкі дзейнасці, заслухоўвае справаздачы сяброў клуба аб іх рабоце, прызначае старшыню клуба. Сябрам клуба можа стаць кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які цікавіцца гісторыяй нацыянальнай культуры, прайшоў кандыдацкі тэрмін і выканаў усе кандыдацкія патрабаванні, вызначаныя Радай.

Сярод шматлікіх аматарскіх аб'яднанняў асабліва значнае месца займаюць клубы традыцыйнай культуры. Новым лічыцца дзейнасць клубаў беларускай нацыянальнай кухні.

Стварэнне ж новых тыпаў устаноў культуры магчыма толькі пры актуалізацыі культуратворчай актыўнасці насельніцтва, стварэнні і прадстаўленні ўмоў для дзейнасці розных суб'ектаў культуры (ініцыятыўных самадзейных груп і асобных людзей).

Галоўнае ў пераарыентацыі дзейнасці сучасных дзяржаўных ўстаноў культуры, на наш погляд, заключаецца ў зменах мэтавай ўстаноўкі з «работы на сябе» (статыстычная справаздачнасць) на «работу для чалавека, асобы (задавальненне існуючых запытаў і фарміраванне духоўных патрэбнасцяў і каштоўнасцяў) у цеснай непарыўнасці з існуючымі культурнымі і духоўнымі традыцыямі грамадства. Таму асноўнай фігурай у клубнай ўстанове новага тыпу становіцца чалавек, асоба, яе інтарэсы і культурна-духоўныя запатрабаванні.

Адной з важных складаючых частак беларускай культуры і мастацтва застаюцца традыцыйныя віды мастацкай творчасці. Менавіта традыцыйная народная культура стала асновай, жыватворнай крыніцай для пошуку новых напрамкаў дзейнасці ўстаноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры ў сучасных умовах. Вывучэнне і ўключэнне традыцыйных формаў народнай творчасці ў сучасны культурны працэс у якасці раўназначных складаемых магчыма па той прычыне, што Беларусь, як ні адна іншая сучасная еўрапейская краіна, здолела зберагчы да пачатку ХХІ стагоддзя ў «жывым выглядзе» аўтэнтычнасць усіх асноўных відаў сваёй карэннай культуры, хоць і была доўгі час «выключана» са сферы афіцыйнага функцыянавання, трапляючы то пад моцнае ўздзеянне паланізацыі, то русіфікацыі. Цікава, што пад гэта ўздзеянне падпадаў толькі «вышэйшы» зрэз культуры, яе афіцыйная частка – школа, друк, некаторыя прафесійныя віды і жанры мастацтва, сферы дзяржаўнага кіравання – усё тое, з чаго фактычна была «выключана» асноўная частка народа, якая як раз і захоўвала генетычнае ядро самабытнай народнай культуры, якое ў пачатку 1990-х гг. стала асновай для нацыянальна-культурнага адраджэння.

Гэта ядро – этнаграфічная культура – зафіксавала сябе ў звычаях і абрадах, якія, у сваю чаргу, вызначылі змест і форму грамадскага жыцця, заснаваныя на прынцыпах агульначалавечых крытэрыяў адбору. Ад пакалення да пакалення пераходзілі толькі прагрэсіўныя традыцыі, тыя, што садзейнічалі развіццю творчага духа народа і стымулявалі імкненне да прыгожага, вечнага і разумнага.

Да ліку неабходных звычаяў, якія былі выпрацаваны нашым народам на працягу тысячагоддзяў, і якія патрабуюць свайго захавання, развіцця і перадачы наступным пакаленням, належаць тыя, што ўзвышаюць чалавека, вучаць яго справядлівасці, сумленнасці, добразычлівасці, адданасці абавязку, умацоўваюць пачуццё калектывізму, бескарыслівасць, таварыства, абуджаюць любоў да роднай мовы, зямлі, працоўнага народа – сапраўднага творцы матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Жыццядзейнасць традыцыйнай культуры, абуджэнне цікавасці да гэтай сферы народнай творчасці ў многім залежаць ад ўзроўню прапагандысцкай і папулярызатарскай работы. Як паказалі экспедыцыйныя даследаванні, бяседы з удзельнікамі фальклорных калектываў, народнымі майстрамі, носьбітамі традыцый і работнікамі культуры, вельмі важным стымулам з’яўляецца прапаганда іх дзейнасці не толькі на мясцовым, але і на больш шырэйшым узроўні. Гэта павышае значнасць носьбітаў традыцый ў вачах іх бліжэйшага акружэння, спрыяе жаданню іншых людзей таксама займацца вывучэннем і папулярызацыяй народнай творчасці, у іх фарміруецца неабходнасць ў больш глыбокім вывучэнні гісторыі і культурных традыцый свайго народа, ствараецца магчымасць асабістай творчай самарэалізацыі, а таксама спрыяе выхаванню патрыятычных пачуццяў маладога пакалення.

Практыка стварэння устаноў культуры новага тыпу і прафілізацыі клубаў сведчыць, што іх дзейнасць у новым выглядзе ў значнай ступені дазваляе больш уважліва адносіцца да інтарэсаў і запатрабаванняў насельніцтва, а таксама больш рацыянальна выкарыстоўваць матэрыяльную базу і творчыя ды інфармацыйныя рэсурсы. Падтрымка і развіццё станоўчых традыцый, звычаяў і абрадаў заўсёды патрабавалі, і зараз патрабуюць больш мэтанакіраванай работы.

Таму асноўная мэта дзейнасці ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў на сучасным этапе – падтрымліваць жыццё традыцый,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надаваць новыя імпульсы для існавання ўсіх відаў аўтэнтычнага фальклору. У гэтай сувязі паўстае найважнейшая задача: неабходна стварыць нарматыўную базу для сферы культуры – з аднаго боку, аказваць усялякую падтрымку носьбітам і знаўцам народных традыцый – з другога боку; займацца навуковым даследаваннем і адраджэннем забытых або рэдкіх тэхналогій народных рамёстваў.

Праблемам удасканалення дзейнасці па фарміраванні новых мадэляў і тыпаў у Рэспубліцы Беларусь былі прысвечаны рэспубліканскія семінары для кіраўнікоў і спецыяльных органаў кіравання культурай на абласным і раённым узроўнях (чэрвень 1999 г. і снежань 2000 г.). Сёння дзяржаўная сістэма ўстаноў клубнага тыпу налічвае больш за 40 розных мадэляў і варыянтаў арганізацыйна-структурнага рэфармавання клуба. Сярод найбольш паспяховых формаў работы, якія знайшлі ў нашай краіне шырокае прымяненне ў рабоце клубных устаноў культуры, можна назваць: **рэгіянальныя мэтавыя праграмы**; **клубы па інтарэсах**; **школы народнай творчасці**; **прафілізацыя або спецыялізацыя** (Цэнтры традыцыйнай культуры, Дамы рамёстваў, фальклору, народнай медыцыны, фларыстыкі і г.д.); **стварэнне шматпрофільных**, прынцыпова новых **устаноў культуры** (сацыяльна-культурных, культурна-педагагічных комплексаў, Цэнтраў вольнага часу, эстэтычнага выхавання і г.д.).

Найлепшай формай задавальнення сацыяльна-культурных запатрабаванняў сельскага насельніцтва з'яўляецца арганізацыя і функцыянаванне шматпрофільных сацыяльна-культурных цэнтраў. Яны як бы ўрастаюць у прыроднае асяроддзе і сістэму камунікацый, і, адначасова, вырастаюць «знутры», з інфраструктуры культурнага асяроддзя, якая сфарміравалася гісторыка-культурнымі традыцыямі, спектрам эстэтычных запатрабаванняў дадзенага субрэгіёна. Сацыяльна-культурны цэнтр можа ўключаць клуб, бібліятэку, школу мастацтваў, Дом фальклора, народны музей, спартыўна-аздараўленчы комплекс і г.д., у залежнасці ад субрэгіянальных магчымасцей.

У сельскай мясцовасці Рэспублікі Беларусь часта ўстановы культуры (клубы, школы мастацтваў, музычныя школы) дубліруюць пазакласную работу агульнаадукацыйных школ, яе змест і формы работы з бацькамі і насельніцтвам у цэлым.

Рэгіянальная культурная палітыка ў кожным з шасці субрэгіёнаў нашай краіны дзейнічала ў гэтым напрамку згодна з існуючымі сітуацыяй, вопытам, рэгіянальнымі і мясцовымі традыцыямі. У выніку з пачатку 1990-х гг. у Беларусі пачала фарміравацца сетка новых тыпаў устаноў культуры раённага і сельскага ўзроўню, дзейнасць якіх была накіравана на захаванне і засваенне розных відаў народнай мастацкай культуры. Значную ролю ў гэтым працэсе адыграла мясцовая ініцыятыва і наяўнасць на месцах энтузіястаў і высокакваліфікаваных спецыялістаў. З гэтага перыяду пачалі працаваць такія новыя тыпы ўстаноў культуры, як Дамы рамёстваў, фальклору, народнай творчасці і г.д.

Размеркаванне новых тыпаў устаноў культуры ў галіне традыцыйнай культуры па абласцях – не аднароднае. Так, у Віцебскай вобласці самае шырокае распаўсюджванне атрымалі Дамы рамёстваў; на Гомельшчыне – дамы (Цэнтры) фальклору, народнай творчасці; у Брэсцкай вобласці – школы народнай творчасці (у выглядзе клубных фарміраванняў); у Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях такія ўстановы новага тыпу не атрымалі вялікага пашырэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У аснову іх работы пакладзены «Статут» і «Палажэнні», зацверджаныя на ўзроўні раённых выканаўчых камітэтаў. І нездарма першы Дом рамёстваў быў заснаваны на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. знаходзілася пад уладай Польшчы, і дзе, па словах навуковага супрацоўніка Віцебскага НМЦ НТ і КАР Л.У. Вакар, народныя майстры з Браслаўскага, Глыбоцкага, Шаркаўшчынскага і Верхнядзвінскага раёнаў памяталі аб рабоце рамесных школ-майстэрняў.

Адным з найбольш папулярных новых тыпаў устаноў культуры, якія сумяшчаюць у сваёй дзейнасці дабравольны прынцып стварэння і адраджэнне народных культурных традыцый з'яўляюцца Дамы (Цэнтры) рамёстваў. Па статыстычных дадзеных сёння на Беларусі працуе 50 адзінак, прычым 17 з іх – у сельскай мясцовасці.

У Дамах рамёстваў як спецыялізаваных установах склалася трохузроўневая сістэма адукацыі:

- гурткі на базе Дома рамёстваў ў раённых цэнтрах;
- філіялы Дома рамёстваў, дзе гурткі працуюць на базе клубаў, бібліятэк і сярэдніх школ;
- школы майстара на даму.

Першапачатковa Дамы рамёстваў ствараліся і працавалі як грамадскія клубы майстроў, але пры наяўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы, паступовa, рашэннямі раённых выканаўчых камітэтаў пераўтвараліся ў новы тып устаноў культуры – Дамы рамёстваў. Сёння яны маюць сваю базу (прыстасаванае памяшканне, класы, майстэрні для правядзення гуртковай работы, работы выставак, продажу гатовых вырабаў народных майстроў і іх вучняў).

На сённяшні дзень найбольшае распаўсюджванне Дамы рамёстваў атрымалі ў Віцебскай вобласці. Першы з іх быў заснаваны ў снежні 1989 года згодна з пастановай Глыбоцкага райвыканкама аб адкрыцці новай мадэлі ўстановы клубнага тыпу Дома рамёстваў (ДР) у г. Глыбокае на базе клуба народных майстроў «Крыніца», які, у сваю чаргу, быў створаны па прапанове метадыстаў Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы ў 1986 годзе разам з загадчыкам раённага аддзела культуры М.К. Паляк і дырэктарам метадычнага цэнтра А.В. Юргель. Вялікія арганізатарскія здольнасці праявіў мастак А.С. Дубіна, які і ўзначаліў клуб народных майстроў. Адначасова ён займаўся і адраджэннем кавальскай справы. Сёння А. Дубіна – адзін з нешматлікіх майстроў кавальскай справы ў рэспубліцы. У 2001 годзе ў в. Дудуткі Мінскай вобласці прайшоў рэспубліканскі конкурс па кавальскаму рамяству, у якім майстар і яго сын сталі пераможцамі.

Дзейнасць раённых Дамоў рамёстваў на Віцебшчыне характарызуецца комплексным падыходам. Яны займаюцца не толькі навучаннем народным рамёствам, але і навукова-даследчай і навукова-метадычнай работай.

Дзейнасць многіх беларускіх Дамоў рамёстваў заснавана на навуковай базе: рабоце супрацоўнікаў мясцовых краязнаўчых музеяў і метадычных распрацоўках. Некаторыя з іх сабралі спецыялізаваныя бібліятэкі па розных відах народных рамёстваў і этнаграфічнай культуры беларусаў. Браслаўскі, Гарадоцкі і і Лепельскі ДР валодаюць таксама метадычнымі фондамі, якія складаюцца з этнаграфічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялаў, ствараюць ўласныя відэаархівы, назапашваюць фотаматэрыялы аб майстрах, праведзеных выставах, фіксуюць творы народнага мастацтва.

Хуткі рост колькасці новых тыпаў устаноў культуры ў сферы традыцыйнай культуры выклікаў патрэбу ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў. На сённяшні дзень гэта пытанне вельмі актуальнае, асабліва для раённых і сельскіх устаноў культуры, дзе востра адчуваецца недахоп высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Калі Дамы рамёстваў атрымалі найбольшае распаўсюджванне на Віцебшчыне, то Дамы ды Цэнтры фальклору і народнай творчасці пераважаюць на Гомельшчыне (17 адзінак). Асноўнымі напрамкамі іх дзейнасці на сённяшні дзень з'яўляюцца: работа з калектывамі мастацкай самадзейнасці, правядзенне і ўдзел у традыцыйных святах, работа з аўтэнтычнымі фальклорнымі групамі, арганізацыя пераймання народных мясцовых традыцый дзецьмі, дзейнасць па зборы і вывучэнні фальклорнай творчасці.

Перапрафіліраванне сельскіх клубаў у Дамы фальклору адначасова вырашыла дзве практычныя задачы: захаванне гэтых устаноў у дзеючай сетцы і дзейнасць ў рэчышчы дзяржаўнай палітыкі нацыянальна-культурнага адраджэння. Пры гэтым для перапрафіліравання ў напрамку работы з фальклорным калектывам мелася логіка і ўсе прадпасылкі: тэрыторыя Гомельшчыны – гэта рэгіён, дзе да сённяшняга часу многія віды і формы традыцыйнага мастацтва захаваліся ў «жывой» шматвобразнасці ў сувязі з Чарнобыльскай аварыяй 1986 г. і міграцыяй насельніцтва ў іншыя рэгіёны.

Аднак у працэсе перапрафіліравання сельскіх клубаў ў Дамы фальклору і па сённяшні дзень не ўсе праблемы вырашаны канчаткова. Напрыклад, Дамы фальклору ўдзяляюць мала ўвагі выдавецтву метадычных распрацовак і рэпертуарных зборнікаў песенных і музычных твораў народнага мастацтва. Не ўсе маюць аўдыё- і відэазапісы правядзення мясцовых святаў, фанатэкі з запісамі ўзораў вуснай народнай творчасці, мясцовых носьбітаў песеннай і музычнай традыцыі.

Цікавай і перспектыўнай формай работы з'яўляецца стварэнне школ народнай творчасці (традыцыйнай культуры). Як асноўны метад работы яны выкарыстоўваюць прыёмы і сродкі народнай педагогікі. Галоўным яе крытэрыям адпавядаюць гуманістычныя і дэмакратычныя ідэалы народа. Можна сказаць, што ў шырокім сэнсе слова народная педагогіка – гэта ўсё з народнай творчасці, што непасрэдна служыць справе выхавання маладога пакалення. Да сродкаў народнай педагогікі адносяцца ўсе віды народнай творчасці. Галоўным патрабаваннем да арганізацыі выхаваўчай работы на аснове народных педагагічных традыцый з'ўляецца выкарыстанне такіх прынцыпаў, як сувязь з жыццём, з навакольным светам, гуманізм, пераемнасць выхавання, працоўнае выхаванне, заахвочванне творчай і працоўнай ініцыятывы дзяцей і падлеткаў.

У народнай педагогіцы вялікую ролю адыгрывае практычная дзейнасць. Бацькі імкнуліся прывучыць дзяцей да вырабу простых бытавых рэчаў, да ўдзелу ў традыцыйных святах і абрадах, зыходзячы з іх узроставых асаблівасцей, творчых здольнасцей і магчымасцей. Тутназіралася непарыўная сувязь паміж слоўнымі тлумачэннямі і самім працэсам, дзеяннем, іншымі словамі, вынік навучання матэрыялізаваўся ў прадмеце дзейнасці.

Школы народнай творчасці сталі стварацца ў пачатку 1990-х гадоў, прычым, у асноўным, у Брэсцкай вобласці – рэгіёне Заходняга Палесся, дзе лепш за ўсё захаваліся песенныя і танцавальныя традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце «школа народнай творчасці» ў сучаснай культуралагічнай і педагагічнай практыцы – шматбаковае як па змесце, так і па тыпах. Канцэпцыі падобных школ ўваходзяць у рэгіянальныя праграмы адраджэння, захавання і развіцця культурнай спадчыны. Школы традыцыйнай культуры тыпалагічна розныя: адны ствараюцца на базе сельскіх Дамоў культуры, Дамоў рамёстваў, фальклору; другія – на базе канкрэтна вызначаных дзіцячых фальклорных калектываў; трэція – на базе школ мастацтваў (напрыклад, в. Стаі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці).

Усе тыпы школ народнай творчасці аб'яднаны тым, што яны імкнуцца забяспечыць магчымасць доступу дзяцей да традыцыйнай культуры ва ўсёй яе шматвобразнасці (вусная народная творчасць, музычнае, танцавальнае, песеннае, інструментальнае, гульнявое мастацтва, абрадавы фальклор і рамёствы), зыходзячы з мясцовай (лакальнай) традыцыі. Таму і формы работы ў такіх школах могуць быць самымі рознымі ў залежнасці ад мясцовых умоў, магчымасцей, колькасці ўдзельнікаў і наяўнасці кіраўнікоў.

З прыведзеных намі прыкладаў добра відаць, што новыя тыпы устаноў культуры – гэта не столькі новыя будынкі, а, галоўным чынам, – гэта новая форма культурнага жыцця, арыентаваная на інтарэсы і патрэбы насельніцтва.

## *Кантрольныя пытанні да раздзелаў 1 і 2*

1. *Якія прычыны мелі ўплыў на фарміраванне клубнай традыцыі на Беларусі?*
2. *З якой мэтай ствараліся «высакародныя сходы» і хто былі іх асноўныя наведвальнікі?*
3. *Як праяўляліся асноўныя прынцыпы арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці клубаў XIX ст.?*
4. *Як змянялася назва спецыялізацый у вышэйшых навучальных установах культуры ў залежнасці ад сацыяльнага заказу розных часоў?*
5. *Якімі асноўнымі прычынамі было абумоўлена стварэнне і станаўленне сеткі клубных устаноў?*
6. *Пералічыце асноўныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай сферы Беларусі ў савецкі перыяд.*
7. *Якія асаблівасці сацыяльна-культурнай сітуацыі назіраюцца ў канцы XX ст. у Рэспубліцы Беларусь?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л 3

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК НАВУКОВАЯ ГАЛІНА

## § 1. Структура метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці

Сучасная тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці сінтэзуе шэраг тэорый, генетычна звязаных з ёй па прыкметам адзінства гісторыі і прадметнага поля навукі, метадалагічнай агульнасці дзейнасці самых розных навуковых, грамадскіх і культурна-асветных арганізацый. Яна інтэнсіўна ўзбагачаецца культуралагічнымі, сацыялагічнымі, культурна-антрапалагічнымі, псіхолага-педагагічнымі ідэямі, азначаючымі новую якасць выхаваўчай работы ў соцыуме, інавацыйны характар тэхналогій арганізацыі культурнай сферы вольнага часу.

Сацыяльна-культурная дзейнасць (СКД) сённяшняга часу – гэта самастойная, цэласная, складанаарганізаваная галіна педагагічнай навукі. Яна з'яўляецца заканамерным працягам педагагічных пошукаў, якія праводзіліся ў нашай краіне ў рамках тэорый пазашкольнага выхавання, палітыка-асветніцкай работы, клубазнаўства, культурна-асветніцкай і культурна-дасугавай дзейнасці. Сучасная сацыяльна-культурная дзейнасць адрозніваецца ад працэсаў, што адбываюцца ў рамках мінулай культурна-асветніцкай работы па цэламу шэрагу параметраў.

Найбольш важнейшым з'яўляецца змяненне базавых уяўленняў аб самой дзейнасці, якая характарызуецца новымі ўяўленнямі аб культуры, яе ролі ў фарміраванні асобы. Сацыяльна-культурная дзейнасць практычна забяспечвае пераўтварэнне культурных каштоўнасцей у рэгулятар сацыяльнага ўзаемадзеяння, а таксама тэхналагічна вызначае сацыялізацыю выхаваўчых працэсаў.

Такім чынам, ***сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта грамадска значны спосаб актыўных адносін да рэчаіснасці, які выяўляецца ў спажыванні, вытворчасці і распаўсюджванні каштоўнасцей культуры.***

**Тэарэтычныя разважанні наконт сутнасці сацыякультурнай дзейнасці заўсёды падымаюць важкасць навуковых даследаванняў па ўсім спектры вывучаемых праблем, таму што вымушаюць навукоўцаў дакладней самавызначацца ў філасофска-метадалагічных каардынатах.**

**Пошук адказу на метадалагічныя пытанні ў гісторыі культурна-асветніцкай навукі заўсёды быў вельмі складаным, звязаным з неабходнасцю даказаць ідэалагічную лаяльнасць даследаванняў, захоўваючы пры гэтым дастатковую аргументацыю для доказу існавання адменнай, самастойнай навукі. Хаця гэтыя моманты цесна ўзаемазвязаны, і ў гісторыі культурна-асветніцкай тэорыі практычна не падзяляюцца, магчыма вызначыць асобныя, дастаткова ўмоўныя**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**акцэнты, якія ў некаторым сэнсе дапамогуць нам вызначыць *спецыфіку сучаснай*** *метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці.*

**Азначаны доказ ідэалагічнай лаяльнасці быў найбольш актуальным у першыя гады (да 1960-х гадоў, так званага перыяду «адлігі») фарміравання нашай тэорыі, калі патрабавалася адмежаванне ад буржуазных «рэакцыйных» поглядаў. У наступныя гады, калі прызнанне класавага характару агульнаграмадскіх тэорый стала адной з вядучых метадалагічных аксіём, увага даследчыкаў у большай ступені была скіравана на выяўленне клубнай тэорыі. Даследаванні гэтага перыяду як бы балансуюць паміж прызнаннем агульнай метадалогіі клубазнаўчай тэорыі, з аднаго боку, а з другога – педагагічнай тэорыі ў выглядзе камуністычнага выхавання.**

**Падобнага роду падвоеныя ўяўленні вучоных аб метадалагічных асновах клубазнаўства абумоўлены некалькімі прычынамі. Па-першае, нявызначанасцю ўласна педагагічнага статуса клубнай тэорыі, якая да гэтага перыяду больш разглядалася як ідэалагічная канструкцыя, што забяспечвае ідэалагічную і палітыка-выхаваўчую дзейнасць партыі. Па-другое, тэарэтычнымі перашкодамі, з якімі сутыкаліся даследчыкі пры спробах зрабіць філасофскае, а не ідэалагічнае абгрунтаванне выхаваўчага працэсу ў сферы вольнага часу. Дарэчы, яшчэ і сёння гэтая супярэчнасць, на жаль, поўнасцю не пераадолена.**

Дзеля выяўлення спецыфікі метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці спачатку звернемся да канстатацыі У.Я. Трыодзіна аб тым, што адным з важкіх недахопаў тэорыі выхаваўчай дзейнасці клуба з'яўляецца тое, што «не разрабатывается специальная методология, характеризующая реализацию общефилософских принципов при исследовании специфических предметов». Гэта, па меркаванні даследчыка, вядзе «к недостаточно корректному применению законов и категорий материалистической диалектики в воспитательной деятельности клубов».[119]

Трэба канстатаваць, што і сёння ў тэорыі СКД гэтая праблема не асэнсавана ў поўнай ступені, болей таго, доўгі час тэарэтыкі культурна-асветніцкай педагогікі ўвогуле не падзялялі метадалогію на агульную і спецыяльную. Аналіз паказвае, што ў спецыяльнай клубазнаўчай літаратуры метадалагічная праблематыка прадстаўлена вельмі сціпла. Пры гэтым большая ўвага ўдзяляецца вывучэнню фактараў, што дзейнічаюць унутры галіновай тэорыі і ўтвараюць спецыфіку яе метадалогіі. Гэтую пазіцыю адлюстроўваюць амаль усе падручнікі па клубазнаўчай тэорыі, шматлікія дысертацыі, манаграфіі і навуковыя артыкулы.

---

**[119] Триодин В.Е. Теоретические основы воспитательной деятельности советского клуба: дисс. доктора пед. наук. – Л., 1985. – С. 12–13.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш разгорнуты аналіз метадалогіі клубазнаўчай тэорыі ў пачатку 1970-х гадоў далі А.В. Сасыхаў і Ю.А. Стральцоў. Яны ўпершыню звярнулі ўвагу на метадалогію культурна-асветніцкай навукі. У падручніку «Основы клубоведения» аўтары вызначылі раздзел, у якім паслядоўна раскрылі тэарэтычныя асновы метадалогіі клубазнаўства. У адпаведнасці з тагачаснымі ўяўленнямі А.В. Сасыхаў і Ю.А. Стральцоў далі наступную агульнанавуковую характарыстыку метадалогіі: «Методология как теория познания науки включает в себя совокупность элементов, необходимых для плодотворного исследования определенной области действительности. Это – учение о предмете науки, месте ее в ряду других наук, принципах, категориях; о методах, приемах и правилах исследовательской процедуры»»[120].

Тым не менш, азначэнне спецыяльнай метадалогіі клубазнаўчай тэорыі ў тэксце адсутнічае. Хаця ўвесь сэнсавы кантэкст гэтай, на наш погляд, адной з найбольш аўтарытэтных крыніц па тэорыі клубнай педагогікі сведчыць аб імкненні аўтараў вызначыць метадалагічную спецыфіку клубазнаўства. Больш таго, аўтары свядома робяць акцэнт на тым, што «входя в состав педагогической науки и базируясь на общих закономерностях теории коммунистического воспитания, клубоведение в то же время обладает самостоятельностью и качественной спецификой. Оно исследует такую область социальной практики, которая не изучается во всей совокупности ни одной другой научной дисциплиной»[121]. Другімі словамі, аўтары абгрунтавалі тэзіс аб тым, што спецыфіка метадалогіі вызначаецца спецыфікай прадмета культурна-асветніцкай навукі.

У тэарэтычным раздзеле падручніка «Клубоведение» (1980 г.), падрыхтаваным А.Г. Саламонікам пад рэдакцыяй С.М. Іконнікавай і В.І. Чэпелева, удакладняецца істотнае адрозненне ў агульнай і спецыяльнай метадалогіі клубазнаўчай навукі.

Так, гаворачы аб агульнай метадалогіі, А.Г. Саламонік адзначае, што «методологией науки является система методов научного исследования и принципов подхода к изучению предмета данной науки. Всеобщей методологией научного познания, которая служит для разработки частной методологии любой науки, является материалистическая диалектика – составная часть марксистско-ленинской философии»[122].

«Опираясь, как и другие науки, на всеобщую методологию, клубоведение как наука формирует свою, частную методологию, которая позволяет правильно вести исследования в данной области, исходя из

---

**[120] Сасыхов А.В., Стрельцов Ю.А. Основы клубоведения: теория и методика клубной работы. – Улан-Удэ, 1969. – С. 6.**
**[121] Там жа. – С. 10.**
**[122] Клубоведение: Учебное пособие для институтов культуры, искусств и факультетов культ.-просвет. работы пед. ин-тов / Под ред. С.Н. Иконниковой и В.И. Чепелева. – М.: Просвещение, 1980. – С. 11.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

специфики своего объекта и своего предмета. Так, при организации исследований клубоведение исходит из идеи единства педагогического руководства и самодеятельности масс, из необходимости учета направленного формирования интересов трудящихся».[123]

Такая пастаноўка пытання ў большай ступені можа характарызаваць практычныя аспекты клубазнаўства, што для тэарэтычнага ўзроўню з'яўляецца малапрадуктыўным. Хаця, на наш погляд, каштоўнай атрымалася сама спроба вызначыць змест агульнай і спецыяльнай метадалогіі культурна-асветніцкай навукі.

Распрацоўваючы канцэпцыю педагагічнай дзейнасці клубаў, У.Я. Трыодзін адзначыў: «Теория воспитательной деятельности клуба, исследующая клуб как социально-педагогическую систему, представляет собой конкретную отрасль педагогики, специальной методологией которой является теория коммунистического воспитания»[124].

Гэты тэзіс, надзвычай характэрны для тэорыі культурна-асветніцкай дзейнасці сярэдзіны 1980-х гадоў, канкрэтызуе адносіны даследчыкаў клубнай работы да агульнай педагогікі. Педагогіка прымаецца як тэорыя больш высокага ўзроўню, адносна якога галіновы раздзел педагогікі – гэта тэорыя сярэдняга ўзроўню. Таму ў клубнай тэорыі як тэорыі сярэдняга ўзроўню адсутнічае ўласная, характэрная толькі для яе метадалогія. Адказваючы на пытанне: «У чым праяўляецца спецыяльны характар гэтай метадалогіі адносна тэорыі культурна-асветніцкай дзейнасці?», У.Я. Трыодзін, як і іншыя даследчыкі, указвае на спецыфіку прадметнай вобласці культурна-асветніцкай навукі.

Зыходзячы з аналізу разгледжаных падыходаў да фармулявання спецыфікі тагачаснай метадалогіі культурна-асветніцкай дзейнасці, М.М. Ярашэнка выдзяляе два моманты:

1) «*Структура методологии клубной педагогики не отличается от структуры методологии какой-либо иной обществоведческой дисциплины;*

2) *линии их различий выявляются на уровне содержательной характеристики предмета и условий его функционирования.*»[125]

Гаворачы аб разнастайнасці сучаснай метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці, можна пагадзіцца з меркаваннем аб тым, што:

- «на уровне общенаучной методологии она соотносится с философскими концепциями, объясняющими возможность интерпретации социальных фактов и социальной реальности на основе общенаучных принципов познания (принцип объективности, историзма, достоверности и др.) и с использованием категорий общественных наук;
- на интегративном уровне методологии базовой выступает педагогическая наука, которая задает особую систему принципов, понятий и исследовательских методов, призванных интерпретировать лишь некоторую часть социальных фактов и социальной реальности, связанных с процессами воспитания и образования;
- на уровне специальной методологии происходит предельная конкретизация принципов и исследовательских методов, формируется особая система частнонаучных категорий, призванных объяснить ту часть социальных фактов и социокультурной

---

**[123] Там жа. – С. 11.**

**[124] Триодин В.Е. Теоретические основы воспитательной деятельности советского клуба: дисс. доктора пед. наук. – Л., 1985. – С. 15–16.**

**[125] Ярошенко Н.Н. Социально-культурная деятельность: Парадигмы, методология, теория. – М., 2000. – С. 88.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

реальности, которая составляет предметную область социально-культурной деятельности – воспитание и развитие личности в специфических ситуациях досуга и творчества».[126]

Падобнага роду шматузроўневая структура метадалогіі СКД дазваляе вызначыць яе спецыфіку, прынцыповае адрозненне, напрыклад, ад метадалогіі культуралогіі і метадалогіі сацыялогіі, якія вельмі цесна сутыкаюцца ў тэарэтычным плане з прадметнай вобласцю культурна-асветніцкай навукі. Ніводная з іх не можа быць разгледжана ў якасці інтэгратыўнай навукі, прадметная вобласць якой звязана з мэтанакіраваным асэнсаваннем працэса выхавання асобы, хаця і не выключае яго вывучэнне.

Найважнейшым з’яўляецца тое, што метадалагічнае ўзбагачэнне, междысцыплінарны сінтэз могуць ажыццяўляцца толькі на розных вышэйпазначаных узроўнях – агульнанавуковым, інтэгратыўным, спецыяльна-навуковым. Такім чынам, пераход метадалагічных ідэй на узроўні болей агульных альбо болей канкрэтных (па вертыкалі) магчымы толькі пасля таго, як гэтыя ідэі будуць «зняты» канкрэтнай навукай на ўзроўні ўзаемадзеяння з адпаведнымі навуковымі дысцыплінамі (па гарызанталі).

Таму ў структуры спецыяльнай метадалогіі СКД не могуць самастойна функцыянаваць метадалагічныя ідэі сацыялогіі, культуралогіі, псіхалогіі і другіх грамадскіх навук. Толькі будучы знятымі на ўзроўні агульнай педагогікі, яны пераходзяць на спецыяльны, уласнанавуковы ўзровень метадалогіі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[126] **Там жа. – С. 94–95.**

Схематычна гэта можа быць прадстаўлена ў выглядзе «лейкі»:




Ідэі, сфарміраваныя ў шматлікіх метадалагічных кантэкстах, – агульнафіласофскім, інтэгратыўным, – транслiруюцца на ўзровень спецыяльнай метадалогіі толькі па канале ўзаемадзеяння галіновай тэорыі з той тэорыяй больш высокага ўзроўню, з якой дадзеная галіновая тэорыя звязана генетычна і сутнасна. Пры даследаванні асобных тэарэтычных праблем адбываецца пашырэнне як зыходных метадалагічных аспектаў, спецыфічных для тэарэтычнага зместу канкрэтнага даследавання, так і крыніц тых навуковых ведаў, якія педагогіка асімілюе.

Такім чынам, будучы спецыяльнай навукай, якая мае сваё спецыфічнае поле навуковай дзейнасці (культурную сферу вольнага часу і развіццё самадзейнай мастацкай творчасці), сацыяльна-культурная дзейнасць грунтуецца на ідэях многіх агульнаграмадскіх дысцыплін, выкарыстоўвае іх ідэі, транслюючы іх праз прызму агульнай педагогікі. У сваю чаргу, спецыяльная метадалогія СКД узбагачае як агульнапедагагічную метадалогію ідэямі сацыяльна-культурнага зместу, так і робіць больш грунтоўнымі, змястоўнымі і «ачалавечанымі» метадалогіі грамадскіх навук.

## § 2. Характарыстыка асноўных прынцыпаў і функцый сацыякультурнай дзейнасці

Тэарэтычныя асновы СКД складаюцца з *прынцыпаў і функцый*, а асноўны змест методыкі СКД ствараюць *формы і метады* гэтай дзейнасці. Спачатку звернемся да прынцыпаў СКД.

У падручніках па тэорыі культурна-асветніцкай работы і клубазнаўстве вучоныя аднагалосна зыходзяць з разумення **прынцыпу** (лат. principium – аснова, першапачатак) як высновы, зыходнага палажэння нейкай тэорыі, вучэння; кіруючай ідэі, асноўнага правіла паводзін. Бясспрэчным з’яўляецца і падзел прынцыпаў на *агульныя і спецыфічныя*.

Што тычыцца *агульных*, тут вызначаюць наступныя прынцыпы:

- навуковасці;
- дыферэнцыраванага падыходу;
- комплекснасці;
- сувязі з жыццём;
- калектывізму;
- паслядоўнасці і сістэматычнасці і інш.

Разглядаючы сістэму зацверджаных у тэорыі і практыцы **прынцыпаў сацыякультурнай дзейнасці** і фармулюючы паняцце аб іх,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мы зыходзім з іх разумення, як аб ***найбольш агульных палажэннях, якія адлюстроўваюць аб'ектыўна існуючыя, унутрана ўмацаваныя, неабходныя і ўстойлівыя сувязі ды адносіны працэса арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей ва ўмовах вольнага часу і вызначаюць яго накіраванасць, характар, змест і формы.***

Сучаснае разуменне сацыяльна-культурнай дзейнасці, яе грамадска і педагагічна накіраванай сістэмы арганізацыі ва ўмовах вольнага часу абумоўлівае неабходнасць разам з разглядам агульнаграмадскіх і агульнапедагагічных прынцыпаў і вылучэння *спецыфічных,* што адлюстроўваюць унутраныя заканамернасці і асабістыя ўмовы арганізацыі вольнага часу людзей, якія пераўтвараюцца ў важкі фактар іх сацыялізацыі і выхавання.

Комплексны сістэмна-структурны аналіз сукупнага вопыту культурна-асветніцкай дзейнасці, які ўключае адзінства вывучэння гісторыі і тэорыі пытання, а таксама праграмаванае педагагічнае назіранне практыкі арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, дапоўненае шэрагам канстатуючых методык, дазваляюць у дапаўненне да сфарміраваных ў тэорыі і практыцы агульнаграмадскім і агульнапедагагічным прынцыпаў вылучыць і абгрунтаваць наступныя *спецыфічныя прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці:*

а) ***прынцып дабравольнасці і агульнадаступнасці ўдзелу ў сацыяльна-культурнай дзейнасці,*** які рэалізуецца шляхам шырокага ахопу насельніцтва культурна-асветніцкім уздзеяннем; забеспячэння свабоды выбару форм дзейнасці ў культурна-дасугавых установах; шырокага доступу ўсіх слаёў насельніцтва да ўдзелу ў розных формах арганізацыі вольнага часу; рацыянальнага размяшчэння сацыякультурных устаноў на тэрыторыі асобных рэгёнаў і ў цэлым па краіне і г.д.;

б***) прынцып грамадскай ініцыятывы і самадзейнасці,*** які рэалізуецца шляхам забеспячэння дэмакратычнага характару сацыяльна-культурнай дзейнасці; развіцця ў ёй грамадскіх вытокаў; апоры на актыў; стымулявання ініцыятывы мас у планаванні, вылучэнні зместу і выбары форм культурна-дасугавай дзейнасці, яе грамадскай ацэнкі і г.д.;

в) ***прынцып дапаўнення і ўзбагачэння духоўных каштоўнасцей, засвоеных асобай у розных сферах жыццядзейнасці,*** які рэалізуецца шляхам забеспячэння суаднясення зместу і форм работы інтарэсам і ўзроўню духоўнага развіцця асобы; уліку ўздзеяння на чалавека ўсіх выхавальніцкіх фактараў; сістэматызацыі і паглыблення грамадска-палітычнай і эстэтычнай інфармацыі, якую атрымлівае асоба з разнастайных крыніц, і г.д.;

г) ***прынцып адзінства інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння на свядомасць, пачуцці і паводзіны,*** які рэалізуецца шляхам забеспячэння разумення, даходлівасці, прывабнасці мерапрыемстваў; спалучэння інфармацыі з яркімі эмацыянальнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відовішчамі; комплекснага выкарыстання разнастайных сродкаў уздзеяння на розум і пачуцці чалавека; выкарыстання сродкаў літаратуры і мастацтва для мастацка-вобразнага адлюстравання рэальнага жыцця ў непасрэдных формах СКД і г.д.;

д) ***прынцып эстэтызацыі вольнага часу,*** які рэалізуецца шляхам уключэння мастацкіх пачаткаў у сацыякультурную дзейнасць; арганізацыі адпачынку па законам прыгажосці; фарміравання ў людзей уменняў і навыкаў мастацка-эстэтычнай дзейнасці і далучэння іх да працэсу стварэння мастацкіх каштоўнасцей; зацвярджэння ў масах патрэбы жыцця па законах прыгажосці; давядзення інтэр'ераў сацыякультурных устаноў да адпавядання іх сучасным эстэтычным патрабаванням; забеспячэння неабходнага маральна-эстэтычнага клімату, высокай культуры зносін і г.д.

Такім чынам, калі мы звяртаемся да разгляду катэгорыі «прынцыпы сацыякультурнай дзейнасці», мы павінны зыходзіць з наступных тэарэтычных палажэнняў, сфармуляваных Р.М. Біржанюком: [127]

- выступаючы важнымі фактарамі навуковай арганізацыі СКД, яе прынцыпы выцякаюць з прыроды, характару і сутнасці працэсу арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей ва ўмовах вольнага часу;
- з'яўляючыся адным з напрамкаў і галін педагогікі ды ў яе рамках неад'емлемым звяном грамадскага жыцця, сацыякультурная дзейнасць рэалізуе агульнаграмадскія і агульнапедагагічныя прынцыпы;
- уяўляючы кампанент адзінай, грамадска і педагагічна накіраванай сістэмы духоўнага жыцця, сацыяльна-культурная дзейнасць разам з тым захоўвае своеасаблівасць арганізацыі гэтай дзейнасці, уласцівай для сферы вольнага часу, і будуецца з улікам яе спецыфічных прынцыпаў;
- будучы тэарэтычнай катэгорыяй, спецыфічныя прынцыпы СКД могуць быць вызначаны толькі на аснове ўсебаковага аналізу сукупнага вопыту арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей, накіраванай на іх уключэнне ў працэс бесперапыннага асветніцтва, аматарскую творчасць і рацыянальнае правядзенне вольнага часу.

Узровень распрацоўкі праблемы **функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці** абумоўлены асэнсаваннем працэсаў сацыяльнай рэчаіснасці. Аднак да сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя гэтая праблема не была тэмай спецыяльнага даследавання.

Стымуляванню навуковага інтарэсу да праблемы функцый СКД садзейнічала станаўленне сістэмнага падыходу да з'яў рэчаіснасці, распрацоўка асноўных прынцыпаў і ўвядзенне іх у катэгарыяльны апарат тэорыі СКД. Да гэтага нават сам тэрмін «функцыя» ў культурна-асветніцкай дзейнасці не ўжываўся. Разам з тым, пры вырашэнні істотных

---

[127] **Гл. Бирженюк Г.М. Единство общих и специфических принципов деятельности культурно-просветительных учреждений: автореф. дисс. канд. пед. наук. – Л., 1980. – С. 7.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанняў як у тэорыі, так і ў практыцы сацыякультурнай дзейнасці спецыялісты непазбежна «ўпіраліся» ў зыходную кропку – у неабходнасць вызначэння, як гэта зараз стала зразумела, сацыяльных функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Самое слова «функцыя» (лат. functio) азначае дзейнасць. Не трэба павялічваць значэнне тэрміна «функцыі» для тэорыі і практыкі сацыякультурнай дзейнасці, тым больш, што і да гэтай пары ён падчас выступае простым сінонімам у абазначэнні ролі клубных устаноў, іх задач, накірункаў дзейнасці і г.д. Разам з тым, строгае навуковае асэнсаванне паняцця функцый СКД павінна дазволіць болей дыферэнцыравана выявіць патэнцыяльныя магчымасці выхаваўчай дзейнасці ўстаноў культуры з тым, каб свядома і мэтанакіравана іх аптымізаваць.

Адразу адзначым, што **пад грамадскімі функцыямі сацыяльна-культурнай дзейнасці мы разумеем катэгорыі, якія выяўляюць сутнасць, магчымасці і прызначэнні да азначаных канструктыўных дзеянняў па развіцці асобы ў вольны час.**

Як дазволіў выявіць праведзены кантэнт-аналіз спецыяльнай літаратуры, асноўнае і агульнае для ўсіх канцэпцый аб функцыях сацыякультурнай дзейнасці, зыходнае для іх канкрэтнага фармулявання палажэнне заключаецца ў традыцыйнай ідэі вывядзення іх з самой сутнасці СКД, з сутнасці клуба як сацыякультурнай установы.

Разам з тым, само паняцце сутнасці клуба рознымі аўтарамі тлумачыцца па-рознаму, таму ўзнікаюць пэўныя рознагалоссі ў азначэнні яго функцый. Выкрэсліванне найбольш значных, дамінуючых бакоў, рыс, якасцей клуба не раз прыводзіла да рознага роду аднабаковых поглядаў на яго функцыі, да сцвярджэння ў якасці асноўнай і адзінай функцыі *выхаваўчай, асветніцкай і арганізацыі зносін*. Але кожны раз спробы монафункцыянальнага падыходу непазбежна «ўпіраліся» ў шматграннасць дзейнасці клуба, і, нарэшце, стала відавочным, што сапраўдная каштоўнасць сацыякультурнай дзейнасці складаецца з яе *поліфункцыянальнага характару*.

Аднак зацвярджэнне тэзіса аб поліфункцыянальнасці зусім не вырашыла пытання, у чым менавіта яно заключаецца. Гэта нарадзіла шэраг у чымсьці падобных, у чымсьці рознабаковых канцэпцый, з рознай мерай канкрэтнасці тлумачачых змест і структуру функцый СКД.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: які ж той сістэмаўтвараючы прынцып, што складае ўнутраную аснову адзінства шматграннай дзейнасці клуба? Вывучэнне гісторыі развіцця сацыякультурнай дзейнасці, выяўленне ў ёй розных сацыяльных функцый, адпавядаючых тым альбо іншым эпохам, прывяло да ідэі пабудовы цэласнай сістэмы сацыяльных функцый клуба. Дадзеная сістэма ўзнаўляе поліфункцыянальны характар дзейнасці клуба і гістарычную дынаміку яго сацыяльных адносін. Сістэму ўтварае два класа функцый. Першы – гэта функцыі, якія першапачаткова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўласцівыя клубу, генетычна першапачатковыя, якія дзеля зручнасці атрымалі назву класа *радавых*. Другі – гэта функцыі, якія адлюстроўваюць якасныя своеасаблівасці выхаваўчай дзейнасці клуба ў кожнай канкрэтна-гістарычнай сітуацыі, якая атрымала назву гістарычна *вытворных*.

Паколькі, як вядома, функцыя ёсць вынік жыццядзейнасці вызначанай сістэмы, то і спецыфічныя для клуба функцыі таксама абумоўлены як асаблівасцямі самога клуба, так і спецыфічнымі патрэбамі, якія прад'яўляюцца яму з боку грамадства і з боку асобы. Вынік гэтай складанай дыялектычнай узаемасувязі нараджае вызначаную функцыянальную накіраванасць клуба:

патрэбы → функцыі → патрэбы
грамадства ← клуб ← асобы

Іншымі словамі, функцыя заўсёды ўзнікае як бы «на шляху» ад патрэб грамадства, якія праламляюцца праз спецыфіку ажыццяўлення выхаваўчай дзейнасці клуба, да патрэбаў асобы, і наадварот.

У спосабах ажыццяўлення гэтай ўзаемасувязі нейкія канстанты сутнасці клуба застаюцца нязменнымі, гэта і ёсць функцыі класа *радавых*. На ўсеагульным узроўні наяўнасць комплекса толькі радавых функцый цалкам дастаткова для ўтварэння азначэння паняцця *клуб*, паколькі гэты комплекс у самым абагульненым выглядзе характарызуе якасці адносін клуба з сацыяльнай рэчаіснасцю. Вылучэнню канкрэтна радавых функцый садзейнічае гісторыка-педагагічны аналіз сацыяльна-культурнай дзейнасці. У выніку высветлілася, што паняцце клуба ў найбольшай меры адлюстроўваюць і ўтвараюць тры яго асноўныя функцыі: 1) **асветніцкая;** 2) **стымулявання творчага патэнцыялу асобы;** 3) **арганізацыі адпачынку і забаў.**

Менавіта яны аб'ектыўна ўзніклі як генетычна першапачатковыя, наяўнасць якіх была выяўлена амаль на кожным канкрэтна-гістарычным этапе, з'явіліся цэментуючым грунтам сістэмы функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Разам з тым на канкрэтным гістарычным этапе, у асобнай канкрэтнай сітуацыі кожная з гэтых радавых функцый нараджае значную колькасць *вытворных функцый*, якія ўзнікаюць, знікаюць, трансфармуюцца і г.д. у працэсе развіцця, ускладнення структуры клуба як сацыяльнага інстытута. У канкрэтна-гістарычным плане менавіта вытворныя функцыі, адлюстроўваючы якасныя асабліваці задавальнення патрэб асобы і грамадства, часта выступаюць на першы план, займаюць дамінуючае палажэнне, утвараючы на тым ці іншым этапе развіцця клуба ўяўленне аб ім як аб сацыяльна-культурным інстытуце.

Усё гэта, зразумела, толькі схема, не больш, але яна з'яўляецца метадалагічным інструментам пазнання заканамернасцей функцыянавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

амаль кожнай сацыякультурнай установы. Кожны гістарычны этап клубнага будаўніцтва характарызуецца сваім своеасаблівым наборам функцый, дапаўняючы дадзеную схему канкрэтна-гістарычным зместам. Захоўваючы ўнутраную цэласнасць – на ўзроўні радавых функцый, прапанаваная сістэма мае магчымасць змяняць у даволі шырокіх памерах суаднесенасць сваіх кампанентаў на ўзроўні вытворных функцый.

Разгледзім некаторыя з іх, пачынаючы з **асветніцкай функцыі**, якая з’яўляецца адной з асноўных пры ажыццяўленні выхаваўчай дзейнасці сярод насельніцтва. У кожны канкрэтна-гістарычны перыяд свайго развіцця радавая асветніцкая функцыя вылучае шэраг вытворных функцый, розных па інтэнсіўнасці праяў, якія маюць тэндэнцыю да бясконцай варыятыўнасці, мадыфікацыі і трансфармацыі ды забяспечваюць дынаміку развіцця ўсяго класа функцый асветы.

Можна з ўпэўненасцю сцвярджаць, што працэс станаўлення асветніцкай функцыі ў адзінай сістэме сацыяльных функцый СКД, у параўнанні з іншымі функцыямі, вызначаецца найбольшай планамернасцю. Гэта менавіта тлумачыцца тым, што яе ўзнікненне і далейшае развіццё абумоўлена тымі спецыфічнымі патрэбамі, якія ў гісторыі грамадства не маглі быць выкананы ніякімі іншымі сацыяльнымі інстытутамі. А таксама і тым, што ў сваім станаўленні працэс асветы найбольш паддаецца кіраванню і ў плане пастаноўкі канкрэтных задач, і ў плане арганізацыйным, і ў плане забеспячэння гэтай функцыі ўсім неабходным для яе ажыццяўлення – формамі, метадамі, спосабамі ўздзеяння і т.д.

Інакш кажучы, шлях, які павінна праходзіць функцыя, каб стаць такой (ад грамадскіх патрэб праз спецыфіку сацыякультурнай дзейнасці да патрэбаў кожнага асобнага чалавека, і наадварот – у функцыі асветы) у сілу існуючых аб’ектыўных абставін, быў значна карацейшы, чым у іншых радавых функцый сістэмы.

У перыяд, калі сацыякультурная дзейнасць існавала як пазашкольнае выхаванне, асветніцкая функцыя ўзнікла як цэласны комплекс, вядучая роля ў якім адводзілася ажыццяўленню вытворнай функцыі – *ліквідаванню непісьменнасці*. Паралельна была вызначана і наступная вытворная функцыя – *павышэнне культурнага ўзроўню*. Дарэчы, калі першая вытворная функцыя перастала існаваць ужо ў 1930-я гг., то другая застаецца актуальнай і па сённяшні дзень.

Асветніцкая дзейнасць клуба ў перыяд палітыка-асветніцкай работы не магла ажыццяўляцца без выканання функцыі *палітычнай асветы*, зместам якой было фарміраванне палітычнай культуры і ажыццяўленне палітычнай адукацыі насельніцтва. Мэтанакіраванасць радавой асветніцкай функцыі абумоўлена таксама ўзнікненнем і станаўленнем вытворнай функцыі *вытворчай прапаганды*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыяй развіцця сацыякультурнай дзейнасці зафіксаваны моманты, калі ажыццяўленне асветы ва ўстановах культуры суправаджалася ўзнікненнем новых функцый. Так, у перыяд НЭПа ўзнікла неабходнасць у ажыццяўленні *атэістычнай прапаганды.* Зараз мы ведаем і аб дапушчаных памылках у яе рэалізацыі. На мяжы 20–30-х гадоў XX ст. у сілу ўзнікнення шэрагу ўмоў сфарміравалася функцыя *самаадукацыі.* У сельскіх клубных установах функцыя вытворчай прапаганды мадыфікавалася ў функцыю *аграпрапаганды, прапаганды сельскагаспадарчых ведаў,* якая, у сваю чаргу, у сярэдзіне 30-х гадоў аддзялілася ў новую, часовую, але вельмі неабходную ў тую пару *даведачную функцыю* і г.д.

Вядома, не ўсе вытворныя функцыі класа асветніцкіх развіваліся раўнамерна, што было звязана з пераўтварэннем патрэбаў людзей і са ступенню гатоўнасці ўстаноў культуры да іх задавальнення. Часам гэтыя ўстановы ў сілу розных прычын не паспявалі перабудоўваць сваю дзейнасць і накіроўваць яе на ажыццяўленне тых функцый, якія б у найбольшай ступені адпавядалі сацыяльнаму заказу часу. Так, у апошнія часы сацыякультурныя ўстановы павінны актывізаваць такія вытворныя функцыі асветніцтва, як *развіццё нацыянальнай свядомасці, экалагічная адукацыя і выхаванне, інфармацыйна-тэхналагічная асвета і інш.* Толькі такім чынам, перабудоўваючы якасны змест асноўных кампанентаў, асветніцкая функцыя зможа выканаць сваю місію на сучасным этапе.

Наступная радавая функцыя – **стымуляванне творчага патэнцыялу асобы** – у гісторыі СКД мае надзвычай разнастайны характар, што абумоўлена дынамікай сацыяльнага развіцця, арганізацыйнымі працэсамі ў саміх сацыякультурных установах. Фарміраванне і развіццё гэтай функцыі ўяўляе сабой ажыццяўленне цэлага комплексу якасных аспектаў сацыякультурнай дзейнасці, а менавіта – вытворных функцый *далучэння людзей да мастацтва, развіцця мастацкай самадзейнасці, павышэння сацыяльнай актыўнасці, развіцця творчай ініцыятывы, фарміравання грамадскай думкі і інш.*

Увогуле, пад *творчасцю мы разумеем сацыяльна значымую дзейнасць, якая адзначаецца прыкметамі навізны, арыгінальнасці і непаўторнасці.* Творчасць прынята падзяляць ***па ўзроўні*** *– на кампелятарскую і наватарскую, таксама* ***па значнасці*** *– на сацыяльна значную і індывідуальна значную.*

Сацыяльна-культурнай дзейнасці больш адпавядае ўзровень кампелятыўнасці, калі ствараецца нешта новае і арыгінальнае на аснове абагульнення ўжо вядомага, напрацаванага раней. Гэта і творчая дзейнасць самадзейных мастацкіх калектываў, якія будуюць свой рэпертуар у асноўным на вядомых творах прафесійнага мастацтва, і творчая дзейнасць самадзейных рацыяналізатараў і вынаходнікаў у шматлікіх аматарскіх аб’яднаннях тэхнічнай творчасці, якія выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці добра вядомыя тэхналогіі з дасягненняў навукі і тэхнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тут можа ўзнікнуць заканамернае пытанне: а што новае і сацыяльна значнае ствараюць гэтыя самадзейныя артысты і вынаходнікі, якія часцей за ўсё не маюць адпаведнай падрыхтоўкі і робяць гэта горш за прафесіяналаў? Можа іх дзейнасць увогуле не адпавядае узроўню творчасці?

Для адказу на гэтыя пытанні мы звернемся да падзялення творчасці на сацыяльна і індывідуальна значную. Вядома, што выкананне, напрыклад, вакальнага твора самадзейным артыстам у сацыяльным плане нічога асабіста новага для мастацтва і грамадства ў цэлым не прыўнясе. Але гэтую навізну, арыгінальнасць і непаўторнасць мы павінны шукаць на індывідуальным ўзроўні. Менавіта новыя, невядомыя гэтаму чалавеку дагэтуль якасці з’явіліся ў ім самім у працэсе мастацкай дзейнасці. І чым больш такіх людзей будзе задзейнічана ў працэсе самадзейнай мастацкай творчасці, тым багацейшым ў духоўным плане будзе ўсё грамадства.

У ажыццяўленні функцыі стымулявання творчага патэнцыялу асобы сацыякультурная дзейнасць выступае як моцны стымулятар чалавечай актыўнасці. Тут яе прызначэнне заключаецца, перш за ўсё, у тым, што ў арганізацыі любога віду дзейнасці (ці то мастацкая творчасць, тэхнічная, навуковая альбо сацыяльная), у сацыякультурных установах закладзены неабмежаваныя магчымасці развіваць, узбагачаць і культываваць агульначалавечыя духоўныя здольнасці, без якіх немагчыма сфарміраваць асобу новага тыпу.

Апошняя з радавых функцый – **арганізацыя адпачынку і забаў.** Своеасаблівасць гэтай радавой функцыі, як і іншых радавых, заключаецца ў спецыфічнай рэакцыі ўсяго комплексу яе вытворных функцый на стан сацыяльнай рэчаіснасці. Магчымасць выяўлення падобнай рэакцыі ў функцыі арганізацыі адпачынку і забаў, яе механізмы і заканамернасці рэалізацыі абумоўлены ўлікам некаторых істотных момантаў, у той альбо іншай ступені, якія прысутнічаюць у іншых функцыях, але маюць асобнае значэнне для рэалізацыі дадзенай.

Адзначым некалькі ўзроўняў разгляду праблемы арганізацыі адпачынку. ***Першы момант – псіхафізіялагічны,*** гэта значыць арганізацыя ў самым элементарным сэнсе неабходнага для любога арганізма адпачынку. ***Другі – псіхічны*** – папаўненне азначанага дэфіцыту ў эмоцыях, інфармацыі і г.д. ***Трэці – сацыяльна-псіхалагічны*** – гэта забеспячэнне патрэб чалавека, якія неабходны яму для зацвярджэння сябе як асобы і члена грамадства.

Адзначым, што ў розныя часы да функцыі арганізацыі адпачынку і забаў грамадства ставілася па-асобнаму. Часцей за ўсё гэтая функцыя недаацэньвалася як менеей значная і не вельмі сур’ёзная, як лічылі некаторыя «вучоныя мужы». Практыка сацыяльна-культурнай дзейнасці, аднак, сведчыць аб тым, што калі ўстановы культуры не забяспечваюць гэтую першасную функцыю, аб усіх астатніх гаварыць ужо бессэнсоўна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі мы не ствараем ўмовы для адпачынку, рэлаксацыі, атрымання станоўчых эмоцый, чалавек у далейшым проста фізічна не зможа займацца асветніцкай альбо творчай дзейнасцю. Больш таго, кожны работнік сацыякультурнай сферы павінен памятаць аб тым, што незалежна ад зместу сваёй дзейнасці, ён перш за ўсё арганізуе не прадметную дзейнасць (вучыць спяваць, танцаваць, граць на музычным інструменце і г.д.), а дасугавую, забаўляльную. Чалавек, які прыйшоў да нас у вольны час, ужо адпрацаваў свае 8 гадзін на прадпрыемстве, альбо 6 гадзін у навучальнай установе. Яму не па сілах з такой жа ступенню інтэнсіўнасці працаваць у сацыяльна-культурнай сферы. Ён, перш за ўсё, мае патрэбу ў адпачынку і забаве, у кампенсацыі недастаючых у яго асноўнай дзейнасці эмоцый, зносін, рэкрэацыі.

Наогул, сёння можна гаварыць аб новай якаснай ступені ў развіцці вытворных функцый адпачынку і забаў, яе азначанай трансфармацыі ў *геданістычную* (грэч. hedone – радасць, асалода). Заняткі ў сацыяльна-культурнай сферы павінны несці станоўчы зарад, пэўную асалоду, чалавек павінен жыць адчуваннем радасці ад будучых заняткаў у вольны час. Новы змест набываюць функцыі, станаўленне якіх адбываецца ў апошнія гады. Гэта вытворныя функцыі *фарміравання фізічнай культуры*, *развіцця экалагічнай свядомасці насельніцтва*. Своечасовая рэалізацыя іх пры найбольш дакладным устанаўленні якаснага зместу і структурнага суаднясення з іншымі функцыямі сістэмы павінна спрыяць вырашэнню канкрэтных задач сучаснай СКД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# § 3. Методыка сацыякультурнай дзейнасці

За апошнія гады ў сацыяльна-культурнай сферы адбылося шмат змяненняў змястоўнага плану, але адносна *методыкі* СКД можна засведчыць, што яе распрацоўка не паспявае за сучаснымі пераменамі. Сёння неабходна працягваць развіццё метадычных высноў сацыякультурнай дзейнасці на новым трывалым навукова-тэарэтычным узроўні, аб’яднанне дасягненняў культурна-дасугавай тэорыі і вопыту, назапашанага ў паўсядзённай практыцы сацыякультурных устаноў.

Методыка СКД – гэта галіна сацыяльна-педагагічнай навукі, якая адказвае на пытанне: ***як*** ажыццяўляць фарміраванне асобы ва ўмовах вольнага часу? Яна прызначана ўзброіць работніка сацыяльна-культурнай сферы ўменнямі і навыкамі культурна-дасугавай і сацыяльна-педагагічнай дзейнасці, даць абгрунтаванне і разгарнуць сістэму накіраванага развіцця асобы, устанавіць заканамерныя сувязі паміж зместам, метадамі і формамі СКД.

Методыка сацыякультурнай дзейнасці цесна звязана з агульнай тэорыяй выхавання: яна ўяўляе сабой розныя ўзроўні пазнання адной і той жа аб’ектыўна існуючай з’явы. Калі тэорыя выхавання раскрываецца як сістэма навуковых ведаў аб заканамернасцях фарміравання асобы, то методыка дае гэтаму працэсу адпаведны *арганізацыйны інструментарый*. Вобразна кажучы, калі перад чалавекам (калектывам) пастаўлена задача вырыць катлаван, то далей мы павінны прапанаваць яму інструмент для выканання гэтай работы – ад рыдлёўкі да экскаватара. Методыка пераўтварае выхаванне як грамадскую з’яву ў сістэму канкрэтных выхаваўчых дзеянняў і дазваляе зрабіць развіццё асобы аб’ектам мэтанакіраванага педагагічнага кіраўніцтва.

Нягледзячы на кардынальныя змены ў грамадстве, якія адбыліся за апошнія дзесяцігоддзі, адыход ад ідэй камуністычнага выхавання, унутраная структура тыповых сацыякультурных метадаў і форм развіцця асобы застаецца нязменнай і ўяўляе сабой трыадзінства ўзаемазвязаных момантаў: паведамленне вызначанай інфармацыі – яе каштоўнасная інтэрпрэтацыя – пабуджэнне людзей да практычнай дзейнасці. Уласна, розніца толькі ў тым, да якіх дзеянняў людзей заклікаюць, але заўсёды нязменнымі застаюцца элементы паведамлення, выхавання і пабуджэння.

Практычная рэалізацыя гэтых момантаў павінна грунтавацца, перш за ўсё, на *спецыфічных асаблівасцях дзейнасці ў сацыяльна-культурнай сферы*. У дадзенай тэорыі і практыцы да гэтага часу недаацэньваецца той факт, што выхаванне ва ўмовах сацыякультурнай сферы (СКС) ажыццяўляецца ў *вольны час*, і вельмі многія працэсы тут працякаюць інакш, чым у рамках вучэбных альбо вытворчых калектываў, што функцыянуюць па месцы асноўнай дзейнасці дарослага чалавека.

Адна з галоўных асаблівасцей выхаваўчага працэсу ў СКС – *добраахвотнае* ўключэнне асобы ў дзейнасць. Такая сітуацыя мае свае станоўчыя і адмоўныя якасці.

З аднаго боку, такая дабравольнасць спрыяе таму, што ўдзельнік з большай ахвотай і з меншымі хістаннямі прымае існуючыя тут правілы, нормы і патрабаванні. Прычым прымае іх без знешняга націску і санкцый. Менавіта па гэтай прычыне выхаванне ва ўмовах СКС так арганічна накладваецца на працэс самаразвіцця асобы. Факт дабравольнасці дзейнасці, заснаваны на асабістых інтарэсах і патрэбах чалавека, якія і прывялі яго ў тое альбо іншае дасугавае аб’яднанне, сам сабою здымае факт супраціўляльнасці выхаваўчаму ўздзеянню, якое ажыццяўляецца ў гэтым аб’яднанні.

З другога боку, дабравольнасць забяспечвае адметны характар утрымліваючых чалавека сувязяў. Удзельнік практычна ў любы момант можа выйсці з-пад выхаваўчага ўздзеяння, як кажуць, «прагаласаваць дзвярыма» за выбар той альбо іншай дасугавай дзейнасці. І тут асаблівую актуальнасць набываюць уменні арганізатараў зрабіць гэтую сацыяльна-культурную дзейнасць цікавай, прыемнай, якая прыносіць пэўную асалоду.

Адметны характар выхаваўчага працэсу ў СКД яшчэ і ў тым, што ён грунтуецца на *мэтанакіраванай педагагічнай арганізацыі асяроддзя*, а сам работнік сацыяльна-культурнай сферы (менеджэр, сацыяльны педагог і г.д.) – гэта, перш за ўсё, арганізатар выхавання. Гэтым ён адрозніваецца, напрыклад, ад школьнага педагога, дзе перадача ведаў адбываецца нібы пераліванне непасрэдна з адной пасудзіны ў другую, ад настаўніка да вучня. Сацыякультурны работнік пераўтварае ў выхаваўчы фактар сацыяльнае мікраасяроддзе, і дзейнічае звычайна не прама, а праз нейкую трэцюю асобу альбо групу. З гэтага пункту гледжання працэс выхавання ўяўляе сабой арганізаванае ўзаемавыхаванне.

Працэс развіцця асобы забяспечваецца шэрагам сацыяльных фактараў: складам калектыву, узаемаўплывам, штодзённай дзейнасцю чалавека і г.д. Ствараючы методыку выхаваўчага працэсу, у СКС неабходна не проста абапірацца на рэальна існуючыя адносіны, а арганізоўваць іх на падставе спецыяльнай сацыяльна-педагагічнай сітуацыі. У гэтым выпадку сацыяльна-культурная дзейнасць у пэўным сэнсе пераплятаецца з арганізатарскай, і педагагічнае ўздзеянне падмацоўваецца ўздзеяннем не проста асяроддзя, але *арганізаванага* асяроддзя.

Менавіта гэтым яшчэ раз можна падцвердзіць патрэбу практыкі ў спецыялісце новага тыпу – *менеджэры сацыяльна-культурнай сферы*, падрыхтоўка якіх вядзецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры з пачатку 1990-х гадоў. І якіх, на жаль, па гэты час сустракаюць насцярожана тыя ж практыкі, якія прызвычаіліся да простага арганізатара-тэхнолага, завадатара-займальніка і яшчэ пажадана – «каб граў».

Методыка СКД вызначаецца *спецыфікай арганізацыі зместу выкарыстанага матэрыялу*, які характарызуецца пэўнай шырынёй і аб’ёмнасцю. У адрозненне ад фармальнай сферы выхавання, напрыклад, у навучальнай установе, арганізатар выхаваўчага працэсу ў СКС не абмежаваны жорсткімі рамкамі вучэбнага працэсу, вольны ў выбары формы падачы матэрыялу, выкарыстоўвае ўзоры паводзін у выглядзе прыкладаў з рэальнага жыцця і мастацкіх вобразаў, актуальную інфармацыю з падзей сённяшняга дня. Паралельна ідзе рэгуляванне назапашанага ўласнага вопыту ўдзельніка, – гэты вопыт таксама з’яўляецца кампанентам зместу выхаваўчага працэсу. Безумоўна, што сам змест выхавання ў сацыякультурнай сферы з’яўляецца крыніцай і ўмовай фарміравання інтарэсаў і патрэб чалавека.

Даследаванні сведчаць, што працэс выхавання ў СКС, нягледзячы на азначаны нефармальны характар, пры ўмелай арганізацыі бывае больш эфектыўным, чым у фармальнай сферы – школе, сярэдняй альбо вышэйшай навучальнай установе. Перш за ўсё гэта тлумачыцца апорай на ўласны інтарэс, які прывёў чалавека ў дадзенае дасугавае аб’яднанне. Менавіта гэты інтарэс здымае эфект супраціўлення выхаваўчаму працэсу, чалавек сам жадае назапасіць свае веды, ліквідаваць дэфіцыт у зносінах, атрымаць сацыяльную ацэнку свайго захаплення ў вольны час і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, ***методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці – гэта сукупнасць правілаў, патрабаванняў і прыёмаў псіхолага-педагагічнага ўздзеяння на свядомасць, пачуцці і паводзіны людзей ва ўмовах вольнага часу;***

***– навука аб шляхах рэалізацыі задач развіцця асобы сацыяльнымі інстытутамі і ўстановамі, прызначанымі стымуляваць грамадска-культурную актыўнасць насельніцтва ў вольны час.***

Сутнасць канкрэтных *метадаў* выхавання вызначаюць грамадскія адносіны і заснаваныя на іх шматлікія міжасобныя адносіны людзей. Таму метады можна разглядаць як абумоўленую выхаваўчымі мэтамі форму выражэння грамадскіх адносін. Складзеная сукупнасць метадаў сведчыць аб тым, да якіх сродкаў грамадства лічыць неабходным прыбегчы, арганізоўваючы працэс развіцця асобы, працэс перадачы назапашанага сацыяльнага вопыту.

У дадзеным дапаможніку мы не ставілі на мэце дакладна разглядаць метады сацыяльна-культурнай дзейнасці. У сучаснай сацыякультурнай дзейнасці працягваюць выкарыстоўвацца метады, азначаныя ў падручніку «Клубазнаўства» ў 1980 годзе:

«1. *Информационные.* Их суть и назначение – эффективная передача смысловой и эмоциональной информации, содействие ее усвоению.

2. *Эвристические* – стимулирующие самостоятельное решение познавательных задач, помогающие активно искать истину.

3. *Исследовательские.* Сходны с эвристическими, но различаются сферой применения: в первом случае активно постигается объективно известное, во втором – идут поиски новых фактов и закономерностей.

4. *Ценностно-ориентационные.* Служат выработке… морали и политики ценностных ориентаций, опровержению и перестройке ошибочных.

5. *Методы организации и стимулирования творчества.*

6. *Рекреационно-гедонистические методы.*

7. *Методы управления поведением.*»[128]

Увогуле, метады выхавання – з'ява дастаткова кансерватыўная. Галоўнае, што трэба ўлічваць пры выкарыстанні таго альбо іншага комплексу метадаў – гэта ўлік вышэйпазначаных асаблівасцей працэсу выхавання ў СКС і сацыяльных патрабаванняў сённяшняга дня. Праведзены намі аналіз навукова-метадычнай літаратуры дазволіў акрэсліць некалькі груп метадаў, якія могуць быць выкарыстаны ў сучаснай СКД.

***Метады сацыяльна-культурнай дзейнасці – спосабы педагагічнага ўздзеяння на ўдзельнікаў СКД ва ўмовах вольнага часу з мэтай задавальнення і далейшага развіцця духоўных патрабаванняў і фарміравання грамадска каштоўных якасцей асобы.***

*Метады фарміравання грамадскай свядомасці:*

- інфармаванне;
- тлумачэнне;
- каменціраванне;
- абагульненне;
- пераканaнне.

*Метады ўключэння ў сацыяльна-культурную дзейнасць:*

- уключэнне ў розныя формы бесперапыннай асветы;
- прыцягненне да розных відаў аматарскай творчасці;
- кіраванне;
- прывучэнне да выканання грамадска-культурных функцый;
- самаарганізацыя;
- самаадукацыя;
- самаабслугоўванне;
- гульня.

*Метады стымулявання сацыяльна-культурнай актыўнасці:*

- станоўчы прыклад;
- спаборніцтва;
- патрабаванне;
- грамадская думка;
- заахвочванне;
- перспектыва;
- крытыка і самакрытыка.

На заканчэнне адзначым, што ўвесь вышэйапісаны змест сацыяльна-культурнай дзейнасці рэалізуецца праз формы (лат. forma – сістэма арганізацыі).

**Формы СКД – зацверджаная на практыцы сістэма прымянення сукупнасці пэўных сродкаў і метадаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўмовах вольнага часу, якая стымулюе развіццё асобы.**

---

[128] **Клубоведение: Учебное пособие для институтов культуры, искусств и факультетов культурно-просветительной работы педагогических институтов / Под ред. С.Н. Икон-никовой и В.И. Чепелева. – М.: Просвещение, 1980. – С. 93.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Будучы вытворнымі мэтавых установак, грамадска-гістарычных умоў арганізацыі і зместу сацыяльна-культурнай дзейнасці людзей у сферы вольнага часу, формы СКД захоўваюць адносную самастойнасць і здольнасць актыўна ўплываць на выхаваўчы працэс. Яны могуць тармазіць развіццё сацыяльна-культурнай актыўнасці ўдзельнікаў, калі не адлюстроўваюць яе разнастайнасць і арыентаваны толькі на культурнае абслугоўванне людзей і дастаткова эфектыўна стымуляваць яе, калі забяспечваюць пераўтварэнне аб’екта сацыяльна-культурнага ўздзеяння ў суб’ект сацыяльна-культурнай творчасці.

Патрабаванне адпаведнасці форм зместу СКД звязана з паступовасцю забеспячэння і далейшага развіцця дасугавых інтарэсаў розных груп насельніцтва – ад рэкрэатыўна-забаўляльнай дзейнасці праз уцягненне ў працэс бесперапыннага асветніцтва да самаадукацыі, самавыхавання, сацыяльна значнай ініцыятывы і самадзейнасці ў сферы вольнага часу.

Аналіз спецыяльнай літаратуры дазваляе зрабіць вывад аб тым, што ў гісторыі развіцця форм у так званай раней культурна-асветніцкай рабоце найбольш інтэнсіўным і разам з тым супярэчным стаў перыяд 1920–1930-х гг. мінулага стагоддзя. Адсутнасць пэўных аналагаў ідэйна-выхаваўчай работы з шырокімі масамі насельніцтва, памылковыя прапановы Пралеткульта, павярхоўнасць у адносінах да формаўтварэння адбіліся на працэсе станаўлення форм культасветработы. Так, у сярэдзіне 1920-х гадоў у многіх клубах сталі з’яўляцца палітрулеткі, палітдаміно, палітлатарэі, якія абсалютызавалі форму, што прыводзіла да адрыву ад зместу.

Аднак менавіта ў гэты перыяд зацвердзілі сябе формы культурна-асветніцкай работы, якія адпавядалі такім важкім накірункам, як зліквідаванне непісьменнасці і малапісьменнасці, павышэнне агульнакультурнага ўзроўню насельніцтва, культурнае шэфства горада над сялом, вытворча-тэхнічная прапаганда, санітарная асвета, павышэнне культуры быту, арганізацыя культурнага адпачынку і забаў.

Аналіз практыкі арганізацыі культасветработы ў 20–30-я гады ХХ стагоддзя дазваляе вызначыць у якасці вядучых формы:

- інфармацыйна-асветніцкай работы (лекцыі, экскурсіі, кансультацыі, вечары займальнай навукі і інш.);
- гуртковай работы (рэпетыцыі, абмеркаванні, дыскусіі, творчыя сустрэчы);
- мастацка-відовішчнай работы (спектаклі, канцэрты, тэатралізаваныя праграмы);
- арганізацыі паўсядзённага адпачынку (вячоркі, танцавальныя вечарыны, кінапаказы);
- арганізацыя святочных зносін (святы, масавыя гулянні, касцюміраваныя балі);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• арганізацыі абрадавай дзейнасці (наваселлі, «Акцябрыны», камсамольскія шлюбы і інш.).

Змяненне мэтавых установак, грамадскіх функцый, зместу культасветработы ў 1940–1960-я гг., а ў большай ступені – у 1970-я гады, прывяло да перагрупоўкі арсеналу выкарыстоўваемых форм. Частка з іх:

а) была адхілена практыкай як неадпавядаючая задачам выхавання (палітлатарэі, палітрулеткі, палітсуды);

б) знята з «узбраення» як выканаўшая сваю задачу (выразныя чытанні, расклейка газетных матэрыялаў, калектыўнае складанне карэспандэнцый);

в) прыцярпелі істотную карэкцыю (савецкія абрады, грамадска-палітычныя святы, агляды мастацкай самадзейнасці);

г) дапоўнена новым зместам і выкарыстоўваецца сёння фактычна ў іх першапачатковым варыянце (лекцыя, бяседа, тэматычны вечар, масавае свята).

Сёння досыць яскрава вызначаецца імкненне да спалучэння традыцыйных, папулярных форм з пошукам новых формаўтварэнняў. Сярод іх вызначаюць масавыя формы – традыцыйныя народныя святы, кірмашы, фестывалі народнай творчасці, шоў-праграмы, спартыўна-відовішчныя прадстаўленні, святы вуліц, вёсак, гарадоў; конкурсна-гульнявыя, трапіўшыя да нас з тэлебачання – «Што? Дзе? Калі?», «Поле цудаў», ««Хто хоча стаць мільянерам» і інш. Але пры больш уважлівым поглядзе становіцца відавочным, што ўсё гэта ўжо было, толькі ў некалькі змененым варыянце.

Гэта вымушае канстатаваць фактар адноснай навізны форм сацыяльна-культурнай дзейнасці, больш кансерватыўны характар форм СКД у адносінах яго зместу. Аналіз сведчыць, што для ўзнікнення новай якасці форм СКД неабходны шэраг аб’ектыўных і суб’ектыўных умоў: замена адной формы на другую апраўдана толькі у тых выпадках, калі яна перастае «працаваць» на аўдыторыю. Гэты працэс можа адбывацца ў выглядзе ўдасканалення выкарыстаных элементаў уздзеяння, аднаўлення мастацка-творчага матэрыялу, стымулявання актыўнасці аўдыторыі і г.д.

Аналіз спецыяльнай літаратуры, дадзеныя канкрэтна-сацыялагічнага даследавання дазваляюць зафіксаваць некалькі негатыўных тэндэнцый у разуменні сутнасці і сацыяльна-педагагічнай прыроды форм сацыякультурнай дзейнасці, у тым ліку пашырэнне межаў паняцця форм СКД, аднясенне да апошніх форм ідэйна-выхаваўчай работы грамадскіх органаў; звужэнне межаў паняцця, звядзенне яго да рамак канкрэтнага культурна-асветніцкага мерапрыемства; падмена паняцця формы СКД іншымі катэгорыямі – метадамі і сродкамі, органамі метадычнага і грамадскага кіраўніцтва сацыяльна-культурнай сферы, суб’ектам і аб’ектам выхаваўчага ўздзеяння.

Даволі шырокае распаўсюджванне сёння атрымала думка аб тым, што клубныя аб’яднанні, клубныя самадзейныя калектывы з’яўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разнавіднасцямі форм СКД. У гэтых умовах трэба падкрэсліць, што ў сістэме «суб'ект сацыякультурнай дзейнасці – аб'ект» клубныя калектывы могуць прымаць два крайнія палажэнні.

Адносна кіраўніка, напрыклад, калектыў з'яўляецца аб'ектам выхавання, а слухача, гледача – выступае ў ролі суб'екта выхаваўчага ўздзеяння. У адрозненне ад гэтага формы сацыякультурнай дзейнасці як элемент сацыяльна-педагагічнай сістэмы ўяўляюць сабой унутраную сістэму зместу выхаваўчай дзейнасці сацыяльных інстытутаў вольнага часу, якая арганізуе на практыцы ўзаемаадносіны суб'екта і аб'екта выхаваўчага ўздзеяння, што ўключае ў сябе нейкую сукупнасць спецыяльных метадаў і сродкаў. Выхаваўчыя метады і сродкі ў адносінах да форм СКД выступаюць у якасці сістэмаўтвараючых элементаў.

Аднак змест культурна-асветніцкага працэсу, выражэннем якога з'яўляюцца формы сацыяльна-культурнай дзейнасці, узбагачае і шэраг іншых элементаў сацыяльна-педагагічнай сістэмы. Галоўнымі з іх з'яўляюцца выхаваўчыя мэты, задачы, функцыі, прынцыпы, накірункі сацыякультурнай дзейнасці, якія выступаюць у якасці знешніх механізмаў, рэгулюючых працэс формаўтварэння ў СКД.

Развіццё форм культурна-асветніцкай дзейнасці (КАД) азначаецца таксама і аб'ектыўнымі сацыяльна-эканамічнымі і сацыяльна-культурнымі ўмовамі арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці: асноўнай вытворчай накіраванасцю рэгіёна; гістарычна сфарміраваным раздзяленнем працы; дэмаграфічным складам насельніцтва; геаграфічным палажэннем, кліматычнымі і прыроднымі ўмовамі; арыентацыямі і традыцыямі ў правядзенні вольнага часу, узроўнем развіцця духоўных інтарэсаў насельніцтва і г.д.

Разам з аб'ектыўнымі ўмовамі працэс формаўтварэння інтэгруе і суб'ектыўныя фактары, паколькі формы СКД рэалізуюцца ў творчай дзейнасці арганізатараў выхаваўчай работы ў сферы вольнага часу. Развіццё форм сацыяльна-культурнай дзейнасці знаходзіцца ў прамой залежнасці ад ступені распрацаванасці тэарэтычных і метадычных асноў формаўтварэння ў СКД, кампетэнцыі сацыякультурных работнікаў, сфарміраванага арсенала форм СКД, гістарычнага вопыту яго рэалізацыі і інш.

Маючыя месца недакладнасці ў разуменні сутнасці сацыяльна-педагагічнай прыроды форм КАД падчас прыводзяць да тэарэтычных памылак пры спробе вылучэння іх тыпалогіі. Недахопы існуючых варыянтаў класіфікацыі форм СКД праяўляюцца ў тым, што яны будуюцца на малой колькасці прыкметаў, якія не дазваляюць дакладна ахапіць існуючы ў практыцы іх арсенал, не ўлічваюць сувязі форм з іншымі элементамі сацыяльна-педагагічнай сістэмы СКД.

Прадстаўляецца мэтазгоднай ***класіфікацыя форм СКД***, у аснову якой пакладзены *прыкметы*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- суб’екта арганізацыі выхаваўчай работы ў сферы вольнага часу (формы работы клуба, бібліятэкі, парку культуры і адпачынку, музея і г.д.);
- шырыні сацыякультурнага ўздзеяння (асабістыя, групавыя, масавыя);
- характарыстыкі аб’екта выхаваўчага ўздзеяння, якое адлюстроўвае асноўныя сацыяльна-дэмаграфічныя дадзеныя насельніцтва (формы работы з дзецьмі і падлеткамі, маладымі людзьмі, жанчынамі, пенсіянерамі, вяскоўцамі і г.д.);
- грамадскага прызначэння і задач культурна-выхаваўчай работы (формы інфармацыйна-асветніцкай, мастацка-відовішчнай, спартыўна-аздараўляльнай дзейнасці і г.д.);
- асноўных накірункаў выхаваўчай дзейнасці (формы патрыятычнага, працоўнага, маральна-эстэтычнага, экалагічнага і іншых напрамкаў выхавання);
- паўнаты рэалізуемых у сферы вольнага часу сацыяльна-культурных функцый (монафункцыянальныя, дыяфункцыянальныя і комплексныя);
- ступені ўстойлівасці выхаваўчага ўздзеяння (эпізадычныя і стабільныя).

## *Кантрольныя пытанні да раздзела 3*

1. *У чым сутнасць шматузроўневай метадалогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці?*
2. *Якімі спецыфічнымі рысамі вызначаецца ўзровень спецыяльнай метадалогіі СКД?*
3. *Раскрыйце змест спецыфічных прынцыпаў СКД.*
4. *Утварыце па некалькі вытворных функцый СКД ад трох вызначаных радавых, якія, на ваш погляд, з’яўляюцца актуальнымі на сённяшні дзень у рабоце сацыякультурных устаноў.*
5. *Якімі адметнымі рысамі вызначаецца методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці?*
6. *Дайце класіфікацыю форм СКД і прывядзіце прыклады.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л 4

# МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ У СТРУКТУРЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## § 1. Сутнасць і функцыі мастацкай самадзейнасці

У многіх навуковых працах, звязаных з вывучэннем асобы, культуры, творчасці, самарэгулявання паводзін чалавека, «самадзейнасць», не будучы галоўным прадметам увагі аўтараў, выкарыстоўваецца даволі ў вольнай трактоўцы. Больш таго, па-за межамі навукі, на штодзённым узроўні, гэтае паняцце выкарыстоўваецца людзьмі ўвогуле для азначэння нерэгламентаванай, не вельмі якасна выкананай працы.

Нягледзячы на актыўную распрацоўку пытання аб сутнасці самадзейнасці, яе прыкметах і функцыях, яно далёка ад канчанковага вырашэння, неабходна хаця б каратка акрэсліць нашу пазіцыю. Гэта важна таму, што існуючае тлумачэнне самадзейнасці не дазваляе звязваць яе з якім-небудзь непрафесіяналізмам. Разглядаемая ў філасофскім плане самадзейнасць мае месца ў прафесіянальнай працы (як звышнарматыўная дзейнасць), у прафесіянальным мастацтве (як творчасць, самарэалізацыя), ва ўсялякай іншай дзейнасці (як адзінства асобнага і сацыяльнага зместаў гэтай дзейнасці) і т.д.

З нямецкай класічнай філасофіі паходзіць ідэя аб *свабодзе і самастойнасці* суб’екта як найбольш характэрная прыкмета і ўмова існавання самадзейнасці.

Пры гэтым разуменне свабоды як асэнсаванай неабходнасці, дзейнасці як адначасова і знешне, і ўнутрана дэтэрмінаванай актыўнасці дыктуе разуменне самадзейнасці, як таго аспекта, альбо таго боку дзейнасці, якая ажыццяўляецца не па прымусу, не пад уплывам знешніх абставін, а па рэалізацыі запатрабаванасці асэнсаванай як *сваёй асабістай* неабходнасці.

Калі ўнутраная свабода і самастойнасць – гэта прыкметы самадзейнасці, што дазваляюць адрозніць яе ад несамадзейнасці, як дзейнасці, ажыццяўляемай па знешняй неабходнасці, то знешняя свабода – гэта умова, ад якой залежыць ступень разгортвання самадзейнасці; ад знешняй свабоды-несвабоды залежыць падтрымка альбо падаўленне, развіццё альбо стрымліванне самадзейнасці.

Дадзеныя ўсім людзям як патэнцыяльныя – здольнасць і магчымасць самадзейных паводзін – у кожным чалавеку, з прычыны індывідуальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лёсу, выхавання, умоў дзейнасці, рэалізуюцца па-рознаму ў сэнсе развіцця і рэалізаванасці. Выхаванне асобы, якая здольна да самастойных паводзін – *самадзейнай асобы*, выступае як адна з найважнейшых умоў дэмакратычнага развіцця нашага грамадства.

З нямецкай класічнай філасофіі «паходзіць» другая прыкмета самадзейнасці – *вытворчасць сябе (сама-дзейнасць)* – як найбольш кароткае азначэнне сутнасці самадзейнасці.

Яно ёсць самазмяненне, самаразвіццё, самастварэнне, якое адбываецца як вытворчасць сябе ў дзейнасці. У сувязі з гэтым самадзейнасцю з'яўляецца не любая дзейнасць, не любое развіццё індывідуальных якасцей, а толькі тое, у якім чалавек развіваецца ў бок, набліжаючы яго да цэласнага, дзе ён рэалізуе сябе не толькі як індывід, але як прадстаўнік чалавечага роду. У развіцці ў бок цэласнасці можна адзначыць функцыю самадзейнасці.

Такім чынам, азначаючы *прыкметы самадзейнасці,* па-першае, гаворым аб дзейнасці свабоднай і самастойнай, па-другое, аб сутнасці самадзейнасці як самаразвіцця, па-трэцяе, як развіццё ў бок цэласнасці і шматвобразнасці.

Адносна мастацкай самадзейнасці адзначым, што ёй мае права называцца:

– індывідуальная мастацкая дзейнасць, калі гэта самаініцыятыўная, свабодная дзейнасць, дзе мастацкі працэс выступае як сродак, а шматбаковае развіццё, сацыялізацыя і самарэалізацыя як асэнсаваны альбо неасэнсаваны матыў альбо самамэта;

– масавая мастацкая дзейнасць, калі ў мэтавых установках, матывах, арыентацыях сукупнага суб'екта пераважае арыентацыя на самаразвіццё, самарэалізацыю, сацыялізацыю пры дапамозе мастацкіх заняткаў.

Аналіз катэгорыі «самадзейнасць», рэальнай з'явы масавай мастацкай непрафесійнай дзейнасці ў сферы вольнага часу, дазваляе сцвярджаць, што яна па сутнасці з'яўляецца мастацкай самадзейнасцю, хаця гэтая сутнасць сёння выступае як *мера,* якая знаходзіцца ў працэсе станаўлення сутнасці. І хаця масавая мастацкая дзейнасць у сферы вольнага часу пакуль не з'яўляецца сталай, абсалютнай формай мастацкай самадзейнасці, яе правамерна называць мастацкай самадзейнасцю, не разыходзячыся пры гэтым з паняццем «самадзейнасць» у трактоўках, прынятых у філасофіі, культуралогіі і другіх грамадскіх навуках.

Прыкметы, якімі прынята надзяляць мастацкую самадзейнасць у спецыяльнай культурна-асветніцкай літаратуры, – арганізаванасць, наяўнасць прафесійнага кіраўніка, перавага выканаўчых відаў мастацкай дзейнасці і іншае – гэта з часам праходзячыя характарыстыкі з'явы, што не набліжаюць да разумення сутнасці.

Прызнанне ў якасці сутнасці і функцыі самаразвіцця суб'екта развіццё здольнасцей асобных індывідаў, а ў грамадскім – развіццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнасных сіл чалавека, дазваляе адзначыць мастацкую самадзейнасць як сацыяльна-педагагічную з’яву не толькі таму, што грамадства імкнецца выкарыстаць яе як поле выхавання асобы, а таму, што гэта сродак удасканалення чалавека па сутнасці, дзе ён выступае як суб’ект самаразвіцця, самавыхавання, самаўдасканалення.

Тэорыя мастацкай самадзейнасці можа быць прадстаўлена як галіна ведаў, што вывучае заканамернасці пераўтварэння масавай мастацкай дзейнасці ў сферы вольнага часу ў мастацкую самадзейнасць, а методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці і педагогіка мастацкай самадзейнасці – як галіны прыкладных ведаў аб сродках аптымізацыі працэса пераўтварэння мастацкай дзейнасці людзей у іх сапраўдную мастацкую самадзейнасць.

Пытанне аб *функцыях* мастацкай самадзейнасці ўяўляецца самым фундаментальным для вырашэння праблем кіравання ёю. Натуральна, што яго тым альбо іншым чынам закранаюць амаль усе аўтары, што вывучаюць мастацкую самадзейнасць як поліфункцыянальную з’яву (Ю.Я. Сакалоўскі, Н.Г. Міхайлава, Я.І. Смірнова, Т.І. Бакланава і інш.). З мноства азначэнняў паняцця «функцыя» скарыстаем самае простае – яе разуменне як прызначэння, як адказ на некаторыя грамадскія патрабаванні, якія нараджаюць саму з’яву, вызначаюць яе асаблівасці.

Скрупулёзная праца па агульным падліку магчымых функцый мастацкай самадзейнасці ў канцы 1970-х гадоў прывяла да таго, што было выдзелена больш пяцідзесяці функцый. Пазней спецыялісты па тэорыі кіравання назвалі дадзеную сітуацыю залішне неўпарадкаванай інфармацыяй. Не выклікае ніякага сумнення, што для практыкі кіравання мастацкай самадзейнасцю наяўнасць гэтай сітуацыі мае не арыентуючае, а дэзарыентуючае значэнне.

Сістэмны аналіз дапускае магчымасць вывучаць функцыі на выснове азначэння месца вывучаемай сістэмы ў больш буйной сістэме, таму важна разгледзець пытанне аб тым, як характарызуюцца функцыі ў сувязі з азначэннем месца мастацкай самадзейнасці ў сацыяльнай структуры. Адзначым, што далёка не ўсе аўтары абумоўліваюць функцыі месцам мастацкай самадзейнасці ў сацыяльнай структуры, але ўсё ж ёсць некаторая магчымасць аб’яднаць іх пазіцыі ў азначаныя групы.

Перш за ўсё, гэта група аўтараў, якія прадстаўляюць ***філасофскія*** навукі. Агульнасць пазіцыі тут выказваецца ў зацвярджэнні ў якасці галоўнай функцыі мастацкай самадзейнасці – *функцыі выхавання асобы*, а частковыя прадстаўлены рознымі аўтарамі як падбор сацыяльных задач, у рашэнні якіх мастацкая самадзейнасць з’яўляецца сродкам, які меў месца ў распараджэнні грамадства.

Тут адразу адзначым, што так званая *выхаваўчая функцыя* з’яўляецца як бы генеральнай для мастацкай самадзейнасці ўвогуле. Але некаторыя даследчыкі сёння гавораць аб завышэнні магчымасцей самадзейнай мастацкай творчасці ў гэтым плане, ставяць пад сумненне такое вярбальнае выхаваўчае ўздзеянне на асобу. Сёння прапануецца весці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаворку аб нейкай *педагагічнай карэкцыі* паводзін удзельнікаў самадзейных мастацкіх калектываў (Я.І. Смірнова).

Другую групу аўтараў, якія выказваюцца аб функцыях мастацкай самадзейнасці, прадстаўляюць ***мастацтвазнаўцы.*** Уласна, тут дзве групы – мастацтвазнаўцы, даследуючыя спецыяльную мастацкую дзейнасць – мастацтва, прадстаўленае як прафесіянальнае мастацтва; і мастацтвазнаўцы, якія займаюцца фальклорам і народнамі рамёствамі.

Мастацтвазнаўцы, якія вывучаюць прафесійнае мастацтва, разглядаюць мастацкую самадзейнасць як падсістэму мастацтва. Яны фіксуюць увагу на дзвюх яе функцыях: 1) *здольнасці ствараць каштоўнасці мастацтва; 2) магчымасці далучаць удзельнікаў да прафесійнага мастацтва.* Прызнаючы абмежаванасць магчымасцей у адносінах да першай функцыі, націск робіцца на другую функцыю, трактуемую як выхаванне публікі для ўспрыняцця прафесійнага мастацтва.

Тыя мастацтвазнаўцы, якія займаюцца фальклорам і народнымі рамёствамі, выяўляюць дзве розныя пазіцыі. Адны зыходзяць з функцыянальнай блізкасці фальклору і мастацкай самадзейнасці і мяркуюць, што яна можа выконваць некаторыя яго функцыі: пры вядомай культуры кіраўніцтва *захоўваць здабыткі фальклору, прапагандаваць фальклор, узбагачаць яго новымі сучаснымі формамі бытавання.* Другая пазіцыя адмаўляе якую-небудзь агульнасць народнага мастацтва і мастацкай самадзейнасці і адмяжоўваецца ад яе як ад свайго прадмету, як бы ахоўваючы народнае мастацтва ад умяшання ў яе мастацкай самадзейнасці, здольнай размыць, разбурыць спрадвечна народны пачатак мастацтва.

І яшчэ адна група аўтараў, прычым самая шматлікая на сённяшні дзень, прадстаўляе ***педагогіку.*** Для іх характэрны разгляд мастацкай самадзейнасці ў якасці аднаго з сацыяльных інстытутаў выхавання. Месца яе ў сацыяльнай структуры азначаецца схемай: грамадства – сацыяльныя інстытуты выхавання – мастацкая самадзейнасць як адзін з такіх інстытутаў. Таму функцыі мастацкай самадзейнасці тут прадстаўлены як педагагічныя задачы, у якасці якіх выступаюць шматлікія характарыстыкі сучаснай асобы, у фарміраванні якой зацікаўлена грамадства.

Педагагічныя трактоўкі функцый часцей за ўсё шырэйшыя і больш ёмістыя, чым мастацтвазнаўчыя. Яны звычайна ўключаюць як немастацкія задачы сацыяльнага выхавання, так і мастацкія. Часта з-за гэтага аўтары лічаць свой падыход комплексным.

Аднак і педагагічныя падыходы нярэдка становяцца абмежаванымі. Тут часцей за ўсё фіксуюць увагу толькі на ўнутраных функцыях мастацкай самадзейнасці – яе ўздзеянне на ўдзельніка, забываючы аб тым, што яна частка мастацкай культуры і не можа не мець знешніх функцый – даваць нешта шырэйшае, чым толькі новыя якасці для самога ўдзельніка самадзейнасці. Звычайна педагогі, слушна адзначаючы першарадную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важнасць чалавеча-творчых функцый, абсалютызуюць іх, адхіляючыся ад мастацка-прадуктыўнага боку яе як неіснуючага.

Да пытання аб функцыях мастацкай самадзейнасці звяртаюцца спецыялісты, якія займаюцца праблемамі ***вольнага часу.*** Яны зазначаюць *кампенсатарную* функцыю адносна асноўнай працы, а таксама такія функцыі, як *рэкрэатыўную і забаўляльную*. Натуральна яны адзначаюць і *функцыю развіцця асобы*.

Між тым на значнасці гэтай апошняй функцыі зыходзяцца ўсе даследчыкі, хаця само паняцце трактуецца па-рознаму.

Такім чынам, за выключэннем філасофскага падыходу, які вызначаецца як самы шырокі і агульны, але часта некарэктны, астатнія прадстаўлены як вузкадысцыплінарныя. Не падлягае сумненню важкасць кожнага з іх, але ж і абмежаванасць кожнага, узятага асобна. Абмежаванасць маючыхся набораў вузка-дысцыплінарнага падыходу звязана з тым, што кожная галіна разглядае мастацкую самадзейнасць як падсістэму толькі адной сваёй сістэмы ці ў сувязі з ёю. Аднак ужо той факт, што спецыялісты розных галін ведаў лічаць мастацкую самадзейнасць сваёй падсістэмай, сведчыць аб тым, што яна з'яўляецца адначасова падсістэмай *некалькіх* розных сістэм, што і тлумачыць складанасць самой з'явы мастацкай самадзейнасці, а таксама і складанасць яе функцый.

Намі не прымаецца ўяўленне аб тым, што мастацкая самадзейнасць з'яўляецца падсістэмай мастацтва. Падставай для гэтай высновы выступае не тоеснасць мастацкай дзейнасці і мастацтва, а тоеснасць мастацтва і мастацкай культуры.

Нам уяўляецца, што адрозненне мастацкай культуры і мастацтва – гэта не толькі адрозненне цэлага і частковага, але і адрозненне функцый і сродкаў яе рэалізацыі. Сістэмаўтвараючым элементам мастацкай культуры з'яўляецца чалавек і людзі ўвогуле як носьбіты культуры. Функцыя мастацкай культуры ў грамадскай структуры – удасканаленне грамадскіх адносін у працэсе эстэтычнага засваення і пераўтварэння рэчаіснасці. Мастацтва, у сваю чаргу, адзін са сродкаў эстэтычнага засваення і эстэтычнага пераўтварэння, які ствараецца мастакамі і «даецца» немастакамі для іх уласнай дзейнасці па эстэтычным засваенні і пераўтварэнні рэчаіснасці.

Мастацтва і мастацкая культура адрозніваюцца па суб'екту. Суб'ектам мастацтва з'яўляюцца мастакі – невялікая частка грамадства, занятая спецыялізаванай мастацкай працай па вытворчасці мастацкіх каштоўнасцей. Суб'ектам мастацкай культуры з'яўляюцца і мастакі, і «немастакі» – грамадства ў цэлым, у яго дзейнасці па эстэтычным засваенні і пераўтварэнні свету.

У апошні час некаторыя даследчыкі выказваюць думку аб тым, што ўласны ўдзел у мастацка-творчай дзейнасці не з'яўляецца абавязковым для поўнага эстэтычнага развіцця асобы, што дзейнасць па актыўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўспрыняцці мастацтва можа даць не менш, а то і больш для развіцця і росту культуры. Мяркуем, што гэта не зусім так.

У прынцыпе нетактоўным з'яўляецца само супрацьпастаўленне «спажывання» мастацтва і ўласнай мастацка-творчай дзейнасці. Сама гэтая дзейнасць, незалежна ад маштаба майстэрства, «узроўню прафесіяналізму», як прынята выказвацца сярод прадстаўнікоў мастацтва, выступае як незамяняльны сродак, забяспечваючы паўнату, цэласнасць і шматбаковасць самарэалізацыі.

Каштоўнасць непрафесійнай мастацкай дзейнасці для суб'екта заключаецца менавіта ў тым, што яна *ўласная*.

Акрамя мастацкіх каштоўнасцей, ствараемых таленавітымі мастакамі, для асобнага індывіда існуюць іншыя каштоўнасці – магчыма бясконца сціплыя па агульначалавечым меркам, але свае ўласныя. Багацце мастацкага існавання чалавека дапускае яго ўладанне абедзвюма відамі гэтых каштоўнасцей, дзе адна не заменіць другую.

Уласная мастацкая дзейнасць з'яўляецца незаменным сродкам забеспячэння эмацыянальнага і духоўна-інтэлектуальнага дачынення чалавека да свайго культурнага соцыума.

Мастацкая самадзейнасць, якая з'яўляецца нашым прадметам, ёсць не толькі дзейнасць па засваенні мастацтва і далучэнні да яго, але ўяўляе сабой больш шырокую дзейнасць па эстэтычным засваенні і пераўтварэнні рэчаіснасці шляхам, па-першае, уласнай мастацка-прадуктыўнай дзейнасці суб'екта, а па-другое, шляхам выкарыстання вопыту і здольнасцей, развітых у працэсе мастацкіх заняткаў у сваёй «немастацкай» жыццядзейнасці.

Мастацкая самадзейнасць – не ўнутраная падсістэма мастацтва, але самастойная падсістэма мастацкай культуры, якая функцыянуе паралельна з мастацтвам, часткова перасякаецца і сумяшчаецца з ім (так, як некаторыя прадукты мастацкай самадзейнасці адпавядаюць эталонам мастацтва), але ж выступае як адносна самастойная з'ява.

Спынімся на неправамернасці ўжывання тэрміна «самадзейнае мастацтва». Калі ў працэсе мастацкай самадзейнасці ўзнікаюць каштоўнасці мастацкага характару з пункту гледжання прынятых у мастацтве эталонаў, яны становяцца часткай непасрэдна мастацтва. Пры гэтым ні нейкім «самадзейным мастацтвам», а проста – мастацтвам. Няма двух мастацтваў – сапраўднага і самадзейнага (прафесійнага і самадзейнага). Мастацкі прадукт, кім бы ні быў яго стваральнік, ёсць альбо твор мастацтва, альбо недасканалы прадукт мастацкай дзейнасці. Ствараць нейкія заніжаныя патрабаванні да твораў удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, сыходзячы да яе і «прабачаючы» недасканаласць – гэта абраза для суб'екта і беспрынцыпова ў адносінах да мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што тычыцца тэрміна «мастацкая творчасць», то калі маецца на ўвазе мастацкая творчасць як працэс, які мае прыкметы творчасці, то тэрмін гэты да месца ў мастацкай самадзейнасці.

Іншае пытанне заключаецца ў тым, што агульначалавечая каштоўнасць і значнасць мастацкай самадзейнасці як падсістэмы мастацкай культуры, у адрозненне ад мастацтва, вымяраецца не толькі і не столькі якасцю мастацкіх каштоўнасцяў, узнікаючых у ёй. Прадуктам мастацкай самадзейнасці з'яўляецца, перш за ўсё, сам удзельнік з яго новымі, развітымі ў працэсе дзейнасці якасцямі; а прадукты яго мастацкай дзейнасці карысныя як паказчыкі ўзроўню культуры, як вызначаючыя вынік развіцця ў працэсе мастацкай самадзейнасці рознабаковых здольнасцяў удзельніка.

Паколькі вышэйазначаная мастацкая дзейнасць ажыццяўляецца людзьмі ў *вольны час,* гэтая дзейнаць будзе накіравана на рэалізацыю шэрагу наступных функцый, звязаных з патрэбай у адпачынку і рэлаксацыяй, з атрыманнем чалавекам станоўчых эмоцый у працэсе мастацкіх заняткаў. У гэтай сувязі мастацкую самадзейнасць дакладней было б разглядаць як з'яву *дасуга* – часткі вольнага часу, накіраванага на развіццё асобы.

З'яўляючыся падсістэмай дасуга, мастацкая самадзейнасць выконвае функцыі розных узроўняў дасуга, сфармуляваных Э.У. Сакаловым, – адпачынку, забавы, асветы, сузірання, творчасці, патрэбы ў свяце. У гэтай сувязі вызначаюць *функцыі развіцця асобы: рэкрэацыйную і рэлаксацыйную (патрэба ў адпачынку, у псіхалагічнай разгрузцы), кампенсатарную (калі чалавек праз удзел у мастацкай самадзейнасці кампенсуе нехапаючыя ў яго асноўнай дзейнасці запатрабаванні), геданістычную («гедоніс» – грэч. радасць)* і інш.

Функцыі масавай мастацкай дзейнасці ў сферы вольнага часу, якія атрымоўваюцца праз «накладанне» функцый дасуга і функцый мастацкай культуры, паўстаюць як функцыі *творчага развіцця ўдзельнікаў (пад эстэтычным развіццём трэба разумець развіццё здольнасці да эстэтычных адносін)* і функцыі *гарманізацыі жыццядзейнасці* за кошт дапаўнення асноўнай працы мастацкімі заняткамі ў вольны час.

Без масавай мастацкай дзейнасці мастацкая культура не можа рэалізаваць сябе як культура грамадства, таму што яна стане замкнёнай сферай эстэтычнага самаабслугоўвання вузкага кола дзеячаў мастацтва. Мастацкая самадзейнасць, такім чынам, ёсць «патрэба» мастацкай культуры, кампанент, без якога яна не можа функцыянаваць. Тое ж самае можна гаварыць і пра дасуг. Для выканання функцыі гарманізацыі жыццядзейнасці, ён мае патрэбу ў мастацкай самадзейнасці як у неабходным кампаненце.

Шмат функцый выконвае мастацкая самадзейнасць, што выступае як *сацыяльна-педагагічная з'ява.* На сённяшні час выкананы вялікі аб'ём

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работ па пытаннях педагагічнага кіравання мастацкай самадзейнасцю. Асноўную масу даследаванняў выконваюць спецыялісты па сацыякультурнай дзейнасці, пазашкольнай рабоце. Гэта заканамерна, таму што спецыялісты «школьнай» педагогікі разглядаюць мастацкую самадзейнасць у якасці пазакласнай, пазашкольнай работы, якая дапаўняе і пашырае магчымасці ўздзеяння на асобу навучэнца.

Развіццё педагагічнай думкі ў першых дысертацыйных даследаваннях, прысвечаных мастацкай самадзейнасці, пачынаючы з 70-х гадоў XX ст., ідзе па двух асноўных накірунках: перанясенне ў методыкі кіраўніцтва самадзейнымі мастацкімі калектывамі агульных палажэнняў педагогікі і сацыяльнай псіхалогіі, а таксама палажэнняў спецыяльных мастацкіх педагогік (сцэнічнай, музычнай, харэаграфічнай і інш.).

Вядома, гэта заканамерны шлях станаўлення маладой галіны педагогікі, якою з'яўлялася тэорыя і методыка культурна-асветніцкай работы. Аднак, палажэнне аб тым, што новая педагагічная галіна фарміруецца на «скрыжаванні» шэрагу іншых блізкіх навук, не вызваляе ад пошукаў сваёй уласнай спецыфікі.

Адразу адзначым, што нельга агульна пераносіць у педагогіку мастацкай самадзейнасці палажэнні агульнай педагогікі, таму што яна па сённяшні час у асноўным арыентавана на дзіцячы і падлеткавы ўзрост, ранняе юнацтва, а таксама на спецыфічныя ўмовы агульнаадукацыйнай школы. Улік спецыфікі мастацкай самадзейнасці як дзейнасці дарослых альбо моладзі, якія вызначаюцца адносна незалежна і ў некаторай ступені супраціўляюцца выхаваўчаму ўздзеянню, улік таго, што ўдзельнік самадзейнасці выконвае па-за межамі мастацкага калектыву масу іншых сацыяльных роляў, падчас больш значных для суб'екта, чым роля ўдзельніка самадзейнасці, – істотна абмяжоўвае магчымасць простага запазычвання з методык кіраўніцтва дзіцячымі і юнацкімі краснымі і пазакласнымі калектывамі.

Таксама нельга безаглядна выкарыстоўваць у рабоце самадзейных калектываў і дзейнасці ўдзельнікаў палажэнні мастацкіх педагогік і прыёмы педагагічнай, а таксама і мастацка-творчай работы, уласцівых мастацка-вучэбным сістэмам (мастацкім вучэбным установам) альбо прафесійным мастацка-вытворчым арганізацыям. Перш за ўсё патрэбна вызначыць, чым адрозніваецца мастацка-самадзейная арганізацыя ад гэтых сістэм.

Пазнанне з'явы ёсць пазнанне яе спецыфікі.

Выяўленне спецыфікі самадзейных калектываў як мастацкіх адзінак і сферы выхавання ўдзельнікаў прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Найбольш распаўсюджаным і агульнапрызнаным з'ўляецца ўказанне на *добраахвотнасць* удзелу, а значыць, на свабоду выхаду ўдзельніка з аб'яднання ў выпадку яго незадаволенасці дзейнасцю. Гэтае палажэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазволіла ў першых жа работах сфармуляваць прынцып апоры на інтарэсы і патрэбы ўдзельнікаў у дзейнасці кіраўнікоў самадзейнасці.

Агульнапрызнаны і такія асаблівасці суб'екта як *наяўнасць у яго асноўнай, іншай сферы заняткаў* – працоўнай альбо вучэбнай, абмежаванасць часу, які можа быць прысвечаны мастацкім заняткам, стомленасць ад асноўнай дзейнасці, патрэба ў рэкрэацыі.

Даследаванні апошніх часоў сведчаць аб тым, што магчымасці самадзейных арганізацый у выхаванні ўдзельнікаў у вядомай ступені перабольшваюцца, калі безапеляцыйна сцвярджаецца магчымасць вырашэння ў іх практычна любых педагагічных задач і ставяцца яны як задачы «фарміравання». Як мы ўжо адзначалі, сёння прынята больш мяккая пастаноўка пытання – як магчымасць *педагагічнай карэкцыі паводзін дарослых удзельнікаў самадзейнасці* пад уздзеяннем педагагічна арганізаванай дзейнасці і ўтварэння ў калектывах стылю жыццядзейнасці, уплываючага на ўдзельніка на выснове механізмаў рэферэнтнасці каштоўнасцей, прынятых у групе, як норм адносін да мастацтва, да жыцця па-за межамі самадзейных калектываў, да іншых людзей, сяброў па калектыву, да сябе самога.

З найбольш тыповых функцый мастацкай самадзейнасці як сацыяльна-педагагічнай з'явы адзначым *мастацка-адукацыйную (калі ўдзельнік атрымоўвае нейкія веды, навыкі і ўменні ў дадзеным жанры мастацтва) і мастацка-асветніцкую (калі праз адно захапленне акрэсленым відам мастацтва ўдзельнік калектыву далучаецца да шырокага спектру мастацкіх каштоўнасцей)* .

Такім чынам, вывучэнне мастацкай самадзейнасці як паняцця і як рэальнай грамадска-гістарычнай з'явы прыводзіць да высновы, што тэрмін «мастацкая самадзейнасць» можна разглядаць у дзвюх асноўных сутнасцях:

1) маючы на ўвазе індывідуальную мастацкую дзейнасць асобы, калі ў аснове яе мастацкай актыўнасці ёсць патрэба ў шматбаковым развіцці і самарэалізацыі праз мастацкія заняткі;

2) маючы на ўвазе масавы грамадска-мастацкі рух, заканамерна ўзнікаючы на шляхах барацьбы грамадскіх сіл за дэмакратызацыю культуры, гістарычная навізна якога ў тым, што мастацкая актыўнасць сукупнага суб'екта азначаецца не ўтылітарнымі матывамі, але асэнсаванай альбо неасэнсаванай патрэбай у самаразвіцці ў бок большай цэласнасці, шматбаковасці, універсалізацыі сваёй сацыялізацыі і самарэалізацыі.

Увогуле, мастацкую самадзейнасць мы разумеем як поліфункцыянальную з'яву, якая выступае падсістэмай трох асноўных мегасістэм – мастацкай культуры, дасуга і сацыяльна-педагагічнай з'явы. Адпаведна, калі мы вядзём гаворку аб функцыях мастацкай самадзейнасці, то яна будзе выконваць шэраг функцый той падсістэмы, якую мы разглядаем на дадзены момант.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## § 2. Праблема эфектыўнасці мастацкай самадзейнасці

Пытанні эфектыўнасці мастацкай самадзейнасці і праблема яё ацэнкі з'яўляюцца найбольш складанымі ў тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Па сённяшні дзень няма поўнай яснасці ні ў даследчыкаў, якія сутыкаюцца з цяжкасцямі кожны раз, калі патрэбна ацаніць эфектыўнасць намаганняў кіраўнікоў альбо ўкараняемых методык, ці ў практыкаў. Сістэма існуючых у практыцы паказчыкаў застаецца нездавальняючай.

Асноўнымі паказчыкамі, на якія арыентавана сучасная практыка кіравання мастацкай самадзейнасцю, з'яўляюцца:

- колькасць удзельнікаў арганізаваных калектываў мастацкай самадзейнасці;
- колькасць арганізаваных самадзейных мастацкіх калектываў (гурткоў мастацкай самадзейнасці);
- колькасць канцэртаў, спектаклей, выстаў і іншых публічных выступленняў арганізаваных калектываў;
- колькасць «абслужаных» альбо «ахопленых» выступленнямі мастацкай самадзейнасці.

Гэтыя паказчыкі ў асноўным звяртаюць увагу на колькаснае нарошчванне масіву ўдзельнікаў (першыя два паказчыкі) і арыентаванасць на «грамадскую аддачу» (два другія паказчыкі).

Мы мяркуем, што гэтыя паказчыкі сёння не проста недастатковыя, але і ўяўляюць сабой пэўны тормаз у развіцці мастацкай самадзейнасці.

Недыферэнцыраваныя ўяўленні аб колькасці ўдзельнікаў і калектываў без уліку сацыяльна-дэмаграфічнага складу, жанрава-відавога набору калектываў і ступені іх адпаведнасці рэальнай прадстаўленасці асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва ў рэгіёнах, ступені іх адпаведнасці жанрава-відавым перавагам патэнцыяльных удзельнікаў – у вядомым сэнсе тлумачаць тое, што з-пад увагі кіраўніцтва выпадае задача мэтанакіраванага фарміравання сацыяльна-дэмаграфічнай і жанрава-відавой структуры мастацкай самадзейнасці. Паказчыкі на гэта не накіроўваюць і да гэтага не абязваюць.

Тут крыецца адна з прычын пагаршэння сацыяльна-дэмаграфічнага складу самадзейнасці (напрыклад, перавага колькасці дзіцячых калектываў і адносна невялікая колькасць маладзёжных і дарослых) і разыходжанне жанрава-відавой структуры арганізаванай самадзейнасці (якая традыцыйна прадстаўлена ва ўстановах культуры так званымі «мегажанрамі» – музычным, харэаграфічным і тэатральным) з патрэбамі людзей у самых розных мастацкіх занятках у вольны час – ад новых плыняў маладзёжнай субкультуры да традыцыйных відаў адраджаемай нацыянальнай культуры.

Паказчык масавасці працуе ў мастацкай самадзейнасці як сумна вядомы з мінулых часоў так званы «вал» у прамысловасці. Ён не падштурхоўвае да вывучэння «попыту» і да пошуку новых сродкаў яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задавальнення, ігнаруе выкананне вышэйазначаных функцый, вядзе да забеспячэння «масавасці» як самамэты, прычым любымі сродкамі. Можна сцвярджаць, што голы крытэрый масавасці заканамерна параджае беспрынцыповасць кіраўніцкай практыкі.

Другая група крытэрыяў паказвае на функцыю мастацкага абслугоўвання публікі. А гэта, увогуле, генеральная функцыя прафесійнага мастацтва.

Мастацкая самадзейнасць, хаця і прымае пэўны ўдзел у мастацкім абслугоўванні публікі, не можа яе мець у якасці вядучай. Па-першае, як сацыяльна-педагагічная з’ява, мастацкая самадзейнасць прызначаецца, перш за ўсё, для задавальнення інтарэсаў і патрэбаў, для развіцця здольнасцей удзельнікаў. Па-другое, сучаснае развіццё сродкаў масавай камунікацыі, калі людзі сёння могуць далучыцца праз тэлебачанне, відэа, Інтэрнэт да любых мастацкіх каштоўнасцей, мастацкая самадзейнасць у значнай ступені страчвае сваю былую ролю «замяняльніка» прафесійнага мастацтва на месцах, якую яна выконвала ў мінулыя гістарычныя часы. Факусаванне ўвагі кіраўніцкай практыкі на «абслугоўванне» ставіць мастацкую самадзейнасць у ролю канкурэнта прафесійнага мастацтва і сродкаў яго масавага распаўсюджвання.

Панаванне паказчыкаў, якія арыентуюць непрафесійную мастацкую дзейнасць на канкурэнцыю з прафесійнай, не толькі супярэчыць сутнасці мастацкай самадзейнасці, не толькі адцягвае ад рэалізацыі сацыяльна-педагагічных задач у адносінах да ўдзельнікаў, якія ў свеце гэтых паказчыкаў страчваюць сваю значнасць.

Гэтыя паказчыкі, узятыя з вытворчай сферы, падштурхоўваюць практыку мастацкай самадзейнасці на шлях інтэнсіфікацыі канцэртна-выканаўчай і іншай мастацка-прадуктыўнай дзейнасці. Выяўляецца гэта ў беспадстаўным прынцыпе «чым больш, тым лепей», які закладзены ў паказчыках колькасці канцэртных акцый і колькасці абслужаных, якія па логіцы гэтых паказчыкаў павінны заўсёды расці. Прынцып колькаснай інтэнсіфікацыі «аддачы» мастацкай самадзейнасці, і ў тым выпадку, калі яе сапраўды дабіваюцца за кошт павелічэння канцэртна-выканаўчай занятасці ўдзельнікаў, і ў тым, калі, не маючы магчымасці павялічыць колькасць канцэртаў і абслужаных, практыкі прыбягаюць да прыпісак, – маюць шматлікія адмоўныя вынікі ў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Самадзейнасці становяцца «патрэбнымі» толькі тыя ўдзельнікі, якія па ўзроўні майстэрства і таленавітасці, а таксама і самаадданасці, з якой звязана інтэнсіўная практыка рэпетыцыйнай дзейнасці, будуць здольны прыняць удзел у мастацкім абслугоўванні, задаволіць усё ўзрастаючыя патрэбы публікі, з аднаго боку, і патрабаванні арганізатараў заняцца самадзейнасцю як дадатковай прафесіяй, – з другой. Але ж далёка не ўсім жадаючым займацца мастацкай дзейнасцю па сілах працаваць на такім узроўні патрабаванняў. Установка на выкарыстанне мастацкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самадзейнасці як сродку абслугоўвання публікі аб'ектыўна працуе супраць масавасці, выцясняючы з самадзейнасці «неперспектыўных» удзельнікаў.

Два паказчыкі, звязаныя з «абслугоўваннем» публікі, аб якіх ішла гаворка вышэй, маюць яшчэ адзін вынік: яны фіксуюць увагу практыкі толькі на тых відах мастацкай самадзейнасці, магчымасці якіх як сродкаў «абслугоўвання» найбольш відавочныя. Да іх, перш за ўсё, адносяцца віды выканаўчай самадзейнасці: тэатральная, вакальна-харавая, аркестровая, харэаграфічная. Віды аўтарскай самадзейнасці, напрыклад, літаратурная, выяўленчая творчасць, аўтарская песня, кіна-, фота- ды відэасамадзейнасць, магчымасці якіх у «абслугоўванні» некалькі абмежаваныя, выпадаюць з-пад увагі практыкаў як меней значныя, а то і ўвогуле не існуючыя. Гэта адлюстроўваецца ў самых розных з'явах: у падрыхтоўцы кадраў, якая ў асноўным зарыентавана на выканаўчыя віды; у адсутнасці спецыялістаў па аўтарскай самадзейнасці ў навукова-метадычных цэнтрах, у дэфіцыце метадычнай літаратуры па гэтых відах самадзейнасці.

Складанасць праблемы ацэнкі мастацкай самадзейнасці звязана з тым, што тут існуюць мноства аспектаў, якія пакуль недастаткова асэнсаваны і з'яўляюцца пакуль невырашальнымі ў практыцы.

Па-першае, гэта *пытанне аб мэтах і прызначэнні ацэнкі*. Адна справа, калі вядзецца пошук высноў для ацэнкі становішча і працэсаў развіцця мастацкай самадзейнасці ў краіне, рэгіёне, у раёне дзеяння нейкай установы культуры ў мэтах карэктыроўкі стратэгіі і тактыкі кіравання мастацкай самадзейнасцю. Другое – калі вядзецца пошук высноў практыкі ацэнкі, якая б стымулявала мастацка-творчую актыўнасць і грамадскую дзейнасць кіраўнікоў і ўдзельнікаў самадзейных мастацкіх калектываў. Трэцяе – калі адшукваюцца высновы для ацэнкі ўздзеяння ўдзелу ў самадзейнасці на асобу, з мэтай вымярэння сацыяльна-педагагічнага эфекту.

Але ж якія б аспекты не меліся на ўвазе, перш за ўсё неабходна вызначыць метадалагічныя высновы вырашэння праблемы ацэнкі ў цэлым.

Адна з важнейшых метадалагічных высноў, на наш погляд, – гэта *сувязь крытэрыяў альбо паказчыкаў з сацыяльнымі функцыямі мастацкай самадзейнасці*. Распрацоўка ў нашым даследаванні пытання аб функцыях дае пэўны падыход да вызначэння падобных крытэрыяў.

Калі галоўная гістарычная функцыя мастацкай самадзейнасці і яе галоўная тэндэнцыя ў нашым грамадстве заключаецца ў пашырэнні суб'екта мастацкай творчасці, то і галоўным крытэрыем эфектыўнасці кіравання мастацкай самадзейнасцю з'яўляецца *крытэрый пашырэння суб'екта да межаў грамадства ў цэлым*. Гістарычным сродкам гэтага пашырэння і выступае мастацкая самадзейнасць.

Крытэрый, які ацэньвае эфектыўнасць кіравання працэсам пашырэння мастацкай самадзейнасці, аднак не можа выяўляцца ў росце абсалютнай колькасці ўдзельнікаў; тым болей абсалютная колькасць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можа выкарыстоўвацца пры параўнальнай ацэнцы стану мастацкай самадзейнасці ў розных рэгіёнах без уліку колькасці насельніцтва ў цэлым і яго сацыяльна-дэмаграфічнага стану.

Таму крытэрый пашырэння суб'екта мастацкай самадзейнасці можа быць выкарыстаны ў практыцы сацыяльна-культурнай дзейнасці толькі пры ўмове разумення яго як *адносін колькаснасці ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці да колькасці насельніцтва акрэсленага рэгіёну*, гэта значыць працэнтнае суаднясенне рэальных і патэнцыяльных удзельнікаў.

Але гэтага недастаткова. Неабходна правесці дыферэнцыяцыю гэтага паказчыка ў сацыяльна-дэмаграфічным плане – выявіць *ступень адпаведнасці ў мастацкай самадзейнасці сацыяльна-дэмаграфічных груп іх рэальнаму прадстаўніцтву ў структуры насельніцтва дадзенага рэгіёну*.

Такі крытэрый можа працаваць і на ўзроўні кіравання мастацкай самадзейнасцю як грамадска-мастацкім рухам у цэлым па рэспубліцы; і на ўзроўні кіравання ёю ў розных рэгіёнах (вобласці, раёне), і на ўзроўні асобнай установы культуры, мікрараёна, працоўнага калектыву і г.д.

Выніковасць яго як стымула кіраўніцкай практыкі заключаецца ў тым, што ён будзе прымушаць да пошуку тае разнастайнасці жанрава-відавых і арганізацыйных форм, якая аптымальна зможа адпавядаць патрэбам розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва.

Рэалізацыя гэтага крытэрыя на практыцы звязана з увядзеннем у сістэму статыстычных справаздач паказчыкаў, характарызуючых сацыяльна-дэмаграфічны склад удзельнікаў у абсалютнай колькасці, а таксама ў адносінах часткі асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп у структуры насельніцтва. Зыходным дакументам можа быць сацыяльны пашпарт самадзейнай арганізацыі, змест якога ўключае інфармацыю аб складзе ўдзельнікаў.

Ёсць магчымасць знайсці і спосабы ўліку «неарганізаванай» самадзейнасці, калі ўстановы культуры возьмуць курс на індывідуальна-кансультацыйную работу ў іх асяроддзі і арганізацыю пастаянных кантактаў з «неарганізаванымі». Дадзеныя аб колькасці «неарганізаваных», якія могуць уключыцца хаця б у разавыя мерапрыемствы (святы гарадоў і вуліц, святы народных рамёстваў, агляды сямейных мастацкіх калектываў і г.д.), будуць з'яўляцца абавязковымі справаздачнымі дадзенымі. Адзначым, што ўстановы культуры зацікаўлены ва ўліку кантынгента «неарганізаваных» у рэгіёне свайго ўздзеяння ні дзеля самога ўліку, а з-за магчымасці ўсталявання саміх кантактаў і запрашэння «неарганізаваных» у самыя розныя формы арганізаванай мастацкай работы.

Другім важкім крытэрыем ацэнкі мастацкай самадзейнасці з'яўляецца *склад мастацкіх каштоўнасцей*, у ёй функцыянуючых, якія азначаюцца, па-першае, жанрава-відавым складам, а, па-другое, рэпертуарам, тэматыкай, праблематыкай мастацкай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэалізацыя гэтага крытэрыя звязана з удасканаленнем формы статыстычных справаздач, у аснову якіх павінна быць пакладзена навуковаабгрунтаваная класіфікацыя мастацкай самадзейнасці (напрыклад, Я.І. Смірнова «Тэорая і методыка арганізацыі самадзейнай творчасці працоўных у культурна-асветніцкіх установах». (М., 1983. – С. 102–108.), што дазволіць фіксаваць змяненні жанрава-відавой структуры самадзейнасці. Што тычыцца рэпертуара, тэматыкі і праблематыкі, то яны могуць стаць прадметам аналізу ў тэкставых справаздачах рэгіянальных органаў кіравання мастацкай самадзейнасцю (упраўлення культуры, навукова-метадычнага цэнтра і інш.).

Трэці прапанаваны намі крытэрый звязаны з функцыямі мастацкай самадзейнасці як падсістэмы дасуга. Яго можна азначыць як крытэрый *гарманічнасці функцыянавання асобы за кошт аптымальнага спалучэння мастацка-самадзейнай актыўнасці і актыўнасці ў іншых сферах жыццядзейнасці ўдзельнікаў (працоўнай, вучэбнай і інш.).* Шчыра кажучы, адзначым, што гэты крытэрый наўрад ці можа быць закладзены ў нейкі ўліковы альбо справаздачны дакумент.

Узаемасувязь паміж свабодным і несвабодным часам і паводзінамі чалавека ў гэтых сферах пакуль мае шэраг супярэчнасцей, патрабуючых штодзённага практычнага вырашэння. Сёння павінна ісці гаворка аб разумным супадчыненні дасугавай і асноўнай дзейнасці ўдзельнікаў. Пры гэтым дасугавая дзейнасць не павінна быць звыш інтэнсіўнай за кошт зніжэння асноўнай – працоўнай альбо вучэбнай сферы.

Праблема цэласнага і гарманічнага функцыянавання суб’екта па свайму характару з’яўляецца праблемай сацыяльна-псіхалагічнай, якая дапускае псіхалагічнае кіраванне працэсам «пабудовы» асобы на выснове аптымальнага для кожнага асобнага індывіда спалучэнняў шматлікіх відаў дзейнасцей у розных сферах (працоўнай, сямейнай, дасугавай) у мэтах агульнай станоўчай самарэалізацыі індывіду.

Мінімальны эфект удзелу ў мастацкай самадзейнасці магчыма пабачыць у тым, каб мастацкая дзейнасць не перашкаджала станоўчым праяўленням асобы ў іншых сферах; максімальны – у тым, каб удзел у мастацкай самадзейнасці суправаджаўся паляпшэннем дзейнасці ў гэтых сферах.

Пры такім падыходзе задача заключаецца ў тым, каб вызначыць паказчыкі, якія б сведчылі аб неспрыяльных выніках захаплення мастацтвам у іншых сферах жыццядзейнасці; паказчыкі таго, што мастацкая дзейнасць не перашкаджае функцыянаванню ў іншых сферах і паказчыкі станоўчага ўздзеяння дзейнасці на функцыянаванне ў іншых сферах. Вырашэнне задачы звязана з распрацоўкай прыёмаў дыагностыкі, а таксама індывідуальна арыентаваных праграм сацыяльна-тактычных прыёмаў рэгуляцыі функцыянавання асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэты крытэрый з’яўляецца неабходным ні для знешняй ацэнкі самадзейнасці, але выключна як выснова для самакарэкціроўкі працы кіраўніка. Калі задача гарманізацыі будзе асэнсавана як функцыянальная прафесійная задача, кіраўніку будзе лёгка вызначыць удзельнікаў, станоўча спалучаючых мастацкую дзейнасць з іншымі сваімі сацыяльнымі ролямі, і тых, у каго ёсць пэўная дысгармонія, цяжкасці сумяшчэння. Звычайна, на аказанні дапамогі апошнім і павінен засяродзіць свае намаганні кіраўнік самадзейнага мастацкага калектыву.

Яшчэ неабходна звярнуць увагу на такі аспект праблемы як аб’ём загружанасці ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці канцэртна-выканальніцкай і іншай дзейнасцю «мастацкага абслугоўвання». Тэзісу «інтэнсіфікацыі», які закладзены ва ўяўленні аб тым, што чым болей канцэртаў, спектакляў і іншых падобных мерапрыемстваў, тым лепш, чым большай будзе «аддача» самадзейнасці, то тады неабходна супрацьпаставіць тэзіс абумоўленага нарміравання і абмежавання пажаданняў кіраўнікоў і ўдзельнікаў на звышвысокую колькасць і большы аб’ём падобнай дзейнасці. Вялікі аб’ём падобнай працы не можа не перашкаджаць функцыянаванню ўдзельнікаў у другіх сферах жыццядзейнасці. Больш таго, гэтая дзейнасць падчас суправаджаецца патрабаваннямі стварыць для калектыву, які актыўна эксплуатуецца для «мастацкага абслугоўвання», нейкія спецыяльныя ўмовы (вызваленне ад вучэбных і працоўных заняткаў, матэрыяльнае стымуляванне і г.д.).

Выступленне перад публікай, паказ ёй вынікаў сваёй творчасці павінны быць не абавязкам, а гонарам для непрафесійных выканаўцаў.

Пытанні аб аптымальным аб’ёме загружанасці ўдзельнікаў, на наш погляд, змогуць вырашацца на шляху нейкага фарміравання дзейнасці мастацка-абслугоўваючага парадку. Колькасць такіх акцый можа быць эксперыментальна вызначана для кожнага жанру дзейнасці як сярэдняя норма, якой павінна прытрымлівацца, і якая не будзе перашкаджаць функцыянаванню ўдзельнікаў у іншых сферах.

Калектывы і ўдзельнікі не павінны прымушацца да парушэння гэтых норм. Яны прызначаны абараніць удзельнікаў ад магчымага адміністратыўнага націску і злоўжывання «зверху». Укараненне такіх норм не з’яўляецца прымусам для тых калектываў, якія і такую колькасць выступленняў лічаць для сябе звышмерным і заўчасным. У той жа час устанаўленне такіх норм не значыць забарону на болей інтэнсіўную працу для некаторых калектываў і ўдзельнікаў. У дадзеным выпадку спецыяльныя мастацкія саветы альбо атэстацыйныя камісіі павінны атрымаць доказ таго, што ўдзельнікі сумяшчаюць мастацкія і другія віды сваёй загружанасці без страты для асноўнай працы.

На заканчэнне звернемся да пытання аб асаблівасцях *ацэнкі* мастацка-прадуктыўнага боку жыцця калектываў мастацкай самадзейнасці і іх удзельнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перш за ўсё адзначым, што для ацэнкі мастацкага прадукта самадзейных калектываў мы не прапануем нейкія асаблівыя, заніжаныя ў параўнанні з прафесійным мастацтвам, крытэрыі. Удзельнік чакае не проста камплементарнай адзнакі, але аб'ектыўнага дзелавога аналізу яго дасягненняў у параўнанні з яго мінулым мастацкім вопытам і дапамогі ў вызначэнні таго, над чым ён павінен працаваць дзеля магчымага далейшага росту.

Можна сцвярджаць, чым прафесійным і больш дэталёвым будзе аналіз яго творчасці, тым большую карысць будзе мець гэтая ацэнка.

Але, *калі не можа быць асобных крытэрыяў ацэнкі мастацкай дзейнасці ўдзельнікаў самадзейнага калектыву, то працэдура ацэнкі павінна быць адметнай.*

Ацэнка ўсялякай дзейнасці можа ажыццяўляцца падвойна: па-першае, калі ацэньваюць розныя аб'екты, параўноўваючы іх паміж сабой, па-другое, калі ацэньваюць той жа самы аб'ект у дынаміцы, тым самым параўноўваючы яго цяперашні стан з мінулым. У першым выпадку абавязковае патрабаванне да ацэнкі – параўнанне параўнальнага.

Але ў мастацкай самадзейнасці практычна кожны калектыў мае свае асаблівыя характарыстыкі, якія робяць параўнанне іх вынікаў некарэктнымі. Адзін – толькі створаны, другі – існуе дзесяцігоддзі; у адных – кіраўнік-самавучка без спецыяльнай мастацкай падрыхтоўкі, у другіх – заслужаны прафесіянал; у тым – у асноўным людзі з сельскай мясцовасці, у другім – гараджане з высокім адукацыйным статусам і г.д.

Што ж у выніку ацэньваецца на аглядзе мастацкай самадзейнасці? Прафесійны ўзровень кіраўніка? Агульны культурны ўзровень удзельнікаў, які не можа не адбіцца на выніках творчасці?

Конкурснасць, якая ляжыць у аснове практыкі аглядаў і фестываляў, з'яўляецца неспрыяльнай для мастацкай самадзейнасці. Найбольш важнай і значнай павінна быць не столькі ацэнка шляхам параўнання шматлікіх, наколькі дынамічная ацэнка іх дасягненняў і кожнага ўдзельніка ў параўнанні з яго ж уласнымі мінулымі поспехамі.

А пры гэтым трэба больш звяртаць увагу на асобнага ўдзельніка, на асобны калектыў, большую ўвагу, чым мы можам удзяліць ім на працягу агляду ці конкурсу.

Паўсядзённая ацэнка, аналіз кожнай работы – праграмы, спектакля, карціны, выставы, кінафільма і г.д. – і павінны быць галоўнай ацэнкай, прызначэнне якой карэктыроўка творчай дзейнасці, дапамога непрафесійным мастакам, вучоба і стымуляванне далейшай творчасці.

Мы прапануем некалькі ўзроўняў ацэнкі, прапанаваных у сваім дысертацыйным даследаванні Г.А. Апарыным:[129]

---

**[129] Гл. Опарин Г.А. Педагогическое руководство коллективами самодеятельных авторов: автореф. дис. кандидата пед. наук. – Л., 1986. – С. 7–8.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Абмеркаванне і ацэнка работы асобнага мастака паміж ім і кіраўніком (спецыялістам-кансультантам).

2. Абмеркаванне і ацэнка работы сярод калег па захапленню (у калектыве, аб'яднанні, на сустрэчах некалькіх калектываў аднаго жанру).

3. Абмеркаванне і ацэнка індывідуальных альбо групавых работ экспертнай групай (мастацкім саветам установы культуры, адборачнай камісіяй, спецыяльна сфарміраванай групай знешніх «крытыкаў»).

4. Абмеркаванне і ацэнка работ публікай (на вечарынах-справаздачах, шляхам стварэння «журы гледачоў», кнігі водгукаў на выставах і г.д.).

Крытыка з нашага боку конкурснай сістэмы ацэнкі самадзейнасці, аднак, не сведчыць аб поўным адмаўленні ад творчых спаборніцтваў удзельнікаў самадзейнасці. Крытыка сучаснай практыкі аглядаў і конкурсаў звязана з тым, што атрыманне адзнакі звычайна становіцца самамэтай для калектываў і ўдзельнікаў, а яе выдача і размеркаванне прызёраў – самамэтай журы падчас конкурсу.

Агляды пераўтварыліся ў пэўны стымул, падрыхтоўка конкурснай праграмы – у асноўны змест дзейнасці кіраўнікоў і калектываў. У выніку мастацкая самадзейнасць заахвочвае не столькі да ўдзелу ў культурным жыцці, да эстэтызацыі сваёй бытнасці і асяроддзя, да сканцэнтравання на сацыяльна-педагагічных задачах – развіцця інтарэсаў, культуры, удасканалення каштоўнасных арыентацый, мастацкага густу ўдзельнікаў і г.д., колькі на трэніраванні, «адпрацоўцы» конкурснай праграмы, калі ўсім астатнім неабходна ахвяраваць дзеля поспеху ў журы.

Існасці мастацкай самадзейнасці адпавядае не працэдура конкурсу з непазбежнасцю «перамогі» адных і «паражэнне» іншых, а хутчэй сітуацыя мастацкіх свят і фестываляў. Галоўнымі «выхадамі» мастацкай самадзейнасці павінны быць не выхады да журы, але выхады ў соцыум, да сваіх суайчыннікаў. Неабходны не аглядавыя кампаніі, а мастацка-святочны каляндар, вызначаючы ўключэнне мастацкай самадзейнасці ў агульнанародныя святы, якія павінны суправаджацца святамі мастацтваў; у рэгіянальныя святы, а таксама асобныя святы па жанрах, альбо шматжанравыя, арыгінальныя (падобныя, напрыклад, святу горада, святу гумару ў Аўцюках, альбо святу беларускай полькі і г.д.).

У такім выпадку сам агляд, работа мастацкага савета, адборачных камісій з мэтай вызначэння найлепшага і адзначэння яго месца ў ходзе свята будзе *папярэднічаць* гэтаму святу, а не ўяўляць яго кульмінацыю, калі пасля заканчэння агляду і размеркавання месцаў, узнагарод, дыпломаў, усё звычайна ідзе да заканчэння. Узнагародай павінен быць сам удзел у свяце, што не выключае нейкіх форм заахвочвання найлепшых. Аднак гэта не павінна быць узнагарода за нейкі «ўзровень», выяўлены членамі журы падчас агляду, але ўзнагарода за тыя фарбы, якія ўнеслі ўдзельнікі самадзейнага калектыву ў плынь свята, за тую меру шчырасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радасці і прыгажосці, якую яны змаглі падарыць суайчыннікам, а не прадэманстраваць перад спецыялістамі. Увогуле, у гэтым сэнсе на кожным святе абавязковымі павінны стаць узнагароды глядальніцкага журы.

Адным з элементаў свята можа быць і конкурс, аднак, зусім не самым галоўным элементам; удзел у ім не павінны быць абавязковым і масавым; склад можа вызначацца на падставе папярэдніх заяў жадаючых паспрабаваць свае сілы, атрымаць конкурсную адзнаку.

Як мы адзначылі, мастацкі савет фестывалю і рэжысёрска-пастановачная група разам з членамі журы павінны папрацаваць да самога свята. Вызначыць больш моцныя калектывы, знайсці для іх месца ў цэнтральнай ідэі свята (на галоўнай плошчы, на асноўнай сцэне і г.д.). Больш сціплыя па мастацкім узроўні калектывы размясціць на іншых пляцоўках, каб яны не сутыкаліся з больш моцнымі і не адчувалі сябе стратнымі ў нейкім сэнсе. Добра, свята ахоплівае вялікую колькасць людзей на вялікім абшары наваколля, таму кожны ўдзельнік і кожны калектыў на святе знойдзе свайго ўдзячнага гледача.

Гэтыя прапановы па працэдуры ацэнкі ўвогуле не супярэчаць самой прыродзе мастацкай самадзейнасці, якая ўзнікла як патрэба атрымаць мастацкую асалоду, адчуць радасць, проста павесяліцца пасля нейкай добра зробленай працы альбо падчас добравядомага, традыцыйнага свята (заканчэнне пасяўной, касавіцы, збору ўраджаю, падчас Калядаў, Купалля і г.д.). Людзі спявалі і танцавалі не таму, што аб’яўлены наступны агляд ці конкурс мастацкай самадзейнасці, а таму, што ёсць наяўнасць святочнай сітуацыі, без якой правесці любое свята немагчыма.

У заканчэнні адзначым, што ў Рэспубліцы Беларусь існуюць добрыя традыцыі святаў і фестываляў самадзейнай мастацкай творчасці, і іх пералік з кожным годам пашыраецца, нягледзячы на пэўныя цяжкасці. Неабходна і далей утрымліваць намечаную тэндэнцыю адыходу ад арыентацыі мастацкай самадзейнасці на спаборніцтвы на конкурсах і аглядах і пераходу на традыцыйнае ўкараненне ў гэтай сферы масавых святаў і фэстаў, якія больш адпавядаюць самой сутнасці мастацкай самадзейнасці.

### ***Кантрольныя пытанні да раздзела 4***

1. *Раскрыйце сутнасць катэгорыі «самадзейнасць».*
2. *Пералічыце асноўныя функцыі мастацкай самадзейнасці і раскрыйце іх змест.*
3. *Дайце крытычную ацэнку асноўным паказчыкам, на якія арыентавана сучасная практыка кіравання мастацкай самадзейнасцю.*
4. *Прапануйце магчымыя крытэрыі ацэнкі сучаснай мастацкай самадзейнасці.*

# З А К Л Ю Ч Э Н Н Е

Сучасная сацыяльна-культурная дзейнасць па сваім унутраным змесце ўжо даўно пераступіла аб'ём і рамкі былой культурна-асветніцкай работы. Істотна трансфармаваліся функцыі сацыякультурнага менеджменту, усё болей значную ролю пачынаюць адыгрываць, разам з асветай, культурна-творчая, рэкрэацыйна-аздараўляльная, забаўляльная, сацыяінтэграцыйная функцыі. У лік актыўна дзеючых суб'ектаў сацыякультурнай сферы ўваходзяць сёння не толькі традыцыйныя культурна-асветніцкія ўстановы, але і новыя вучэбныя цэнтры, сістэмы дадатковай адукацыі, разнастайныя структуры сацыяахоўнага і сацыяпедагагічнага профіляў, аздараўляльна-рэкрэацыйныя аб'екты, сацыякультурныя рухі, асацыяцыі, фонды і г.д.

Да традыцыйных відаў асветніцкай дзейнасці далучыліся віды, якія маюць адметны сацыяльны характар – работа з дзецьмі, інвалідамі, з падлеткамі дэвіянтных паводзін, сацыярэабілітацыйная работа з групамі рызыкі, пажылымі, адзінокімі людзьмі, бежанцамі, вымушанымі перасяленцамі і г.д. Натуральна, што вывучэнне такой складанай, шматузроўневай з'явы павінна будавацца на базе добра адрэфлексаванай метадалогіі і тэорыі, у рамках адэкватных ёй інавацыйных педагагічных канцэпцый.

Сканцэнтраваўшы нашу ўвагу ў асноўным на педагагічных аспектах, мы спецыяльна не разглядалі культuралагічныя састаўныя, якія сёння інтэнсіўна ўздзейнічаюць на ўсе гуманітарныя навукі. Тэорыя сацыякультурнай дзейнасці яшчэ не выпрацавала адзінага разумення культуралагічнага зместу ў сваіх навуковых даследаваннях.

Новым зместам павінна папоўніцца сацыяльна-культурная дзейнасць па захаванні і развіцці традыцыйнай народнай культуры Беларусі. Практыка СКД, не чакаючы адпаведных навукова-метадычных распрацовак, актыўна стала ўкараняць новыя тыпы сацыякультурных устаноў – дамы фальклору і дамы рамёстваў, якія яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў і працаўнікоў.

Разам з гэтымі новымі і не зусім новымі плынямі ў сучаснай сацыяльна-культурнай сферы рэспублікі ў нашым вучэбным дапаможніку мы ставілі на мэце не згубіць назапашаны тэарэтычны і метадычны матэрыял па арганізацыі СКД, абагульніць метадалагічныя падыходы да разумення яе сутнасці, зрабіць гістарычны экскурс да вытокаў прафесійнага разумення сацыяльна-культурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Актуальные проблемы социально-культурной деятельности: Сборник статей. – М., 1995. – 121 с.
2. Бакланова Т.И. Педагогика художественной самодеятельности: Учебн. пособие / МГИК. – М., 1992. – 160 с.
3. Исторический опыт социальной работы в России. – М., 1994. – 255 с.
4. Киселёва Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельности: Учебное пособие. – М., 1995. – 136 с.
5. Культурно-просветительная работа в СССР. – М., 1974. – 349 с.
6. Сасыхов А.В., Стрельцов Ю.А. Основы клубоведения: Теория и методика клубной работы. – Улан-Удэ, 1969. – 531 с.
7. Смирнова Е.И. Теория и методика организации самодеятельного творчества трудящихся в культурно-просветительных учреждениях. – М., 1983. – 178 с.
8. Социально-культурная деятельность: поиски, проблемы, перспективы: Сборник статей. – М., 1999. – 132 с.
9. Ярошенко Н.Н. Социально-культурная деятельность: парадигмы, методология, теория. – М., 2000. – 204 с.
10. Ярошенко Н.Н. Становление теории внешкольного образования: Учебн. пособие. – М., 2000. – 207 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ